№ 48 (502) 29 сьнежня 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## Вынікі году

### Год веры ў сябе

Галоўную падзею году стварылі мы самі. Піша Алесь Кудрыцкі. **Старонка 5.**

### Аўтар значка «За Свабоду» раскрывае імя

**Старонка 10.**

### Закон выпадковасьці

Ніякія папраўкі ў Канстытуцыі не гарантуюць, што аднойчы нейкі орган не адмовіцца служыць свайму гаспадару. Піша Віталь Тарас. **Старонка 18.**

### Найлепшыя кнігі 2006

Туронак, Барадулін, Луцкевіч. **Старонка 14.**

### Мода на падпольнае

Падпольныя дыскі разыходзяцца накладамі, якія папсавікам ня сьняцца. Піша Сяргей Будкін. **Старонка 16.**

### Паміж шчырасьцю і разьлікам

Вынікі спартовага году падводзіць Зьміцер Панкавец. **Старонка 20.**

### 75 плюс-мінус 30

За тры дні да Новага году Беларусь так і не заключыла кантрактаў на пастаўку нафты й газу. Масква пайшла на прынізьлівыя саступкі, але Беларусь настойвае на цане 75 даляраў і не баіцца адключэньня газу. **Старонка 6.**
Ці варта спрадаць рублі? **Старонка 7.**

# Чалавек году

— чалавек Плошчы. Старонка 3.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Крыху пра талерантнасьць

Каляднае пасланьне апостальскага візытатара для беларусаў-каталікоў замежжа айца **Аляксандра Надсана**.

З набліжэньнем Калядаў вялікія і малыя гарады ў Англіі, дзе я жыву, прымаюць сьвяточны выгляд: ялінкі на плошчах, вулічныя асьвятленьні і ўпрыгожаньні, надпісы ў вокнах, якія жадаюць усім «Merry Christmas», што значыць — радаснага сьвята Нараджэньня Хрыста. Усё гэта, магчыма, ня мае асаблівага дачыненьня да сутнасьці сьвята, але стварае прыемнае пачуцьцё агульнай добразычлівасьці, і прыносіць усім шмат нявіннай радасьці. Але вось у гэтым годзе ўладам аднаго вялікага гораду такі радасны перадсьвяточны настрой прыйшоўся недаспадобы, і яны вырашылі скасаваць усе публічныя праявы Калядаў. Яны апраўдвалі свой учынак тым, што ў шматкультурным і шматрэлігійным грамадстве хрысьціянскае сьвята можа абражаць пачуцьці шматлікіх нехрысьціянаў — мусульманаў, індусаў і іншых, што жывуць у гэтым горадзе. І тут здарылася нечаканае. Самі нехрысьціяне выказалі пратэст супраць гэтай пастановы і сказалі: «Калі ласка, не касуйце Калядных сьвяткаваньняў: нам яны вельмі падабаюцца».

Вось прыклад, як пад покрывам талерантнасьці часта хаваюцца праявы нецярпімасьці або абыякавасьці.

Мы жывём у сьвеце, які становіцца ўсё больш глябальнай вёскай, дзе побач жывуць людзі розных расаў, нацыянальнасьцяў, моваў, культураў і рэлігіяў. Усё гэта, з аднаго боку, робіць наша жыцьцё больш багатым. З другога боку, нягледзячы на адрознасьці, мы ўсё больш пераконваемся ў адзінстве людзкога роду. У пытаньнях рэлігіі мы знаходзім таксама шмат супольнага і добрага ў іншых, а шчырая набожнасьць многіх нехрысьціянаў можа быць прыкладам для шмат каго з нас. Дый інакш быць ня можа, бо ўсе рэлігіі маюць адну крыніцу — Бога, Творцу ўсяго. Тым ня менш, адрознасьці існуюць, і таму, каб пазьбегнуць небясьпекі рэлігійнай абыякавасьці, нам трэба асэнсаваць сутнасьць нашай веры. Сёньняшняе сьвята якраз паказвае на ейны ўнікальны характар: Бог сам стаецца адным з нас, каб даць нам магчымасьць мець удзел у Ягоным Боскім жыцьці.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Бог стаецца чалавекам і прыходзіць да нас ня ў сіле і магутнасьці, але як бездапаможнае немаўля, якое мае патрэбу нашай спагады і дапамогі. Гэта і ёсьць сутнасьць нашай рэлігіі. Можна сказаць, што Бог ушанаваў нас сваім зьяўленьнем сярод нас і выказаў нам давер. Гэта ён пацьвердзіў усім сваім далейшым жыцьцём і дзейнасьцю на зямлі, аж да Крыжовай сьмерці. На жаль, сярод многіх ён не знайшоў разуменьня. «Да сваіх прыйшоў, і свае Яго не прынялі» (Ян 1:11).

Сьвяты Павал сказаў: «Хай у вас будуць тыя самыя пачуцьці, што ў Хрысьце Ісусе» (Плп 2:5). Вось якраз гэтага чакаецца ад пасьлядоўнікаў Хрыста як на Каляды, так і праз усё жыцьцё. У нашым разрозьненым грамадстве талерантнае стаўленьне да іншых павінна абапірацца не на рэлігійную абыякавасьць, але на глыбейшае асэнсаваньне нашай веры і нашай супольнай апошняй мэты. А гэта азначае ў першую чаргу пашану адно да аднаго і адмаўленьне ад ужываньня гвалту і сілы ня толькі фізычных, але і ў накіданьні сваіх перакананьняў іншым. Хрысьціянін, які жыве сваёй вераю, ніколі ня будзе рабіць нічога крыўднага і абразьлівага ў адносінах да таго, чыіх перакананьняў ён не падзяляе. Безумоўна, ён хоча, каб усе прыйшлі да пазнаньня той радасьці, якую дае вера ў Хрыста. Таму ён ня будзе хаваць сваёй веры, а пастпаць згодна з загадам Боскага Настаўніка: «Так хай сьвеціць вашае сьвятло сярод людзей, каб людзі бачылі вашыя добрыя ўчынкі і ўслаўлялі вашага Айца, што ў небе» (Мц 5:16).

Вось гэтыя думкі хай будуць нам да развагі ў гэты сьветлы дзень Нараджэньня Госпада і Збаўцы Нашага Ісуса Хрыста.

Хрыстос родзіцца: слаўце Яго!

**а. Аляксандар Надсан**
**Каляды 2006 г.**

# Дзякуй

**А., У.Л., І.Л., Анатолю К., Анатолю П., М.Б., Макару Ш., Мікалаю С., В.В., Вячаславу Д., Івану Н., Ларысе С., Сяргею Ш., Марыі Г., Н.В., Івану Ш., Максіму К., Жане П., І.Ц., Андрэю Х., Валянціне Д., Л.Б., А.І., Галіне Г., Галіне С., В.С., Алене М., Алене К., Аляксандру К., Валянціне Дз., Андрэю Б., Эле С., Вользе Ш., Э.К., К.З., Галіне С., Алене К., Марыне З., В.С., Л.І., Б.Я., Аляксандру К., В.Ц., Яўгену К., А.З., Ірыне В., Станіславу Р., Л.Б., Андрэю Х., Валянціне Д., Алене М., Леакадзіі Н., Ігару Я., Галіне Ж., С.П., Яўгену І., Уладзімеру М., Марыі А., Віктару Б., Ізмаілу А., М.П., Станіславу Ш., Адаму М., Эдварду К., Аляксандру К., Усеваладу В., Уладзімеру К., А.Б., Тацяне М., А.А., Валянціне В., Леаніду Р., В.Г., В.Дж., Паўлу Н., Анатолю В., Марыне Б., Ніне Ш., Ігару Б., Д.Р., Тамары М., А.Д., Валер'ю С., Уладзімеру Р., Сьвятлане К., Уладзімеру Ш., Уладзімеру Г.** зь Менску.

**Валер'ю Б., Т.Г.** зь Берасьця.

**Натальлі С., Антосю Ц.** з Полацку.

**Аляксандру Н.** з Слуцкага раёну.

**Аляксандру Д., І.Дз.** з Гарадзенскага раёну.

**Васілю Л.** з Дзяржынскага раёну.

**Аляксандру М.** з Астравецкага раёну.

**Анатолю Ц.** з Асіповічаў.

**Віталю А.** са Слуцку.

**Вользе Б.** са Століна.

**Аркадзю М., Алене З., Канстанціну П., Таісьсі М.** з Гомеля.

**Вользе Г., Юрасю Б.** зь Віцебску.

**Анатолю П., М.** з Салігорску.

**Валер'ю П., Лідзіі А., Сяргею С., Сяргею Г.** з Баранавічаў.

**А.П., Аляксандру Ш.** з Жодзіна.

**А.В.** зь Мядзельскага раёну.

**Уладзімеру Х.** з Шаркаўшчынскага раёну.

**Працяг на старонцы 46.**

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

КАЛЯДЫ. ВЯРТАНЬНЕ

Калядныя віншаваньні — ня проста піўная рэклама,
Калі з гразёй на асеньніх ботах па лужынах ходзіць зіма.
Знаёмая кажа, што сьнег у Варшаве і ў Лёндане, мабыць, таксама,
А ў Менску тры дні да Калядаў, а сьнегу яшчэ няма.

Сьвяты Мікалай з падарункамі вяртаецца ўвечары з рынку
Прыгараднай электрычкаю на дваццаць чацьверты пуць,
Бо ўночы калядныя мары абудзяць адну дзяўчынку,
А тата з мамай ня чэшуцца і спакойна храпуць.

У замежных паштоўках — шчасьце ў вершах і прозе,
У замежных кнігарнях — паліцы сьвяточных тамоў,
А нашы сябры і сямейнікі збольшага ўсе ў дарозе
І яшчэ невядома, ці пасьпеюць дамоў.

Бо тонны вільготнай восені павісьлі над галавою,
Бо хмары ў паветры — як радыё нянашага настальжы.
І едзеш з восеньскай Вільні восеньскаю Літвою...
І сьнег пачынае падаць на беларускай мяжы.

А дома чакаюць прэзэнты каля каляднай ялінкі
І ў пляшках закаркаваныя сьвяточнай радасьці хвалі, —
Калі ўсенародны блазан высуне галаву з тэлескрынкі,
А мы ў адказ: «Позна, дзядзька, нас ужо віншавалі!»

# Чалавек году

## Сіла волі

Традыцыйна «Наша Ніва» вызначае Чалавека году ў Беларусі. Сёлета мы ня мелі ваганьняў на гэты конт. У чым праяўляецца Асоба? У тым, што яна праяўляе волю. Чалавекам году сёлета стаў кожны грамадзянін, які меў волю выйсьці на Плошчу ў Сакавіку. Маніфэстанты падтрымлівалі ня нейкага канкрэтнага кандыдата. Яны адстойвалі ўласнае права на палітычныя перакананьні і канстытуцыйнае права народу быць крыніцай улады. Чалавек году — гэта і хлопец Ільін, які спрабаваў пранесьці ў намётавы гарадок біятуалет, і быў за гэта да страты прытомнасьці зьбіты амонаўцамі. І той невядомы, які 19 сакавіка ўзьлез зь бел-чырвона-белым сьцягам на дах аўтобусу нумар 100. І той, хто, абвязаўшыся сасіскамі, спрабаваў прарвацца да маніфэстантаў і сядзеў за гэта на Акрэсьціна.

«Наша Ніва» ганарыцца, што на Плошчы ўвесь час стаялі і нашы супрацоўнікі. Газэта інфармавала пра тыя падзеі і аналізавала іх вычарпальна, а галоўны рэдактар перадаў свой рэпартаж у нумар з турмы на Акрэсьціна. «НН» плаціла за сваю пазыцыю забаронай на распаўсюд, пасьля на разьмяшчэньне ў Менску. Гэтага году з гісторыі «НН» і з гісторыі Беларусі ня сьцерці ніякім паклёпнікам. Газэта працягвае выходзіць дзякуючы волі сваіх чытачоў.

## Герой году

Зьміцер Дашкевіч. Лідэра незарэгістраванага «Маладога фронту» выціскалі з краіны — завялі супраць яго крымінальную справу, але пры гэтым працягвалі выпускаць за мяжу. Зьміцер выбраў пайсьці ў турму за свае перакананьні. А ягоную арганізацыю не развалілі ні рэпрэсіі, ні крытыканы, яна працягвае дзейнічаць.

## Крыэйтары году

Аўтары значкаў «За Свабоду». Фэномэнам стала папулярнасьць бела-чырвоных значкаў з Птушкай-Свабодай. Гэтыя значкі прыдумала група крыэйтараў на чале з мастацтвазнаўцам Вацлавам Арэшкам. Гутарку зь ім чытайце на старонцы 10.

## Тандэм году

У беларускай палітыцы зьявіўся тандэм. І Мілінкевіч, і Казулін апраўдалі прадказаньні. Мілінкевіч арганізаваў Плошчу, не цягнучы пры гэтым коўдру на сябе. Правёў выбарчую кампанію, у вельмі складаны абставінах, не зрабіўшы значных памылак. Апанэнты з апазыцыі вінавацілі яго ў залішняй мяккасьці і адсут-

Працяг на старонцы 4.

ЗДЫМКІ ГОДУ




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Невядомы са сьцягам на даху аўтобусу №100. 19 сакавіка.

Працяг са старонкі 3.

насьці праграмы, але ён, тым ня менш, дасягнуў рэйтынгу папулярнасьці (18,2%), якога за апошнія дванаццаць гадоў ня меў ніводзін апазыцыйны палітык.

Вось што піша пра Мілінкевіча тыднёвік для дзелавых людзей «Белорусы и рынок»: «Яшчэ год таму мала хто ведаў пра палітыка Аляксандра Мілінкевіча, а сёньня ён сымбалізуе імкненьне да дэмакратыі і эўрапейскае будучыні соцень тысячаў грамадзянаў Беларусі. А.Мілінкевіч здолеў «раскруціцца» ў неспрыяльных умовах інфармацыйнай блякады й палітычнага ціску. Ягоныя выбарцы, нягледзячы на запалохваньне сьмяротным пакараньнем, выйшлі на Плошчу абараняць свой выбар.

Думаецца, фэномэн А.Мілінкевіча ў тым, што гэты палітык выглядаў увасабленьнем тых якасьцяў, па якіх ужо занудзіўся беларускі выбаршчык, і якія зусім не ўласьцівыя цяперашняму беларускаму кіраўніцтву. Выбаршчык пабачыў у ім палітыка, які можа ўвайсьці на роўных у клюб прэзыдэнтаў эўрапейскіх краінаў».

Нягледзячы на высілкі прапаганды і яе добраахвотных памочнікаў у стане апазыцыі, Мілінкевіч застаўся лідэрам дэ-факта, а не дэ-юрэ. Выяўны кантраст з Ганчарыкам, які папросту выехаў з краіны неўзабаве пасьля «сваіх» выбараў.

Казулін ад пачатку быў цёмным konікам, ад якога чакалі сюрпрызаў. І ён іх даваў. Сваімі тэлевыступамі, сваім паходам на Акрэсьціна, сваёй упартай галадоўкай.

## Імя году

У паўстаньні Кастуся Каліноўскага ўдзельнічаў прадзед Аляксандра Мілінкевіча. Ідэалы Каліноўскага аказаліся блізкімі сёньняшнім барацьбітам за свабоду. Маніфэстанты ў Сакавіку перайменавалі Кастрычніцкую плошчу ў Плошчу Каліноўскага. Гэтае ж імя носіць польская праграма стыпэндыяў для рэпрэсаванай моладзі. Яна пазбавіла моладзь страху выгнаньня зь дзяржаўных унівэрсытэтаў і дае магчымасьць тром сотням юнакоў атрымаць эўрапейскую падрыхтоўку.

## Уцякач году

Прадпрымальнік з Ваўкавыску Мікалай Аўтуховіч меў дзёрзкасьць уцячы з-пад хатняга арышту. Ён хаваўся ў Менску, пакуль ня быў арыштаваны.

## Сыход году

Народны пісьменьнік Беларусі Янка Брыль быў апошнім з тых пісьменьнікаў стагодзьдзя, на вачах якіх сьвет руйнаваўся і паўставаў наноў; яго жыцьцёвы досьвед ахопліваў увесь беларускі XX век, з вайною і жыцьцём пад Польшчай уключна. Ён пайшоў у іншы сьвет як неаспрэчны аўтарытэт беларусаў. Ён быў маральным эталёнам, адным з тых Сакратаў, якія, паміраючы, застаюцца, пакідаюць па сабе дарогу: маральную дактрыну, узор паводзінаў і мысьленьня. Ён лёг на спачын на могілках у Калодзішчах 27 ліпеня.

## Знак году

Вылучэньне Алеся Бяляцкага на Нобэлеўскую прэмію

## ЗДЫМКІ ГОДУ



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Мілінкевіч і Казулін на Кастрычніцкай плошчы. 19 сакавіка.

міру было прызнаньнем маральных заслугаў беларускага незалежнага грамадзтва. Толькі вылучаны, Бяляцкі адразу трапіў у пяцёрку імаверных прэтэндэнтаў на ўзнагароду.

### Скандалісты году

Чавэс і Ахмадынэджад. Прэзыдэнтамі, пра якіх найбольш гаварылі ў сьвеце, сталі Чавэс з Вэнэсуэлы, які з трыбуны ААН назваў Буша д'яблам і перажагнаўся, а таксама Ахмадынэджад з Ірану, які адмаўляе Галакост і заклікаў сьцерці Ізраіль з мапы сьвету.

Хапала арыгінальных заяваў і ўнутры краіны.

### Контрапрапагандысты году

Сьцяпан Сухарэнка і яго пацукі. Застрашваючы выбарцаў, старшыня КДБ Сьцяпан Сухарэнка праславіўся заявай, што экстрэмісцкія элемэнты падрыхтавалі 19 сакавіка тэракты, падпалы і атручваньне водаправоду дохлымі пацукамі. Пасьля гэтага ён і генпракурор краіны пагражалі ўсім, хто наважыцца выйсьці на вуліцы 19 сакавіка, сьмяротным пакараньнем. У выніку Менск у дзень выбараў здаваўся мёртвым горадам. А тым ня менш знайшліся некалькі дзясяткаў тысячаў грамадзянаў, якія прыйшлі на цэнтральную плошчу сталіцы.

### «Пастрадаўшы» году

Радавы Лосеў. Пацукамі справа ня скончылася. Паўстала патрэба апраўдаць разгон дэманстрацыі 25 Сакавіка, паказаны па сусьветных тэлеканалах. Так зьявілася кранальная гісторыя пра радавога Лосева, якога цяжка параніл разьюшаныя маніфэстанты. БТ паказвала аж восем «цяжка параненых» ваеннаслужачых у гіпсе, накладзеным на камуфляжную форму. Крыху менш «пастрадалі» самі работнікі БТ, якіх пазьверску закідалі сьнежкамі.

### Эўрапеізатарка году

Лідзія Ярмошына. Байка пра унтэр-афіцэраў, якія самі сябе высеклі — гэта былі яшчэ кветачкі. Як мы даведаліся з інтэрвію Аляксандра Лукашэнкі, «на гэтых выбарах за мяне прагаласавала 93.5%. Але мы зрабілі 86%. Эўропа сказала нам, гэта не эўрапейскі працэнт. Вось зробіце эўрапейскі працэнт, і мы прызнаем Вашы выбары». І Лідзія ж зрабіла! А Эўропа...

### «Кантрабандысты» году

Анжаліка Борыс і яе паплечнікі па Саюзу палякаў былі зьвінавачаныя ў кантрабандзе амфэтаміну. Наркотык знайшлі ў машыне, у якой ехала Борыс, у люстэрку задняга выгляду. Уся бясконцая кампанія супраць Борыс і польскіх актывістаў была задуманая, здаецца, з мэтай нагнятаньня антыпольскіх настрояў і атаясамленьня гарадзенца Мілінкевіча з палякамі. Аднак гэтая кампанія можа мець балючы для беларускага грамадзтва водгук у будучым. Цікава, што Польшча, нягледзячы на кепскія адносіны зь Беларусьсю, да апошняга блякавала рашэньне Эўрасаюзу аб пазбаўленьні нашай краіны гандлёвых прэфэрэнцыяў.

### Антыбеларус году

Расейскі палітоляг Андрэй Суздальцаў прапанаваў дэпартаваць беларусаў з Расеі. Гэта была адна зь яго ідэяў у рамках кампаніі, якая б мела на мэце дабіцца перадачы «Белтрансгазу» пад кантроль «Газпрому». Суздальцаў мае асабістыя рахункі з нашай краінай: на пачатку гэтага году яго дэпартавалі зь Беларусі.

### Твар году

Беларуска Кацярына Даманькова стала супэрмадэльлю сьвету паводле вэрсіі агенцтва «Форд Модэлз». Мусіць, у тым, што беларускі такія прыгожыя, ёсьць заслуга і беларускіх мужчынаў!

### Мамы году

Юлія Малахоўская, Крысьціна Вітушка і Аліна Стэфановіч, стваральніцы сайту dzietki.org і супольнасьці беларускамоўных сем'яў сталіцы. Беларусы датуль будуць беларусамі, пакуль нехта ў Беларусі будзе гаварыць па-беларуску. Крысьціна, Юлія і Аліна ня сталі чакаць дапамогі ад дзяржавы ці перамены ўлады. Яны гадуюць дзяцей беларусамі тут і цяпер, ведаючы: дзеці могуць расьці беларускамоўнымі толькі калі ў іх будзе беларускамоўная кампанія. Няможна захаваць беларускамоўнасьць у межах адной сям'і. Чытайце гутарку зь імі на старонцы 12.

### Капітан году

Аўтар Плястыляндыі і яе Капітана Танакі Алесь Кудрыцкі стварыў сваімі рукамі ўнікальны мастацкі праект. Старонка 43.

# Год веры ў сябе

Галоўную падзею 2006 году стварылі мы самі. Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Азіраючыся на мінулы год, разумееш: ён застаўся ў памяці ня проста лісткамі адрыўнога календара. 2006 год падараваў нам зародкі падзеяў, якія будуць разьвівацца, дратаваць нас ці даваць нам надзею налета, а мо й далей. Вынікі году ў Беларусі — незавершаныя, дынамічныя. А яшчэ выявілася, што Беларусь трымаецца на самым вастрыі ляза глябальных праблемаў. Мы дыхаем паветрам, якое ўцягвае ў лёгкія ўвесь сьвет.

### Палігон для «Газпрому»

Сёлета Беларусь апынулася на фронце новай вайны, якая распальваецца ў сьвеце абмежаваных рэсурсаў. Крэмль зламаў негалосны мараторый на ўжываньне энэргіі ў якасьці зброі масавага угамаваньня. Распачала год досыць правальная энэргетычная вайна Расеі супраць Украіны, а заканчвае няблага падрыхтаваная газавая апэрацыя супраць Беларусі. Загадзя, каб пазьбегнуць перабояў з пастаўкамі газу на Захад (як гэта было ў выпадку закрыцьця газавага вэнтылю для Ўкраіны), у газасховішчы Нямеччыны і Прыбалтыкі напампавалі паліва. Гэтак, у нямецкім газасховішчы Рэдэн назапасілі амаль 5% аб'ёму гадавой патрэбы Нямеччыны ў газе — хопіць, каб забясьпечваць усю краіну цягам некалькіх тыдняў.

Расея кшталтуе сваё новае вайсковае ўменьне, абраўшы за палігон Беларусь. Тое, што адбываецца зараз з нашай краінай, можа ў будучыні здарыцца і зь іншымі — бо канца росту цэнаў на газ ня бачна. Таму здача суверэнітэту Беларусі будзе паразай ня толькі для Лукашэнкі, але і для Эўропы, як той аншлюс, які прывёў да Другой сусьветнай вайны.

У сучасным сьвеце ня трэба зьнішчаць мільёны жыцьцяў, каб паставіць краіну на калені — ахвярамі робяцца прадпрыемствы, якія паралізуе газавая сутарга, ды старыя, якія замярзаюць у сваіх кватэрах.

### Не спужаліся

У 2006 г. Аляксандар Лукашэнка нарэшце згубіў манаполію на палітычнае лідэрства — людзі даведаліся, што ў

**Працяг на старонцы 8.**

# 75 плюс-мінус 30

За 3 дні да Новага году кантракт на пастаўкі газу яшчэ не падпісаны. Масква пайшла на прыніжальныя саступкі. Беларусь настойвае на цане 75 даляраў і не баіцца адключэньня газу.

У аўторак, 26 сьнежня, у Маскве адбыўся чарговы раўнд перамоваў наконт умоваў пастаўкі газу ў Беларусь у 2007 годзе. Перамовы вялі першы віцэ-прэм'ер беларускага ўраду **Уладзімер Сямашка** і кіраўнік «Газпрому» **Аляксей Мілер**.

«Газпром» пайшоў насустрач беларускаму боку ва ўсіх пытаньнях пастаўкі блакітнага паліва ў Беларусь налета», — сказаў Аляксей Мілер у жывым эфіры расейскага тэлебачаньня пасьля перамоваў. Мілер паведаміў, што канцэрн згадзіўся з ацэнкай «Белтрансгазу» на 5 мільярдаў даляраў, хаця і лічыць яе завышанай. Мілер агучыў

> Лукашэнка: «Чым больш у нас будзе посьпехаў, тым больш нас будуць паддушваць, прычым з розных бакоў».

прапанову расейскага боку пастаўляць газ па цане 105 даляраў за тысячу кубамэтраў цягам чатырох гадоў. Такія цэны становяцца магчымымі пры ўмове стварэньня сумеснага прадпрыемства зь «Белтрансгазам».

Пры ўмовах такога пагадненьня плаціць беларусы фактычна будуць толькі 75 даляраў, а за астатнюю частку яны маюць разьлічвацца акцыямі «Белтрансгазу», якія пяройдуць ва ўласнасьць Масквы. Формулу можна акрэсьліць 75+30.

Са словаў Мілера, гэта самыя выгодныя ўмовы ва ўсім СНД. Арменія атрымлівае газ за 110 даляраў, Украіна — за 130, Малдова — за 170, Літва — за 230, Грузія — за 235.

Калі ўлічыць, што яшчэ тыдзень таму «Газпром» заяўляў, што цана на газ можа быць толькі 200 даляраў і ні цэнтам ніжэйшая, гэта можа азначаць, што халоднае маўчаньне Менску вымусіла расейскага газавага гіганта пайсьці на прыніжальныя са-

> Мілер: «Мы прапануем самыя выгадныя ўмовы ва ўсім СНД».

ступкі.

Чаму ён вымушаны саступаць на мяжы страты ўласнага твару? Па-першае, беларуская газатранспартная сыстэма — ласы кавалак, і, здаецца, Мілер хоча выманіць подпіс пра яе перадачу любым коштам.

Па-другое, Калінінградз-

## ЗДЫМКІ ГОДУ




**Каб падтрымаць Лукашэнку перад выбарамі, Расея цэлы год пастаўляла Беларусі газ за 46 даляраў. Для параўнаньня: Літве — за 170. 30 сакавіка «Газпром» запатрабаваў платы па выбарчых вэксалях: перадачы «Белтрансгазу» пад свой кантроль. На фота: інаўгурацыя Аляксандра Лукашэнкі. 8 красавіка.**

кая вобласьць Расеі забясьпечваецца газам выключна празь Беларусь (у Польшчу, Літву, Латвію, Нямеччыну ён можа пастаўляцца і абходнымі шляхамі). Калінінград таксама ня мае сховішчаў газу. Падчас мінулага адключэньня газу, у 2004 годзе, Беларусь адразу пачала карыстацца газам, прызначаным для Калінінграду.

Калі толькі Расея не падрыхтавала сюрпрызу ў справе забесьпячэньня Калінінграду, у «Газпрому» няма рэальных спосабаў ціску на Беларусь.

Ствараецца ўражаньне, што расейскі бок ня мае адэкватных спосабаў вядзеньня перамоваў з такім зацятым партнэрам, як Беларусь.

Таму Менск, маючы на стале прапановы, якіх ня мае ніводная краіна СНД, пакуль не згаджаецца падпісваць кантракт.

Па вяртаньні з Масквы віцэ-прэм’ер Сямашка зьвінаваціў у зрыве падпісаньня кантракту «Газпром». Па вяртаньні з Масквы ўночы на 27 сьнежня ён заявіў, што падпісаньне чакалася, і што яшчэ 30 лістапада была ўзгодненая цана 75 даляраў. «Мы спадзяваліся на прыстойнасьць расейскіх партнэраў. Тое, што адбылося, было наўмыснай правакацыяй», — заявіў У.Сямашка.

Ён акрэсьліў пазыцыю Беларусі: пакуль кантракт не падпісаны, краіна лічыць, што працягваецца ранейшы кантракт. Дамову на транзыт газу Беларусь падпіша толькі аднначасова з кантрактам на пастаўку.

Кіраўнік Беларусі **Аляксандар Лукашэнка** на сустрэчы з урадоўцамі патлумачыў газавы шантаж Расеі звычайнай зайздрасьцю. «Беларусь у сваім разьвіцьці ўжо дабілася пэўных вынікаў. Чым болей мы будзем мець посьпехаў, тым больш нас будуць паддушваць, прытым з розных бакоў. У такіх умовах самае галоўнае — умець жыць па сродках і эканоміць, асабліва энэргарэсурсы. Перадусім у рэальным сэктары эканомікі».

Афіцыйны Менск працягвае настойваць на кошце газу 75 даляраў за тысячу кубамэтраў і выплаце кошту акцыяў «Белтрансгазу» жывымі грашыма. Гэтую формулу можна акрэсьліць як «75 мінус 30», бо Беларусь за тыя грошы магла б чатыры гады кампэнсаваць розьніцу між цяперашняй і будучай цаной на газ. Дасягненьне яе дазволіла б кіраўніку Беларусі і надалей выступаць у ролі лідэра, які незвычайнымі шляхамі забясьпечвае эканоміцы краіны ўнікальна зручныя ўмовы жыцьцядзейнасьці.

> Сямашка: «Расея пайшла на правакацыю».

Сёлета Беларусь закупляла каля 20 млрд кубамэтраў газу пры сярэдняй цане 46 даляраў за тысячу кубамэтраў.

Беларусь апошняе дзесяцігодзьдзе атрымлівала энэрганосьбіты па зьніжаных цэнах узамен за падпарадкаваньне Расеі і палітыку русіфікацыі. У адрозьненьне ад Польшчы ці Балтыі, Беларусь не разбудавала альтэрнатыўных шляхоў паставак энэрганосьбітаў і не праінвэставала пераход гаспадаркі на энэргаашчадныя тэхналёгіі.

Адзінай крыніцай паставак газу ў Беларусь застаецца Расея. З Расеі Беларусь таксама атрымлівае 90 % нафты (10 % паходзяць з уласных радовішчаў). Нафта- і газаправодаў з портаў Чорнага і Балтыйскага мораў не было збудавана.

Расейскі бок напярэдадні чарговага раўнду перамоваў зноў палохаў беларусаў адключэньнем газу ў выпадку непадпісаньня кантракту. Дзейсны кантракт будзе доўжыцца яшчэ пяць дзён, да 31 сьнежня.

Аб’ёму падземных газасховішчаў Беларусі хапае толькі на чвэрць, максымум на палову дзённага спажываньня газу ў зімовы пэрыяд. Гэта значыць, што ў выпадку адключэньня газу Беларусь амаль адразу пачне адчуваць яго дэфіцыт. Аднак яшчэ большы брак пачне адчуваць Калінінград. Адаб’ецца газавая блякада і на спажыўцах у Літве, Польшчы, у меншай ступені — у Латвіі і Нямеччыне.

Таму пакуль што дарма «Газпром» пагражае адключэньнем газу. Беларускія ўлады сваёй дэманстратыўнай незгаворлівасьцю і самі правакуюць яго на гэта. Навошта яны тое робяць? Чаму ўкраінскі ўрад падпісаў нашмат менш выгадны кантракт на пастаўку газу загадзя, абы мець пэўнасьць, а беларускі марудзіць нават за пяць дзён да Новага году? Напрошваецца думка, што такія паводзіны патрэбныя для стварэньня прапагандысцкага эфэкту. Віну за непазьбежнае пагаршэньне эканамічнай сытуацыі ў выніку такога ж непазьбежнага росту цэнаў на энэрганосьбіты масавая сьвядомасьць ускладзе на Расею.

**Мікола Бугай**

## Ці варта прадаць рублі?

Чым абернецца для беларускага рубля падаражаньне расейскіх энэрганосьбітаў? Ці варта чакаць дэвальвацыі нацыянальнай валюты, і ў якой валюце найлепей захоўваць свае зьберажэньні? На гэтыя пытаньні адказвае эканамічны аглядальнік газэты «Белорусы и рынок» **Уладзімер Тарасаў.**

У.Тарасаў лічыць, што дэвальвацыя беларускага рубля малаймаверная. Расея прапануе не такія жахлівыя варыянты, якімі нядаўна нас страшыла. Дэвальвацыя адбудзецца, калі кошт газу перавысіць 150 — 200 даляраў ЗША за кубамэтар паліва, або істотна павялічацца цэны на іншыя энэрганосьбіты.

Калі ж бакі не паразумеюцца, а тут, на думку сп. Тарасава, усё залежыць ад беларускага боку, уласьнікам банкаўскіх укладаў у беларускіх рублёх варта задумацца. Найбольш пэрспэктыўная валюта ў наступным годзе — эўра, мяркуе эканамічны аглядальнік. У выпадку найгоршага сцэнару могуць выйграць тыя, хто атрымаў крэдыт у нацыянальнай валюце, бо рост інфляцыі наўпрост залежыць ад сытуацыі з коштамі на энэрганосьбіты. Але Ў.Тарасаў раіць не сьпяшацца з высновамі, пакуль ня скончыцца перамоўны працэс.

**Сямён Печанко**

## Чаму Беларусь не баіцца адключэньня газу?

Калінінградзкая вобласьць Расеі забясьпечваецца газам выключна празь Беларусь (у Польшчу, Літву, Латвію, Нямеччыну ён можа пастаўляцца і абходнымі шляхамі). Калінінград таксама ня мае сховішчаў газу. Падчас мінулага адключэньня газу, у 2004 годзе, Беларусь адразу пачала карыстацца газам, прызначаным для Калінінграду. Калі толькі Расея не падрыхтавала сюрпрызу ў справе забесьпячэньня Калінінграду, у «Газпрому» няма рэальных спосабаў ціску на Беларусь.

# Год веры ў сябе

Працяг са старонкі 5.

краіне ёсьць іншыя палітыкі.

Аляксандар Мілінкевіч сьцьвердзіўся як асоба, зь якой давядзецца лічыцца ў доўгатэрміновай пэрспэктыве — падабаецца гэта камусьці ці не.

Акрамя гэтага, правалілася спроба канчаткова запужаць беларусаў. Не далі чаканага эфэкту масавыя пасадкі падчас сакавіцкіх пратэстаў, паказальныя працэсы з доўгімі тэрмінамі ды сыстэматычныя арышты цягам году.

Улады паспрабавалі былі спыніць рухавік грамадзкай актыўнасьці, але ён толькі набраў абаротаў. Ня скажаш, каб грамадзтва было апанаванае страхам. Калі пасьля выбараў-2001 краіна заглыбілася ў дэпрэсію, то зараз паўсюль сустракаеш людзей са значкамі — бел-чырвона-белымі крыльцамі Птушкі-Свабоды.

Палітычныя вязьні ня толькі не ламаюцца духоўна, але й робяцца зь цягам часу маральнымі аўтарытэтамі для тых, хто на волі. Севярынец вядзе калёнку для нязломнай «Нашай Нівы», лісты Дашкевіча друкуюцца на блогах, Статкевіч дае камэнтары ды інтэрвію. Да іх едуць людзі з усёй Беларусі ды ідуць лісты з усяго сьвету. Зьняволеньне юнакоў з «Партнэрства», якія рыхтаваліся назіраць за выбарамі, выявіла цынізм улады, а галадоўка Аляксандра Казуліна — моц духу яе апанэнтаў.

## Глямур аўтарытарызму

2006 год паказаў, наколькі нетрывалыя дыктатары, і наколькі трывалыя сыстэмы. Фідэль Кастра зьнік, а сацыялізму на «Востраве Свабоды», здаецца, нічога не пагражае. Садама Хусэйна зьбіраюцца празь месяц павесіць, але ў Іраку й блізка няма спакою. Ніязаў памёр, а ягоны рэжым стаіць, нібы залатая статуя Туркмэнбашы ў Ашгабадзе. Выснова году: сапраўдныя зьмены адбываюцца не ў кіроўных крэслах, а ў людзкіх галовах.

Дыктатары між тым мяняюць амплюа. У модзе эпатажна-глямурны аўтарытарызм: Уга Чавэс робіць сусьветныя турнэ ды пужае пралетарыят д'яблам-Бушам, а Ахмадынеджад эпатуе лібэральны Захад ды прыводзіць у экстаз фундамэнталістаў, адмаўляючы Галакост ды абяцаючы сьцерці Ізраіль з твару Зямлі. Пры гэтым Вэнэсуэла ўплывае на энэргетычную стабільнасьць у амэрыканскім рэгіёне так жа, як Расея ў Эўропе, а Іран, відаць, неўзабаве будзе мець атамную зброю.

Беларускі рэжым у 2006 г. таксама выявіў здольнасьць да эвалюцыі з элемэнтамі ідэалягічнай эквілібрыстыкі. Сёлета пачаў выразна афармляцца рэвэрс усходняй палітыкі. Калі раней афіцыйны Менск выступаў у ролі засьцянковай нявесты, што просіцца замуж за багатага жаніха, то цяпер сам Крэмль амаль гвалтам прымушае паненку быць зь ім разам («Ня згодзішся — будзеш галодная ды халодная») ды патрабуе немалы пасаг пры тым, што пра афіцыйнае афармленьне адносінаў гаворка вядзецца кволенька. Аб'яднаўчая рыторыка ў дзяржаўных мэдыях амаль зьнікла. Апытаньні паказваюць, што беларусы ня хочуць губляць незалежнасьць. Дзяржава выглядае, дзейнічае адпаведна. Змаганьне ідзе ўжо не за Беларусь як такую, а за тое, якой будзе Беларусь. Усьведамленьне гэтага — значны вынік гэтага году.

## Гнуткі супраціў

Часопіс «Тайм» назваў асобай году кожнага чалавека, які карыстаецца глябальным Сецівам. На думку журналістаў часопісу сёлета паспалітыя людзі ўзялі на сябе кіраваньне глябальнымі мэдыямі, распачалі стварэньне сусьветнай лічбавай дэмакратыі. Яны працавалі задарма, але лепей за прафэсіяналаў. У 2006 г. Беларусь і тут апынулася на самым грабеньчыку сусьветнай хвалі. Нечакана для саміх сябе мы выявілі здольнасьць удала ды эфэктыўна выкарыстоўваць новыя мэдыі, без аніякай падказкі зьверху. Сакавік растапіў лёд у душах, і на паверхню прабілася магутная творчая плынь. Адзінае, што змагла ёй супрацьпаставіць улада — грубая сіла, АМОН, які хапае без разбору ўдзельнікаў флэшмобаў. Пратэсты ж не зьнікаюць, а гнутка адаптуюцца, апярэджваючы рэпрэсіўны апарат на крок, а то і на ўсе тры. Сёлета рэжым з трэскам прайграў змаганьне за Інтэрнэт. У віртуальнай прасторы нашым галоўным ворагам засталося ўласнае няўменьне дамаўляцца, недахоп камунікатыўнай культуры. 2006 год паказаў, на жаль, і гэта.

Асоба году-2006 — ня нейкі канкрэтны дзяяч, а Чалавек Плошчы, то бок свабодны і актыўны грамадзянін. Сёлета мы зразумелі, што супольная справа складаецца зь дзеяньня кожнага. Нават калі многія і згубілі веру ў палітыкаў, ува ўсіх нас зьявілася вера ў чалавека, у саміх сябе. Гэта галоўны вынік гэтага году.

## ЗДЫМКІ ГОДУ



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Галоўную падзею 2006 году стварылі мы самі. 22 сакавіка.

## 21 сьнежня

### «Бацькаўшчыну» могуць ліквідаваць

**МГА «Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына»** пагражае ліквідацыя. Аб`яднаньне атрымала зь Менскага гаспадарчага суду матывацыйную частку рашэньня суду ад 12 сьнежня. Тады суд адмовіў прадпрыемству **«Менская спадчына»** ў пазове аб скасаваньні дамовы арэнды з «Бацькаўшчынай». У матывацыйнай частцы дакумэнту рашэньне адмовіць у скасаванні дамовы аб арэндзе прынятае на той падставе, што сама дамова прызнаная несапраўднай.

### Суд у аддзяленьні кардыялёгіі

Віцебскі абласны суд спрабаваў разгледзець скаргу **праваабаронцы Паўла Левінава** на дзеяньні абласной выбарчай камісіі ў аддзяленьні кардыялёгіі віцебскага шпіталя хуткай мэдыцынскай дапамогі, куды Левінаў патрапіў з дыягназам «гіпэртанічны крыз». Аднак стан шпіталізаванага пагоршыўся, таму суд не адбыўся.

### Ператрус у кватэры кандыдата

Увечары ў Пінску міліцыянты і людзі ў цывільным уварваліся ў кватэру кандыдата ў дэпутаты гарадзкога Савету, сябра партыі БНФ **Юры Бахцерава**. Ператрус доўжыўся больш як тры гадзіны. Міліцыянты забралі хатні архіў кандыдата ў дэпутаты, а таксама сьпіс з подпісамі выбарцаў і агітацыйныя матэрыялы, падрыхтаваныя да мясцовых выбараў.

### Берасцейскім сацыял-дэмакратам не даюць выступаць

**Георгію Руцкому**, кандыдату ў дэпутаты Берасьцейскага гарсавету па акрузе №11 ад БСДП (Грамада), адмовілі ў выступе перад выбарцамі на бацькоўскім сходзе ў СШ №16. У адпаведнасьці з Выбарчым кодэксам, напярэдадні сходу Г.Руцкі зьвярнуўся да дырэктара школы з просьбай дазволіць 5–хвілінны выступленьне перад бацькамі. Аднак **дырэктар школы Тацяна Саланенка** такой магчымасьці кандыдату ў дэпутаты не дала. Сябар камісіі **Аляксей Крываносаў** (вылучаны БРСМ) пацьвердзіў правамернасьць дзеяньняў Т.Саланенкі.

### Фронтавец падаў пазоў на газэту «Рэспубліка»

Сябра Партыі БНФ **Вадзім Канапацкі** падаў пазоў аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі ў суд Савецкага раёну Менску на рэдакцыю газэты «Рэспубліка». Нагодаю стаў матэрыял журналіста **Андрэя Сотнікава** «Грошы і дэмакраты», апублікаваны ў нумары газэты «Рэспубліка» за 10 лістапада. У ім В.Канапацкі вінаваціцца ў растрачваньні замежнага гранту.

### Разумаў пазьбег «хіміі»

Былы прафсаюзны лідэр **Мікола Разумаў**, асуджаны ў чэрвені 2006 года аршанскім судом на 3 гады «хіміі» за «паклёп на прэзыдэнта», знаходзіцца на свабодзе. Як паведаміў **праваабаронца Алесь Бяляцкі**, да адпраўкі на месца адбываньня пакараньня Разумаў пасьпеў аформіць 2–ю групу інваліднасьці. Заканадаўства Беларусі вызваляе гэтую катэгорыю грамадзянаў ад пакараньня на «хіміі».

## 22 сьнежня

### Клімаў на волі

Дэпутат Вярхоўнага Савету 13–га скліканьня **Андрэй Клімаў** выйшаў на волю пасьля аднаго з паловай году зьняволеньня, якія ён правёў у вёсцы Баршчоўка Гомельшчыны.

### Прысуд Садоўскай бязь зьменаў

**Кацярыну Садоўскую** колькі месяцаў таму пакаралі зьняволеньнем на два гады за абразу А.Лукашэнкі і пагрозы судзьдзям Кіраўскага райсуду. Садоўская адбывае пакараньне ў Гомельскай жаночай калёніі. Менскі гарадзкі суд не знайшоў падставаў зьменшыць тэрмін пакараньня ці замяніць яго на больш мяккі рэжым.

### «Міжнародная Амністыя» прызнала Казуліна

Праваабарончая арганізацыя «Міжнародная Амністыя» прызнала экс–кандыдата ў прэзідэнты Беларусі, **палітзьняволенага Аляксандра Казуліна** вязьнем сумленьня.

### «Новаму жыцьцю» не дазволілі маліцца ў будынку царквы

Вышэйшы гаспадарчы суд прыняў да разгляду тры зь пяці патрабаваньняў **царквы «Новае жыцьцё»**. Сярод адхіленых былі звароты царквы аб перарэгістрацыі суполкі па адрасе разьмяшчэньня будынку (Кавалёва, 72), а таксама просьба аб дазволе правядзеньня богаслужэньняў у будынку царквы. **Судзьдзя Караткевіч** матывавала адхіленьне гэтых патрабаваньняў тым, што яны не адносяцца да працэсу ў цэлым і мусяць разглядацца як асобныя пытаньні.

Пасьля навагодніх сьвятаў царква «Новае жыцьцё» зьвернецца ў суд Цэнтральнага раёну з пазовам да Сталічнага тэлебачаньня.

## 22 сьнежня

### Студэнтаў праграмы Каліноўскага затрымалі на мытні

А 22 гадзіне вечара на памежным пераходзе «Брузгі» супрацоўнікамі беларускай мытні былі затрыманы студэнты **Аляксей Трубкін** і **Барыс Гарэцкі**, якія вярталіся з Польшчы на калядныя вакацыі.

Пасьля 7–гадзіннага знаходжаньня ў адным з памяшканьняў мытні ў Трубкіна канфіскавалі сыстэмны кампутарны блёк, а ў Гарэцкага — ноўтбук.

На чыгуначным вакзале ў Горадні мытнікі затрымалі **Зьмітра Мальчыка**, які прыехаў у Горадню з Кракава. Хлопца дапытвалі супрацоўнікі праваахоўных органаў у цывільным. У выніку праваахоўнікі сканфіскавалі ў студэнта ноўтбук.

## 24 сьнежня

### Затрыманы Алесь Міхалевіч

У часе каляднага канцэрту на кватэры, якая належыць **Алесю Міхалевічу**, уварваліся міліцыянты. Усіх прысутных затрымалі, аднак пасьля адпусьцілі. У РАУСе пакінулі толькі намесьніка старшыні Партыі БНФ Алеся Міхалевіча і яшчэ аднаго хлопца з прысутных, **Васіля Лепеша**. Дарэчы, Міхалевіч кандыдат у дэпутаты гарсавету. Ім інкрымінавалі нецэнзурную лаянку і пасадзілі на пяць сутак на Акрэсьціна.

### Ушанаваньне памяці ксяндза Гадлеўскага

У нядзелю грамадзкасьць з ініцыятывы «Разам» ушанавала памяць **ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага**. Меркавалася ўсталяваць на месцы ягонага расстрэлу ў Трасьцянцы 24 сьнежня 1942 г. памятны крыж.

Адзін зь мікрааўтобусаў, у якім ехалі ўдзельнікі мерапрыемства, спынілі супрацоўнікі ДАІ. Праз некаторы час пасажырам патлумачылі, што прычына затрыманьня – у аварыі на трасе, нягледзячы на тое, што процьма іншых машын спакойна выяжджала з гораду. Урэшце, у кіроўцы аўтобуса забралі дакумэнты, а пасажыры мусілі пешкі дабірацца да месца правядзеньня жалобнай акцыі.

Затрыманы быў таксама **Вячаслаў Сіўчык**, якога адвезьлі ў пастарунак міліцыі ў Шабанах.

## 26 сьнежня

### Цімох Дранчук на волі

А 7–й гадзіне раніцы зь першай менскай калёніі вызвалілі былога актывіста незарэгістраванай арганізацыі «Партнэрства» **Цімоха Дранчука**. За кратамі ён адбыў болей за 8 месяцаў і быў вызвалены ўмоўна-датэрмінова.

# Заклікі да байкоту выбараў

Мірон, Казулін і актывісты на месцах заклікаюць да зьняцьця апазыцыйных кандыдатаў з выбараў.

У Віцебску да байкоту мясцовых выбараў заклікаў легендарны Мірон. На даху дому ля Пралетарскае плошчы зьявіўся бел-чырвона-белы сьцяг. Гэта чацьвертая за месяц акцыя Мірона.

Паводле мясцовага апазыцыянэра Барыса Хамайды, з крыніцы, вартай даверу, стала вядома: да сьцяга была прымацаваная цыдулка са словамі «Байкот выбарчаму фарсу!» і подпісам — Мірон.

У тым жа Віцебску ад удзелу ў выбарах адмовіўся старшыня віцебскай арганізацыі БНФ Кастусь Смолікаў. Паводле спадара Смолікава, рашэньне адмовіцца ад удзелу ў выбарах ён прыняў пасьля таго, як нават праз абласны суд на кандыдатаў не ўдалося зарэгістравацца ніводнаму зь іншых дэмакратычных прадстаўнікоў Віцебску.

На мінулым тыдні адмовіцца ад удзелу ў выбарах заклікаў Аляксандар Казулін.

На пачатку сьнежня адбыўся нечарговы зьезд Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ). Тады форум з удзелам амаль 250 дэлегатаў рэкамэндаваў усім прэтэндэнтам ПКБ у кандыдаты дэпутатаў мясцовых саветаў зьняць свае кандыдатуры. Частка камуністычных кандыдатаў вырашылі ўстрымацца ад байкоту «у рамках экспэрымэнту».

Рашэньне камуністаў таксама падтрымалі сацыял-дэмакраты з БСДП (Грамада).

Варта нагадаць, што сёлетнія мясцовыя выбары амаль безальтэрнатыўныя — сярэдняя колькасьць прэтэндэнтаў па Беларусі складае 1,05 чалавека на месца. На выбары не запросяць міжнародных назіральнікаў.

**СП**

# Аўтар значка «За Свабоду» раскрывае сваё імя

Значкі «За Свабоду» сталі абсалютна папулярнымі. Аднак да апошняга часу аўтар брэнду «За Свабоду» заставаўся невядомым. Прыйшоў час раскрыць імя. Карэспандэнт «Нашай Нівы» гутарыць з кіраўніком групы, якая распрацоўвала гэты брэнд — мастацтвазнаўцам **Вацлавам Арэшкам**.

## «Праца цэлага калектыву»

**«Наша Ніва»: Як узьнікла ідэя стварэньня брэнду «За Свабоду»?**

**Вацлаў Арэшка:** Брэндмэйкінгам мы займаемся вельмі даўно. Я кажу «мы», бо гэта не самотная праца, таксама гэта праца мастакоў, сацыёлягаў. Пакуль я не магу называць прозьвішчы тых, з кім я працаваў, але калі-небудзь гэта будзе вядома. Гэта праца цэлага калектыву. Першым брэндам, які быў створаны пад маім кіраўніцтвам, быў брэнд кампаніі «Выбірай» у 2001 годзе. Пасьля былі «Пяцёрка+», кампанія «Зробім лепш», лягатып Кангрэсу, сёньняшні значок Партыі БНФ. Але адчувалася, што патрэбныя новыя крокі. Мы правялі дасьледаваньні і вырашылі, што, каб у грамадзтве былі перамены, трэба працаваць зь меншасьцю, якая ў нас ужо ёсьць, замацаваць яе. Гэта тыя, хто ня ўдзельнічае ў вулічных акцыях, не зьяўляецца сябрамі партыяў, але прыхільны да нас. Трэба, каб на гэтых людзей нешта падзейнічала. Раней мы ішлі да людзей, як было зь «Пяцёркай+», з тымі самымі лёзунгамі, што і Лукашэнка. Улады таксама ня сьпяць у справе з брэндамі, той жа лёзунг «За Беларусь!» чаго варты.

З дапамогай сацыёлягаў мы правялі дасьледаваньне, каб даведацца, што для людзей найважнейшае. Прадстаўлялі пэўны сьпіс: свабода, праўда, справядлівасьць, незалежнасьць, стабільнасьць. І практычна ва ўсіх апытаньнях перамагала свабода. Так і зьявіліся першыя лягатыпы брэнду «За Свабоду».

## «Аб'яднала свабода»

**«НН»: Але чаму менавіта свабода набыла такую папулярнасьць у грамадзтве?**

**ВА:** Гэта лёзунг абсалютна непрымальны да Лукашэнкі. Ён можа быць за Беларусь, за незалежнасьць, за праўду, але ні ў якім разе не за свабоду. Пасьля мы прапанавалі гэты брэнд у штаб адзінага кандыдата. Па нашай схеме гэты лёзунг адразу вылучаў Мілінкевіча сярод іншых кандыдатаў. Кожны ў свабодзе знаходзіць нешта сваё: для прадпрымальнікаў свабода — гэта права на ўласнасьць, для студэнта — магчымасьць вучыцца за мяжой, для рабочых — свабода ад кантрактаў. Аднак наша схема не была выкарыстана падчас кампаніі. Колькі мы ня біліся, што патрэбны лёзунг з адным словам, перавага была аддадзена «Свабодзе. Праўдзе. Справядлівасьці». Аднак брэнд «За Свабоду» прыжыўся. Распаўсюджваньне брэнду «За Свабоду» было як вірус. Пазьнейшыя падзеі даказалі, што мы не памыліліся з брэндам.

Вацлаў Арэшка: «Годзе хавацца».


Юлія Дарашкевіч

**Вацлаў Арэшка**

Нар. у 1955 у Расеі. Дзяцінства прайшло паміж горадам Сьвярдлоўскам, дзе працаваў бацька, і вёскаю Жарабковічы ў Заходняй Беларусі, дзе жыў дзед. Гэтыя гістарычныя мясьціны вызначылі далейшую дасьледчую дзейнасьць — тэатразнаўства, гісторыя культуры й мастацтва Беларусі. Навуковыя інтарэсы: тэатральнае барока, шляхецкая культура. Перакладчык з польскай мовы.

**«НН»: Вы лічыце зьяўленьне брэнду «За Свабоду» найбольш пасьпяховым праектам дэмакратаў за гэты год?**

**ВА:** Выйшла так, што Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы прынялі гэты брэнд, яго прыняў зь невялікім спазьненьнем Мілінкевіч. З тымі ж «зубрамі» дамаўляліся, што мы будзем падтрымліваць іх акцыі «16», «Дзень салідарнасьці», а яны — «За Свабоду». Урэшце, «зубры» прызналі, што гэта наш супольны брэнд, які аб'ядноўвае ўсіх прыхільнікаў пераменаў. Ужо ладзіліся цэлыя канцэрты «За Свабоду». Жыццё пацьвярджае, што гэты лёзунг будзе актуальны да той пары, пакуль мы не здабудзем тую свабоду.

**«НН»: Чаму Ваша імя як аўтара гэтага праекту раней не гучала?**

**ВА:** На гэта ёсьць цэлы

шэраг прычынаў. Найперш таму, што гэта праца цэлага калектыву, а не аднаго мяне, я проста быў кіраўніком аналітычнай групы. Па-другое, калі ня вельмі афішуеш сваю дзейнасьць, спакайней жывеш. Яшчэ я не люблю быць публічным чалавекам. Аднак цяпер вырашыў, што годзе хавацца.

**«НН»: Што адчуваеце Вы як аўтар, калі бачыце на вуліцах людзей са значкамі «За Свабоду»?**

**ВА:** Мне вельмі прыемна. Я бачу, што гэта найбольш удалы сымбаль дэмсілаў за апошнія гады, бо ранейшыя значкі не карысталіся такой папулярнасьцю.

## «Мы стаім на парозе пераменаў»

**«НН»: Што правільна, а што няправільна рабіла ў гэтым годзе апазыцыя?**

**ВА:** Правільным было ўсё тое, што ня рушыла аб'яднаньня, што ішло да аб'яднаньня. Бо зараз найважнейшым зьяўляецца менавіта наша адзінства, незалежна ад поглядаў. Самая важная падзея году — гэта Вясна. Тут ёсьць некалькі меркаваньняў, я неаднаразова спрачаўся ў гэтым пытаньні з Уладзімерам Мацкевічам, які лічыць, што ў грамадзтве тады не адбылося значных зьменаў. Я ж лічу, што адбыліся якасныя зьмены ўнутры грамадзтва. Людзі сталі больш гатовымі да пераменаў і да ўдзелу ў іх. Мы зрабілі крок наперад, які не рабілі апошнія гады.

**«НН»: Думаеце, людзі будуць зноў і зноў выходзіць на вуліцу?**

**ВА:** Для гэтага патрэбны моцны зьнешні фактар кшталту выбараў. Людзі выйдуць на вуліцы, калі ўзьнікне пагроза незалежнасьці Беларусі. Без такога чыньніка вывесьці людзей на вуліцу будзе немагчыма. Вясной мы былі за пару крокаў ад перамогі. Я адчуваю, што мы стаім на парозе нейкіх пераменаў, якіх дакладна, я ня ведаю, але ўпэўнены, што яны будуць. Наша асноўная задача цяпер — не ўпусьціць магчымы шанец, не аказацца ў маргінэзе.

## «Лідэра мусіць выбраць вуліца»

**«НН»: Ці мусіць Мілінкевіч заставацца лідэрам апазыцыі?**

**ВА:** Сытуацыя зь лідэрствам залежыць ад самога лідэра. Увесну Мілінкевіч паказаў, што меў вялікія шанцы стаць агульнанацыяльным, а ня выбарным лідэрам, але Мілінкевіч не скарыстаў яго. Цяпер я лічу, што ягоны шанец найхутчэй страчаны. Хаця Мілінкевіч застаецца вельмі значным аўтарытэтам, асабліва на Захадзе.

**«НН»: Дык з кім мы выйдзем наступным разам на Плошчу?**

**ВА:** Калі пачнецца новая бойка, то пытаньне лідэрства можа вырашыцца само па сабе і нечакана. Можна выбраць дзесяць лідэраў, але ніводзін ня стане правадыром. Сёньня вулічны лідэр не павінен быць абраны, яго мусіць нарадзіць вуліца. У Мілінкевіча быў момант, калі ён ішоў па Плошчы падчас мітынгу, і людзі разам крычалі: «Мілінкевіч!» Такога не было пры Ганчарыку. Трэба рэальна прызнаць, што вясной ніхто не рыхтаваў зьменаў у краіне, але калі на вуліцы аказалася 20 — 30 тысячаў чалавек, то ніводзін з бакоў ня ведаў, што рабіць у гэтай сытуацыі. Мілінкевіч ня ведаў у тым ліку. Цяпер нам патрэбная распрацаваная стратэгія, тактыка, каб ведаць, што і як рабіць. У такім выпадку шанцаў на перамогу будзе болей.

## «Рэжым будзе хістацца»

**«НН»: Выказваюць меркаваньне, што апазыцыі выгадна жыць на гранты, і яна ня хоча зьменаў у краіне. Што Вы можаце на гэта сказаць?**

**ВА:** Прызнаюся, што такія людзі сапраўды існуюць. Асабліва сярод лідэраў апазыцыі другога зьвяна. Нават сярод апазыцыі ёсьць людзі, якія баяцца пераменаў, але такіх меншасьць, я б нават сказаў, што вельмі нязначны адсотак. Я перакананы, што такіх людзей увогуле няма сярод моладзі і сярод тых, хто ходзіць на акцыі.

**«НН»: Што мусіць у наступным годзе рабіць апазыцыя, каб перамагчы?**

**ВА:** Рэжым будзе хістацца. А мы мусім ціснуць на ўладу, торгаць яе ўвесь час, толькі ў такім выпадку будзем мець шанцы на перамогу. А таксама працягваць далейшае аб'яднаньне. Што датычыцца пытаньня стратэгіі і тактыкі, думаю, яно будзе прынятае на хуткім ужо Кангрэсе.

**«НН»: Якую асобу і падзею 2006 году адзначылі б асабіста Вы?**

**ВА:** Вядома, Мілінкевіча. Гэта была абсалютна новая фігура ў палітычным полі Беларусі, якая зрабіла шмат. Ён заслугоўвае званьня чалавека году. Што да падзеі, то гэта адназначна падзеі 19 — 25 сакавіка, бо гэта было нешта абсалютна новае ў беларускай гісторыі.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

## ЗДЫМКІ ГОДУ



WWW.SVABODA.ORG

**Значкі «За Свабоду!» займелі шалёную папулярнасьць і вярнула моду на значкі менскім вуліцам.**

# Крысьціна Вітушка, Юлія Малахоўская: Мы не паказвалі дзіцяці «Калыханку»

Гутарка з стваральніцамі сайту для беларускамоўных бацькоў «Нашы дзеткі».

**«Наша Ніва»: Як узьнікла ідэя стварэньня сайту dzietki.org?**

**Юлія Малахоўская:** Гэта пачыналася ў розных галовах у розны час, а пасьля ўсё аб’ядналася. Асабіста я апынулася ў такой сытуацыі, калі ў мяне нарадзілася дзіця, а ні ў кога зь сяброў дзяцей яшчэ не было. Не было з кім абмяркоўваць штодзённыя праблемы. Таксама не было беларускамоўнага сайту, дзе чэрпаць патрэбную інфармацыю. Я зрабіла нейкі разгорнуты інтэрнэт-дзёньнік, на які пазьней натрапілі Аліна Стэфановіч і Крысьціна Вітушка. Так мы знайшліся.

**«НН»: Якую канцэпцыю мае ваш сайт?**

**КВ:** Найперш, пазбавіць сацыяльнай ізаляванасьці жанчынаў з малымі дзецьмі. Па-другое, даць інфармацыю пра сямейныя пытаньні, пра выхаваньне беларускамоўных дзетак. Ёсьць мноства падобных расейскамоўных сямейных сайтаў, але не было ніводнага беларускага.

**ЮМ:** Гэта і спосаб згуртаваць рэальных людзей, каб дзеці расьлі разам, ладзіць сьвяты. Ёсьць і наступная пазыцыя: на сайце рэгіструецца мама, якая піша, што жыве на той і той вуліцы у тым і тым горадзе. Пасьля гэта бачаць іншыя мамы і яны ўтвараюць сваю супольнасьць у межах нейкага раёну ці двара. З пытаньня на форуме: «Хто тут ёсьць з Горадні?» паўстала сёлетняя гарадзенская елка, якая сабрала сто чалавек.

**КВ:** Мы хочам, каб беларускамоўныя дзеці не пачуваліся самотнымі ў гэтым сьвеце. Калі беларускае выціснута да стану маргінальнасьці, хочацца даказаць, што мы таксама на нешта вартыя. Мы арыентуемся на суcьветныя стандарты. Хочацца, каб нашыя дзеці былі канкурэнтаздольнымі пры паступленьні ў школу і маглі выбіраць ня толькі гуманітарныя спэцыяльнасьці, але быць і матэматыкамі, фізыкамі, лекарамі. Нашы дзеці ня тое што абдзелены нейкімі вабнотамі дзяцінства, але і маюць іх нашмат болей, чым расейскамоўныя аднагодкі. У значнай ступені гэта стала магчыма дзякуючы працы сайту.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Крысьціна Вітушка (зьлева): найбольш стамляе ў выхаваньні беларускамоўных дзетак вечны гераізм, калі натуральныя справы ператвараюцца ў нейкія звышвысілкі.**

**«НН»: Зь якімі праблемамі сутыкаюцца сем’і, што выхоўваюць беларускамоўных дзетак?**

**ЮМ:** Не хапае добрых беларускіх кніжак. Нават, калі яны ёсьць, іх якасьць пакідае жадаць лепшага. Даводзіцца набываць прыгожыя расейскія кніжкі, перакладаць, а пасьля ўклейваць свой варыянт усярэдзіну і чытаць малым. Таксама амаль няма перакладных мульцікаў.

> З пытаньня на форуме «Хто тут ёсьць з Горадні?» паўстала сёлетняя гарадзенская беларускамоўная елка, якая сабрала сто чалавек.

**КВ:** Адсутнасьць беларускамоўных садкоў. Нават калі садок і адкрываецца, потым бацькі глядзяць, што ім далёка вазіць дзяцей, і вырашаюць аддаць іх у расейскамоўны. Для нас ужо сёньня стаіць пытаньне аб наборы беларускамоўных групаў у садкі. Апроч мульцікаў ёсьць яшчэ праблема беларускамоўнага тэлебачаньня. Мы адмыслова не паказвалі свайму дзіцяці «Калыханку», але аднойчы ён яе ўбачыў. Быў вельмі ўзрадаваны гэтаму мядзьведзіку, які гаворыць па-беларуску, але тут пачаўся расейскамоўны мульцік, якога дзіця амаль не разумее, ад чаго пачынае плакаць. Цяпер мы паказваем дзіцяці гэтага мядзьведзіка, пасьля ўключаем відэамагнітафон і паказваем мульцік, разам з тым сочым па гадзіньніку, каб пасьпець уключыць тэлевізар на разьвітаньне зь Мішкам. Што найбольш стамляе ў выхаваньні беларускамоўных дзетак — гэта вечны гераізм, калі натуральныя справы ператвараюцца ў нейкія звышвысілкі.

**«НН»: «Нашы дзеткі» — сайт толькі для беларускамоўных мамаў ці для татаў таксама?**

**КВ:** Былі выпадкі, калі маладыя таты рэгістраваліся на сайце ад імя сваіх жонак. Звычайна прыходзіць мэйл: «Мая жонка хоча зарэгістравацца на вашым сайце, як гэта зрабіць?» Мы адказваем. Пасьля прыходзіць мэйл: «Атрымалася! Зараз

яна нешта напіша». Часта гэта здараецца ў рэгіёнах, калі жанчыны сталі беларускамоўнымі толькі праз вялікае каханьне да свайго мужа, і гэта іх першы выхад «у сьвет». Мужчыны заходзяць на сайт з чыста мэркантыльных інтарэсаў, раздрукаваць інфармацыю, каб пасьля паказаць жонцы, даць паглядзець дзецям мульцік. Удзельнічаць у форумах — гэта не для іх.

**«НН»: Якія тэмы абмяркоўваюцца на Вашым сайце?**

**КВ:** Самыя розныя: ад цяжарнасьці да праблемы сэксу. На лінарачках людзі пішуць, што да нараджэньня дзіцяці засталося столькі і столькі дзён. Пішуць: «Ён павінен быў нарадзіцца тры дні таму». Пасьля чалавек зьнікае. Мы разумеем, што ўсё ўжо добра. А потым зьяўляецца новая лінарачка: «Міраславу 3 дні» і г.д. Абмяркоўваем, якія пампэрсы купляць дзецям, парады па здароўі, сямейны адпачынак, любімыя кавярні, дзе паставіць елку ў хаце. Ёсьць «балбаталка», дзе мы не гаворым пра нейкія там сур'ёзныя справы, а пра ўсё, што набаліць. Ёсьць рубрыкі кшталту «Прадам», «аддам», «набуду». Ёсьць дзьве тэмы для дарослых: «пра гэта» і «не пра гэта». «Пра гэта» адпаведна пра сэкс, пра сэкс па-беларуску, сэкс і палітыка, там жа чамусьці і пра сьвякруху, пра разводы, вясельлі. Часта менавіта на гэтым форуме пасярод ночы сустракаюцца па 12—13 чалавек. Паўстае пытаньне: што ж вы робіце тут? Сышліся ў меркаваньні, што ва ўсіх рэзка пачаліся крытычныя дні ці раптоўна мужы зьехалі ў камандзіроўку. «Не пра гэта» пачаўся як разьдзел пра палітыку, але цяпер там пра ўсё, што тычыцца дарослых і ня тычыцца сэксу і сьвякрухі. Існуе разьдзел «Мова», дзе заўсёды можна запытацца, як тое ці іншае слова будзе па-беларуску. Ёсьць схаваны форум для «вузкага кола абмежаваных людзей», далучыцца да якіх вялікі гонар. Кожны зарэгістраваны ўдзельнік можа стварыць фотагалерэю.

**«НН»: Ці чакалі Вы, што за адносна кароткі час ваш сайт зробіцца такім папулярным?**

**ЮМ:** (*сьмяецца*) Мы чакалі большага посьпеху! Гэта мы толькі пачынаем!

**КВ:** Гэта было непазьбежна. Папулярнасьць сайту вынікае з таго, што ў моладзевых арганізацыях большую частку складаюць дзяўчыны, але пасьля ў дарослых грамадзкіх, партыйных структурах дамінуюць мужчыны. Куды дзяюцца жанчыны? Яны досыць пасьпяхова выхоўваюць дзяцей. Узьнікае пытаньне: чаму б ім не падзяліцца сваім досьведам зь іншымі? Калі б гэта не стварылі мы, гэта стварыў бы нехта іншы. Наша патэнцыйная аўдыторыя складае 5 тысячаў чалавек.

**«НН»: Чаго чакае сайт «Нашы дзеткі» ад наступнага году?**

**КВ:** Рэальнага напаўненьня для ўсіх сайтаўскіх разьдзелаў, сканчэньня працы над разьдзеламі распачатымі, але яшчэ ня скончанымі. Нам трэба яшчэ некалькі чалавек, якія б маглі займацца разам зь Юляй тэхнічным бокам справы. Увогуле, мяне дзівіць: адкуль у яе хапае часу працаваць, вучыцца, гадаваць дзіця, займацца сэксам, сустракацца з намі і рабіць усё гэта пасьпяхова. Спадзяёмся, што рэальныя супольнасьці зьявяцца ня толькі ў Менску, але і ў рэгіёнах, і на эміграцыі. Ужо сёньня мы не абмяжоўваемся сайтам, але і ладзім імпрэзы для дзетак, выдаём паштоўкі і шмат чаго яшчэ робім.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

## ЗДЫМКІ ГОДУ



У год стагодзьдзя «Нашай Нівы» яе рэдактар трапіў у астрог. Андрэй Дынько выходзіць з Акрэсьціна. 31 сакавіка.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Высяленьне Саюзу пісьменьнікаў з Дому літаратара.

АРЦЁМ ЛЯВА




У 2006 годзе скульптар Алесь Шатэрнік адліў Звон Свабоды.

# Найлепшыя кнігі 2006

Тытул найлепшых кніг году дзеляць выданьні навуковыя і мастацкія. Верх сьпісу занялі Зборы твораў Юр'я Туронка, укладзены Валерам Булгакавым, і Антона Луцкевіча, укладзены Анатолем Сідарэвічам. Побач зь імі — творы клясыкаў даўніх і сучасных: Рыгора Барадуліна, Алеся Асташонка, Анатоля Сыса, Янкі Брыля, Максіма Багдановіча, Валянціна Акудовіча.




Сярод іх у сьпіс прарвалася дэталёвая рэляцыя дзейнасьці Беларускага Народнага Фронту аўтарства аднаго зь лідэраў руху Сяргея Навумчыка. Гэтая кніга разышлася адным з найбольшых тыражоў за мінулы год (у часопісе «ARCHE», плюс асобным выданьнем, прычым праз яе Міністэрства інфармацыі прыпыніла часопіс на тры месяцы).

Чытачы і крытыкі адзначылі сабе сталеньне новай перакладчыцкай школы ў Беларусі (пераклады з Галчыньскага і Баяя).

Нарэшце, у сьпіс найлепшых увайшлі дзьве кнігі ў ня самых частых жанрах: адзін фотаальбом і адна кніга радыёнарысаў. Гэта сьведчыць найперш пра непераўзыдзены талент іхных аўтараў — Дзяніса Раманюка, Анатоля Клешчука і Вячаслава Ракіцкага.

Асобна варта вылучыць цёпла сустрэты крытыкамі, як зь дзяржаўных, так і зь незалежных выданьняў, зборнік артыкулаў маладэчанскага бібліятэкара-краязнаўцы Міхася Казлоўскага.

Варта адзначыць і новы зборнік Андрэя Хадановіча: ён трапіў у сьпіс, хоць выйшаў менш чым за тыдзень да яго складаньня.

А вось топ-8 якасных выдавецтваў:

1. Логвінаў (4 кнігі ў сьпісе)
2. Радыёла-плюс (2)
3. Кнігазбор (2)
4. Інстытут беларусістыкі (1)
5. Мастацкая літаратура (1)
6. Про-Хрысто (1)
7. Беларускія ведамасьці (1)
8. Радыё «Свабода» (1)

Для параўнаньня: летась найлепшымі кнігамі году былі прызнаныя кнігі Ларысы Геніюш «Каб вы ведалі: з эпісталярнай спадчыны» (Лімарыюс), «Энцыкляпэдыя Вялікага Княства Літоўскага» (Беларуская энцыкляпэдыя) і перавыданьне Ўладзімера Караткевіча «Быў. Ёсьць. Буду» (Мастацкая літаратура). Пазалетась экспэрты «НН» назвалі найлепшымі кнігамі году альбом Часлава Пяткевіча «Рэчыцкае Палесьсе» (Кнігазбор), зборнік прозы Барыса Пятровіча «Шчасьце быць...» (Тэхнапрынт) і альбом Аляксандра Аляксеева і Алега Лукашэвіча «Спадчына Беларусі» (Менская фабрыка каляровага друку).

Выніковы сьпіс кніг падаецца паводле падліку агульнай колькасьці балаў у 10-бальнай сыстэме. Найлепшая кніга ў сьпісе кожнага экспэрта атрымлівае 10 балаў, наступная — 9 і г.д. (Выняткам сёлета складаюць сьпісы Ўладзімера Арлова, Паўла Абрамовіча, Анатоля Івашчанкі).

**1. Юры Туронак. Мадэрная гісторыя Беларусі. — Інстытут беларусістыкі, Вільня. — 42 балы.**

**2. Рыгор Барадулін. Руны Перуновы. — Радыёла-плюс. — 33 балы.**

**3. Антон Луцкевіч. Выбраныя творы: Праблемы культуры, літаратуры і мастацтва. / Укл., прадм. і камэнт. Анатоля Сідарэвіча. — Беларускі кнігазбор. — 30 балаў.**

**4. Алесь Асташонак. Жоўты колер белага снегу. — Мастацкая літаратура. — 23 балы.**

**5. Анатоль Сыс. Лён: Выбраныя творы. — Кнігазбор. — 18 балаў.**

**6. Сяргей Навумчык. Сем гадоў адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988 — 1995). — Варшава: Беларускія ведамасьці, Прага: Clovek v tisni. — 17 балаў.**

**7. Янка Брыль. Парастак: запісы і эсэ. — Про-Хрысто.**

**Вячаслаў Ракіцкі. Беларуская Атлянтыда: рэаліі і міты эўрапейскай нацыі. — Радыё «Свабода». — Па 15 балаў.**

**8. Канстанты Ільдэфанс Галчыньскі. Сёмае неба: выбраныя творы. — Логвінаў. — 14 балаў.**

**9. Максім Багдановіч. Інтымны дзёньнік. — Радыёла-плюс.**

**Чарнобыль. Да 20-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС: Альбом. / Укл. Дзяніс Раманюк. Выд. Дзяніс Раманюк. — Па 13 балаў.**

**10. Міхась Казлоўскі. Галасы разбуджаных птушак. — Логвінаў.**

**Валянцін Акудовіч. Дыялёгі з Богам. — Логвінаў.**

**Баяя Антанін. Зваўчэньне: раманэта пра ваўкоў, людзей і знакі. — Логвінаў. — Па 11 балаў.**

**Кнігарня «Акадэмкніга»** (Менск):
1. Слуцкие пояса: Альбом. Укл. М.Яніцкая.
2. Туронак Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі.
3. Танк Максім. Збор твораў у 13 т. (1 і 2 т.)
4. Басько В., Варфаламеева Т., Козенка М., Кухаронак Т., Смірнова І., Цітоў В. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў у 6 тамах.
5. Дудзюк З. Кола ворага.
6. Барадулін Р. Руны Перуновы.
7. Разанаў А. Каб мелі шчасьце ўваскрасаць і лётаць.
8. Багдановіч М. Інтымны дзёньнік.
9. Грыбоўскі Ю. Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фармаваньнях 1918 — 1945 гадоў.
10. Арабей Л. На полымі любві: Жыцьцё і творчасьць Цёткі.
11. Кірычэнка В. Менск. Гістарычны партрэт гораду (1953 — 1959).

**«Кнігарня пісьменьніка»** (Менск):
1. Багдановіч М. Інтымны дзёньнік.
2. Разанаў А. Каб мелі шчасьце ўваскрасаць і лётаць.
3. Барадулін Р. Руны Перуновы.
4. Плыткевіч С. Нечаканая Беларусь.
5. Адамушко В., Елинская М. Гербы и флаги Беларуси.
6. Чароўныя пацеркі. Беларуская аўтарская казка. / Укл. А. Масла.
7. Малашевич Е. Минск. Книга жизни.
8. Орлова Т., Карелин А. Ростислав Янковский. Артист.
9. Красная книга Республики Беларусь. Растения.
10. Красная книга Республики Беларусь. Животные.

**Віталь Скалабан**, гісторык, архівіст:
1. Луцкевіч А. Выбраныя творы: Праблемы культуры, літаратуры і мастацтва. / Укладаньне, прадмова, камэнтары А.Сідарэвіча.
2. Православная церковь на Витебщине (1918 — 1991). Документы и материалы.
3. Чарнобыль. Да 20-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС: Альбом. / Укл. Дз. Раманюк.
4. Сыс А. Лён.
5. Мікуліч А. Беларусы ў генэтычнай прасторы.
6. Карамазаў В. Антон.
7. Туронак Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі.
8. Шніп В. Баляда камянёў.
9. Карпечанка М. На скрыжаваньні болю і надзеі.
10. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь: Альбом.

**Даніла Жукоўскі**, публіцыст, крытык літаратуры:
1. Сазонаў В. Занатоўкі кантрабандыста.
2. Маракоў Л. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794 — 1991 гг.: Энцыкл. даведнік.
3. Разанаў А. Кніга Ўзнаўленьняў.
4. Туронак Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі.
5. Королевский город Гродно. / Укл. А. Семенчук, А. Петров, С. Плыткевич
6. Агульнагеаграфічныя атласы вобласцяў Беларусі.
7. Ракіцкі В. Беларуская Атлянтыда.
8. Каханы горад: зборнік эміграцыйнае ваеннае прозы.
9. Дубовік Ю. Дзеля Рэчы Паспалітай Беларусі.

**Міхась Скобла**, паэт, аглядальнік радыё «Свабода»:
1. Луцкевіч А. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва. / Укл., прадм., кам. А. Сідарэвіча.
2. Туронак Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі.
3. Ракіцкі В. Беларуская Атлянтыда.
4. Грыбоўскі Ю. Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фармаваньнях 1918 — 1945 гадоў.
5. Брыль Я. Парастак.
6. Барадулін Р. Руны Перуновы.
7. Гілевіч Н. Мой тастамэнт.
8. Сыс А. Лён.
9. Галчыньскі К. І. Сёмае неба.
10. Фядута А. Паэтычны аглядальнік.
11. Шніп В. Баляда камянёў.
12. Беларускі фальклёр: Энцыкляпэдыя ў 2 тамах.

**Павал Абрамовіч**, крытык літаратуры:
1. Асташонак А. Жоўты колер белага снегу.
2. Барадулін Р. Руны Перуновы.
3. Баяя А. Зваўчэньне.
4. Бяляцкі А. Прабежкі па беразе Жэнэўскага возера.
5. Глёбус А. сУчасьнікі.
6. Дракохруст А. Что было — то было. Из воспоминаний и записных книжек.
7. Казлоў А. Юргон.
8. Кісьліцына Г. Новая літаратурная сытуацыя: зьмена культурнай парадыгмы.
9. Навумчык С. Сем гадоў Адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988 — 1995).
10. Чарнобыль. Да 20-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС: Альбом. / Укл. Дз. Раманюк.
Усім кнігам — пяць балаў.

**Леанід Галубовіч**, аглядальнік тыднёвіка «Літаратура і мастацтва»:
1. Асташонак А. Жоўты колер белага снегу.
2. Дашкевіч В. Адзін пад зорамі.
3. Акудовіч В. Дыялёгі з Богам.
4. Галчыньскі К.І. Сёмае неба.
5. Баяя А. Зваўчэньне.
6. Бахарэвіч А. Ніякай літасьці Валянціне Г.
7. Барадзіна М. Вышэй за паўночны вецер.
8. Кісьліцына Г. Новая літаратурная сытуацыя: зьмена культурнай парадыгмы.
9. Голуб Ю. Багра.
10. Фядута А. Паэтычны аглядальнік.
11. Релес Г. Еврейские советские писатели Белоруссии.

**Анатоль Івашчанка**, кіраўнік справаў Саюзу беларускіх пісьменьнікаў:
З прычыны адсутнасьці крытэраў для параўнаньня настолькі розных жанрава і стылёва кнігаў, разьмяшчаю сваю дзясятку ў альфабэтным парадку з прысуджэньнем роўнай колькасьці балаў (па пяць).
1. Арлоў У. Паром праз Ля-Манш.
2. Асташонак А. Жоўты колер белага снегу.
3. Барадзіна М. Вышэй за паўночны вецер.
4. Бахарэвіч А. Ніякай літасьці Валянціне Г.
5. Галчыньскі К. І. Сёмае неба.
6. Казлоўскі М. Галасы разбуджаных птушак.
7. Каўка А. Каб не забыцца (допісы розных гадоў).
8. Паўлухін А. Электрычныя сны.
9. Пашкевіч А. Круг: раман-біяграфія.
10. Сін І. Сапсаваныя лялькі.

**Алег Дзярновіч**, гісторык:
1. Туронак Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі.
2. Навумчык С. Сем гадоў адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988 — 1995).
3. Мэтрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 46 (1562 — 1565). Кніга запісаў 46 (Копія канца XVI ст.). / Падр. В. Мянжынскі.
4. Ярмусик Э. Католический Костёл в Беларуси в 1945 — 1990 годах.
5. Лобач У. Этнаграфія Беларусі.
6. Стражев В. К тайнам Вселенной.
7. Королевский город Гродно / Укл. А. Семенчук, А. Петров, С. Плыткевич.
8. Вішнёў З. Фараон у заапарку.
9. Хадановіч А. Сто лістоў на tut.by.
10. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах. / Уклад. А. Гесь, У. Ляхоўскі, У. Міхнюк.

**Уладзімер Арлоў**, пісьменьнік:
Уладзімер Арлоў традыцыйна не вызначаў месца кнігі, а склаў свой сьпіс паводле альфабэту (усім сямнаццаці кнігам — па тры балы).
1. Акудовіч В. Дыялёгі з Богам.
2. Асташонак А. Жоўты колер белага снегу.
3. Барадулін Р. Руны Перуновы.
4. Ёрш С., Горбік С. Беларускі Супраціў.
5. Івашчанка А. Вершnick.
6. Іпатава В. Апошнія ахвяры сьвяшчэннага дуба.
7. Казлоўскі М. Галасы разбуджаных птушак.
8. Kotljarchuk A. In the Shadows of Poland and Russia. The Grand Duchy of Lithuania and Sweden in the European Crisis of the mid-17th Century.
9. Кудасава Н. Лісьце маіх рук.
10. Навумчык С. Сем гадоў Адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988 — 1995).
11. Несьцярчук Л. Андрэй Тадэвуш Банавэнтура Касьцюшка. Вяртаньне героя на Радзіму.
12. Пашкевіч В. Ангельска-беларускі слоўнік.
13. Плыткевіч С. Нечаканая Беларусь.
14. Разанаў А. Каб мелі шчасьце ўваскрасаць і лётаць.
15. Ракіцкі В. Беларуская Атлянтыда.
16. Туронак Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі.
17. Хадановіч А. Сто лістоў на tut.by.

**Генадзь Вінярскі**, выдавец (Беларускі кнігазбор):
1. Луцкевіч А. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва. / Укл., прадм., кам. А.Сідарэвіча.
2. Брыль Я. Парастак.
3. Сыс А. Лён.
4. Барадулін Р. Руны Перуновы.
5. Караткевіч У. Выбраныя творы.
6. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах. / Уклад. А.Гесь, У.Ляхоўскі, У.Міхнюк.
7. Бядуля Зьмітрок. Выбраныя творы.
8. Казлоўскі М. Галасы разбуджаных птушак.
9. Беларускі фальклёр: Энцыкляпэдыя ў 2 тамах.
10. Фядута А. Паэтычны аглядальнік.

**Склала Вольга Данішэвіч**

# Мода на падпольнае

Дыскі з падпольнай музыкай разыходзяцца такімі накладамі, якія айчынным папсавікам нават ня сьняцца. Піша **Сяргей Будкін**.

Гэты музычны год быў багаты на супярэчлівыя зьявы. З аднаго боку, уціск незалежнага беларускага року працягваўся, і сытуацыя набыла зусім ужо вычварэнскія формы, уласьцівыя для часоў Андропава. Але зь іншага боку, беларуская незалежная музыка зацьвердзілася ў такім статусе: даваць канспіратыўныя канцэрты сталася модным нават сярод тых, хто ў тыя «чорныя» сьпісы яшчэ не патрапіў, пазнака «забаронена ў Беларусі» на замежнай канцэртнай афішы нашага гурту стала лепшай за любую рэкляму, а дыскі з падпольнай музыкай разыходзіліся такімі накладамі, якія айчынным папсавікам нават ня сьніліся. Культура беларускага супраціву сталася нагэтулькі моднай, што на нашай мове запявалі расейцы, палякі, украінцы, немцы.

## Тэндэнцыя году

«Беларусь у Эўропе!» — гэта можна канстатаваць, паглядзеўшы толькі геаграфію выступаў айчынных выканаўцаў. У прынцыпе тое, што нашы музыкі граюць на цэнтральнай плошчы Варшавы, выступаюць у Каралеўскім тэатры ў Стакгольме, на буйных поп-, рок-, фольк-фэстах і ў невялічкіх кавярнях Парыжу, дзівіць не павінна. Каб беларускую незалежную музыку яшчэ й не ігнаравалі чыноўнікі ды дзяржаўныя мэдыі...

2006 год засьведчыў цікавасьць міжнароднай супольнасьці да беларускай песьні. «Аляксандра і Канстанцін» сталіся ляўрэатамі «Discovery 2006» у Варне, скарыўшы публіку песьняй «Сьвяты вечар».

Хлопцы з N.R.M., якія ў сталіцы Беларусі не далі аніводнага афіцыйнага канцэрту, адыгралі цягам году ў сталіцах Польшчы, Літвы, Славакіі, Швэцыі.

«Дзюбэлі» двойчы запалілі ў Празе ды Варшаве.

Тацяна Беланогая перамагла на міжнародным бардаўскім фэсьце «Ballada OPPA».

Мала каму вядомы на радзіме гурт «Nhs-etho» дастаў перамогу на «Мікалайках» — буйным фольк-форуме.

А «Ляпісы» з «Сашам і Сірожам», якія цягам году цалкам адсутнічалі на беларускіх тэлеканалах, трыюмфавалі ва Ўкраіне. Беларускі дуэт са сваімі «Калыханкамі» быў сярод намінантаў на «Тэлетрыюмф» — прэміі Нацыянальнай рады Ўкраіны ў пытаньнях ТВ і радыё, а дыск «Ляпіса» — «Ты кінула» — папулярны ўкраінскі музычны часопіс «Mixer» уключыў у Топ-300 галоўных альбомаў у гісторыі сусьветнай (!) музыкі.

Увага да Беларусі ў сувязі з палітычнымі падзеямі ў нашай краіне прывялі і да ўсплёску цікавасьці з боку музычных нефармалаў сьвету. Так, бостанскі панк-гурт «Чолгаш» адправіў некалькі сваіх CD зь песьняй «F**k Lukashenko» у беларускую амбасаду. Вакаліст аўстралійскай каманды The Morning After Girls эпатуе публіку сваім сцэнічным імем — Саша Лукашэнка. Украінцы з De Shifer адмыслова да 19 сакавіка прэзэнтавалі свой «памаранчавы» гіт «Час прыйшоў», перасьпяваны па-беларуску.

## Асобы году

Акром стандартнага набору прэтэндэнтаў на гэтае званьне, у беларускай музычнай індустрыі сёлета можна сьмела далучаць яшчэ колькі чалавек. Найперш пра звыклых.

Хоць новага альбому ад N.R.M. і «Крамбамбулі» сёлета не дачакаліся, іхны лідэр Лявон Вольскі працягвае заставацца ў топе галоўных асобаў. Гурт сёлета дзе толькі ня граў — і ў пасольскіх рэзыдэнцыях, і ў паўпадпольных кавярнях, і на лецішчах у сяброў — але толькі не ў банальных канцэртных залях. Нізьзя! Тым ня менш, адсутнасьць дазволеных канцэртаў не нашкодзіла тутэйшай публіцы на памяць вывучыць яшчэ ня выдадзены новы гіт N.R.M. «Мінск-Менск». Альбом каманды, дарэчы, ужо цалкам запісаны і чакае свайго выданьня налета.

Зьміцер Вайцюшкевіч акром статусу «самага актыўнага беларускага музыкі» сёлета яшчэ набыў статус «мачо айчыннага року». І падобна на тое, што Зьмітру гэта даспадобы. Сьпявак пасьпеў сёлета адзначыцца ў альбоме Вольгі Залескай, засьпяваць з Тамарай Лісіцкай і Ларысай Грыбалёвай ды спакусіць дачку Глёбуса :). Акром таго, ён узяў удзел у запісе першага «нябардаўскага» альбому Алеся Камоцкага, зрабіць «супольны праект» для дзетак зь беларускамоўнымі калыханкамі і не забыцца запісаць, натуральна, два сольныя дыскі.

Варта ў гэтай намінацыі згадаць і рэпэра Крова з «Чырвоным па белым», з дапамогай якога ў беларускага хіп-хопу крыху затахкала сэрцайка. Можна сьмела называць яго самай нясьціплай асобай у беларускім андэргграўндзе, але ж мае права: дзясяткі тысяч спампаваных зь ягонага сайту песень, дэбютны дыск-складанка з галоўных песень ды матэрыял у нямецкім «Backspin» таму ёсьць пацьверджаньнем.

Не абысьціся ў гэтай намінацыі і безь Міхала Анемпадыстава, прызнанага «Чалавекам году ў беларускай музыцы» Інтэрнэт-парталам «Тузін Гітоў». Менавіта яму належыць аўтарства апошняга гіта IQ-48 «Сьвятло ў цемры» і беларускага варыянту знакамітай «Аўтабіяграфіі», якія доўгі час трымалі лідэрства ў гіт-парадзе.

Паэт бліскуча правёў свой уласны «Бэніфэст» 12 сьнежня, стварыўшы ў не-

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**Якая песьня 2006 году найлепшая?**

| | |
|---|---|
| Гадзючнік [Усё роўна мы пераможам] (NRM) | 139 (21.0%) |
| Мінск—Менск (NRM) | 120 (18.1%) |
| Возле дома твоего (Сярога) | 7 (1.1%) |
| Сьвятло ў цемры (IQ–48) | 30 (4.5%) |
| Аўтабіяграфія (Варашкевіч–Вольскі) | 37 (5.6%) |
| Край (Neuro Dubel) | 48 (7.2%) |
| Не жадаю (Чырвоным па беламу) | 109 (16.4%) |
| Беларусь будзе вольнай (Таварыш Маўзэр) | 141 (21.3%) |
| Слушай Батьку (Алеся, Анатоль Ярмоленка) | 32 (4.8%) |

Усяго прагаласавала: 663

вялічкім сталічным клюбе на караценькі час атмасфэру непадцэнзурнасьці і свабоды творчасьці.

## Фэстывалі году

Сёлета адрадзілася «Рок-каранацыя». Трэба сказаць, час для вяртаньня цырымоніі быў абраны ня надта спрыяльны, аднак шоў выйшла на славу. Патаемнымі сьцежкамі-дарожкамі ў «казу» пратачыліся тыя, хто ў першапачатковым сцэнары не фігуравалі, аднак бязь іх мерапрыемства губляла б свой сэнс, таму арганізатары рызыкнулі. Кароны раздалі гуртам, назвы якіх малаабазнанаму слухачу мала што скажуць: «Выпіць і паплакаць» (закансьпіраваны Neuro Dubel) атрымалі «Альбом году», а гурт «Варашкевіч і Ка» (тое «Крама») атрымаў званьне «Лепшы блюз-рок выканаўца». Нехта Піт Паўлаў павітаў са сцэны Мілінкевіча і сыграў папуры з гітоў адной папулярнай каманды, а каранаваны як гурт году J-Mors праз тое адмовіўся выходзіць на сцэну. Падалося ім, бач ты, што беларуская цырымонія ў галіне рок-музыкі занадта палітызаваная. У выніку галоўная «Рок-Карона» так і не знайшла свайго героя.

«Басовішча» прайшло на традыцыйным узроўні, праўда, шматлікія сябры журы фэстывалю адзначылі, што сёлета ўзровень канкурсантаў быў слабейшы, чым раней. Адкрыцьця кшталту «Таварыша Маўзэра» на сёлетніх «Басах» сапраўды бачна не было. Перамаглі някепскія, але трохі другасныя «S.D.M.» і «Парасон», але фэст поўніўся міні-адкрыцьцямі (як магілёўскі «Водар Сусьвет»), нечаканасьцямі (як выступ літоўскай рокзоркі IR і дэбют на «Басовішчы» гурту «Тройца») і заўсёднай гарадоцкай душэўнасьцю.

Яшчэ адным прэтэндэнтам на званьне «Фэст году» мог бы стаць «баброўскі» фэстывальны дуэт «Вольнае паветра» (Крупкі) / «Рок за баброў» (Бабруйск). Але... Першаму надта нашкодзіла надвор’е, скамячыўшы праграму і разагнаўшы значную частку публікі. А другому — чыноўніцкія забаб(р)оны. Менавіта з «Рокам за Баброў» у айчынную рок-музыку вярнулася літаваньне. У выніку праз «чыноўніцкае» сіта прайшлі ў асноўным бяскрыўдныя расейскамоўныя рокеры.

Галоўнай фэстывальнай падзеяй сёлета сталася полацкае «Рок-Кола». І без таго штогод насычаны конкурс сёлета набыў яшчэ адну цікавасьць — кожны выступоўца, незалежна ад сваёй геаграфічнай прыналежнасьці, мусіў уключыць у свой конкурсны сэт адну песьню з рэпэртуару «Мясцовага часу», 20-годзьдзе якога сёлета і сьвяткавалі. Перамогу дастаў смаленскі гурт Deimos, ляўрэатамі сталіся магілёўскі «Водар Сусьвет», наваполацкая «Амальгама» і менскі S.D.M. У «Рок-Кола» ёсьць усе складнікі добрага фэсту: канцэпцыя, фанатычныя арганізатары, харызматычныя вядоўцы, лаяльная гарадзкая адміністрацыя. Вучыся, сталіца!

## ЗДЫМКІ ГОДУ




АРЦЁМ ЛЯВА

**Канцэрт «N.R.M.» на хутары, у закансьпіраваных умовах.**

# Закон выпадковасьці

Ніякія папраўкі ў Канстытуцыі не гарантуюць, што аднойчы нейкі орган не адмовіцца служыць свайму гаспадару. Піша **Віталь Тарас**.

## Сонцаварот

Пры канцы году засьпяшаліся на той сьвет дыктатары. Піначэт, Туркмэнбашы… Зразумела, два — гэта яшчэ не тэндэнцыя. Гэта ясна нават герою анэкдота пра чукчу і аленяў.

Але ёсьць яшчэ шэраг цікавых супадзеньняў. Ніязаў памёр 21 сьнежня — адразу пасьля свайго дня нараджэньня, у дзень нараджэньня Сталіна. 20 сьнежня ў Беларусі й Расеі дагэтуль адзначаецца як Дзень чэкіста. 19 сьнежня нарадзіўся Брэжнеў, 100-годзьдзе якога сёлета шырока адзначалася беларускай і расейскай грамадзкасьцю.

А ўжо 22 сьнежня, як вядома з астраноміі, — самы кароткі дзень у годзе, Сонцаварот, пасьля якога наступае Раство Хрыстова, Каляды.

Можна ўсё гэта назваць гульнёй у пэрліны. Выпадковыя супадзеньні можна знайсьці колькі і ў чым заўгодна. Але парадокс, ці наадварот — закон жыцьця палягае на тым, што выпадковасьці ёсьць часткаю сыстэмы. (Як той казаў — у кожным шаленстве ёсьць свая сыстэма). Кожны чалавек з уласнага досьведу ведае, што ў жыцьці можа тыднямі нічога не адбывацца, а потым наступаюць дні, калі самыя розныя падзеі сыплюцца адна за адной.

Вось прыклад, добра зразумелы журналістам: сёлета 28 лістапада адначасова адбываліся саміт кіраўнікоў дзяржаваў СНД, саміт NATO і візыт Папы ў Турэччыну. Кожная з гэтых падзеяў паасобку магла стаць цэнтральнай тэмай дня для мэдыяў. І нават саміт у Менску, ад якога нічога не чакалі, завершыўся скандалам. Для большасьці людзей у сьвеце тыя падзеі маглі нічога асаблівага ня значыць (калі не лічыць каталікоў і мусульманаў, для якіх візыт Папы ў Стамбул усё-ткі ня быў ардынарнай паездкай пантыфіка). Кожным сам для сябе вызначае, якія падзеі лічыць важнымі, а якія — не. Але незалежна ад таго, ці багатая біяграфія ў чалавека, ці яна бедная на падзеі і здарэньні, агульнае для іх тое, што яны не разьмяркоўваюцца раўнамерна.

Нобэлеўскі ляўрэат, хімік і філёзаф Ільля Прыгожын знайшоў гэтаму тлумачэньне. (Дарэчы, вось задачка для роздуму: Прыгожын — валёнскі навуковец або флямандзкі ці бэльгійскі навуковец-габрэй расейскага паходжаньня?) Вывучаючы тэрмадынаміку адкрытых нераўнаважных сыстэмаў (да якіх належаць большасьць сыстэмаў у сьвеце — ад газаў, якія пры награваньні пашыраюцца, да біялягічных папуляцыяў і грамадзтваў), навуковец прыйшоў ды высновы, што ўсе гэтыя сыстэмы нестабільныя. Бо заўсёды прысутнічаюць флюктуацыі — выпадковыя адхіленьні ад сярэдняга значэньня фізычных велічыняў. І яны будуць заўсёды. Нават калі тэмпэратура сусьвету ўпадзе да абсалютнага нуля, знойдзецца пара-тройка звар'яцелых часьцінак (атамаў альбо электронаў), якія будуць рухацца хаатычна, то бок непрадказальна. І менавіта ў хаосе, паводле тэорыі Прыгожына, любая сыстэма становіцца пасьлядоўнай і стабільнай. Прычым, як у мікрасьвеце, на ўзроўні малекулаў, гэтак і ў сьвеце галяктык. З гледзішча гэтай тэорыі сьмерць дыктатара — усяго толькі дробная флюктуацыя ў маштабах сусьвету.

## І пажыцьцёвыя паміраюць

Зразумела, гэтага не патлумачыш дыктатарам, якія жыцьцё бачаць як пасьлядоўнае нанізваньне перамог над ворагамі на стрыжань уласных інтарэсаў. Той жа Туркменбашы быў некалі нікому не вядомым бязбацькавічам. Стаў уладаром Туркмэністану, чалавекам-сонцам, помнікі якому з чыстага золата паставілі пры жыцьці. Іншая справа, ці надоўга застануцца гэтыя помнікі? Ці не пераплавяць іх для розных патрэбаў? Ці застанецца імя Ніязава ў гісторыі гадоў на дзесяць? А калі застанецца, дык што будуць распавядаць пра яго падручнікі? Магчыма, па-ранейшаму будуць славіць яго імя, раўнаючы з Богам. Магчыма — будуць ганіць. Магчыма, не ўспомняць ані словам. Ніхто гэтага зараз дакладна прадказаць ня возьмецца. І ў гэтым — таксама спадчына ўсходняга дэспата, які замкнуў усе мэханізмы дзяржаўнага, і нават у многім прыватнага жыцьця сваіх падданых на сабе.

Праўда, самога Ніязава гэта ўжо ня тычыцца. Цяпер гэта не ягоная, так бы мовіць, праблема. Ён пражыў сваё жыцьцё так, як яму хацелася, наеўшыся салодкай улады поўнай лыжкай. Раскоша і занадта тлустая ежа спарадзілі павышаны ўзровень халестырыну ў крыві і сардэчную недастатковасьць. Жыў як Бог. Памёр як звычайны чалавек, як мільёны людзей да яго і пасьля яго. І гэта — галоўная непрыемнасьць, якая бянтэжыць дыктатараў усіх часоў і народаў.

Яны стараюцца аб гэтым ня думаць. Кіраўнік Беларусі, які першым выказаў спачуваньне туркмэнскаму народу ў сувязі са сьмерцю Ніязава, не паехаў на ягонае пахаваньне. Відаць, невясёлыя думкі наводзяць хаўтуры «пажыцьцёвага прэзыдэнта», які пражыў на сваёй «вечнай» пасадзе ўсяго сем гадоў. А яшчэ больш непрыемным падалося, што пахаваньне пакажуць усяму сьвету, і твайму народу таксама. А раптам ён убачыць і зразумее, што ніякая ўлада не бывае бязьмежнай і бясконцай, нават калі ты «ўсенароднаабраны», і ў цябе ўсё пад кантролем? Ніякія папраўкі ў Канстытуцыі не гарантуюць, што аднойчы нейкі жыцьцёва важны орган — ныркі, вантробы, сэрца альбо мозг — не адмовяцца служыць свайму гаспадару, першай асобе ў дзяржаве, наколькі б таленавітай гэтая асоба ні была. Сама думка аб непазьбежнасці сьмерці падаецца гэтай асобе кашчуннай,

здрадніцкай, няправільнай у сваёй аснове.

Дарэчы, гэта праблема зусім ня толькі «першых асобаў». Сярод маіх знаёмых сталых гадоў ёсьць вельмі адукаваныя і разумныя людзі, якія болей за ўсё на сьвеце баяцца размоваў пра сьмерць. Дакладней — пра сваю ўласную сьмерць, якая, у адрозьненьне ад сьмерці дыктатараў, экс-прэзыдэнтаў ці нават калегаў і сваякоў, выклікае пачуцьцё першабытнага жаху. Гэта спараджэньне таго самага атэізму, які з наваяўленай падвойнай страсьцю прапагандуе цяпер акадэмік Рубінаў ды іншыя дзяржаўныя ідэолягі. Атэізм як нявер'е ў чалавека і свабоду волі.

Старыя савецкія акадэмікі, як і іхні маладзейшы патрон, ня могуць не адчуваць, што чалавечы дух, маральныя каштоўнасьці ня так проста падпарадкаваць ідэалёгіі, і тым больш — начальству, якое спавядае толькі адзін прынцып: «Я — начальнік, ты — дурань». Яны, у тым ліку начальнікі сярэдняй рукі, адчуваюць, што пытаньні сьмерці вырашаюцца не ў высокіх кабінэтах, а недзе ў іншым месцы, недзе вышэй. Толькі яны баяцца ў гэтым прызнацца. Таму нават царква, таксама моцна сапсаваная дзесяцігодзьдзямі набліжанасьці й залежнасьці ад улады сьвецкай рознымі прывілеямі, імкнецца бліжэй стаць да людзей, чым улада адміністрацыйная. І таму яна ўспрымае царкву як канкурэнта.

Ці выпадкова сустрэча найвысокага кіраўніцтва з Сынодам Праваслаўнае царквы ў Беларусі і «ўшчуваньне» Філарэта адбылася наступным днём пасьля сьмерці Туркмэнбашы? Мабыць, гэтая сустрэча была даўно заплянаваная? Але, як мы памятаем, выпадковасьць — усяго толькі праява заканамернасьці.

## У чым соль?

Зразумела, сьмерць дыктатара можа служыць слабым суцяшэньнем для сваякоў рэпрэсаваных і ўсіх пакрыўджаных уладаю.

Сама па сабе сьмерць ня ёсьць пакараньнем ці актам адплаты. Пры нармальнай хадзе гісторыі дыктатары сыходзяць самі, і помста прыходзіць да іх не зь нябёсаў, але ад жывых людзей, шляхам правасудзьдзя. Так здарылася зь Піначэтам, так здарылася сёлета раней з Мілошавічам. Так можа здарыцца хутка з Хусэйнам.

Тут гаворка не аб тым, наколькі справядлівым быў суд над іракскім дыктарам і ці можа быць маральнае апраўданьне сьмяротнаму пакараньню ў цывілізаваным сьвеце. Гэта, зноў жа, праблема, якая павінна найбольш хваляваць саміх дыктатараў і іхных сваякоў.

Для людзей, якія жылі альбо працягваюць жыць пры дыктатуры, значна важней, што будзе далей зь імі самімі, з грамадзтвам у цэлым.

Расейскі прыдворны блазан Жырыноўскі, захлынаючыся сьлінай, крычаў з экранаў тэлебачаньня, што Туркмэнбашы быў ідэальным уладаром для Сярэдняй Азіі, што іншы туркмэнскаму народу і не патрэбны. «Туркмэнскаму» — чытай беларускаму, расейскаму, любому іншаму...

Але нават калі пагадзіцца з жырыноўскімі, быццам усялякага роду «башы» несьлі й нясуць свайму народу адно толькі дабро, што яны па-бацькоўску клапоцяцца аб ім, неразумным, дык і тады застанецца адно надзвычай важнае пытаньне. А што далей? Вось пабудаваў Ніязаў ідэальную дэспатычную дзяржаву, горад Сонца на чале з сабой любімым. І што? Чаму сёньня трасе многіх начальнікаў ня толькі ў Ашгабадзе, але ў Маскве і нават Кіеве? І чаму дзе-небудзь на Лёнданскай ці Такійскай таварна-сыравіннай біржах ня ўсе адчуваюць сябе спакойна?

Ды таму, што так званая «стабільнасьць» і «ўсеагульнае працьвітаньне», пра якія ўвесь час цьвердзяць дзяржаўныя ідэолягі постсавецкіх дыктатураў, усяго толькі адваротны бок нестабільнасьці і няпэўнасьці, якія нясуць народам аўтарытарныя рэжымы.

Вось чаму так нэрвуецца расейская палітычная (дый ня толькі палітычная) эліта з набліжэньнем прэзыдэнцкіх выбараў. Ва ўмовах амаль поўнай адсутнасьці дэмакратыі, прыкрытай, як фігавым лістком, дэкарацыямі Думы і Грамадзкай палаты, асоба, у руках якой засяроджаная гіганцкая і практычна бескантрольная ўлада, становіцца вырашальным фактарам для ўсіх падначаленых, для ўсяе палітычнае канструкцыі.

Справа ня ў тым, што ўсе дыктатары ўсіх краінаў, якія прыгожыя словы яны б ні казалі, пры першай магчымасьці набіваюць кішэні грашыма і адкрываюць рахункі ў швайцарскіх банках ці ў філіялах на Кайманавых выспах. Усе людзі, асабліва калі яны выбіваюцца зь нізоў, паводзяць сябе ва ўладзе прыкладна аднолькава. Справа ня ў тым, што яны затыкаюць рот усім сваім крытыкам. Урэшце, бескантрольная ўлада ні з кім ня будзе цырымоніцца. З чаго б?

Справа ў тым, што дыктатура адбірае ў людзей будучыню і права самім вырашаць свой лёс. І калі сыходзіць дыктатар, для іх рушыцца сьвет. Яны рэальна ня ведаюць, што рабіць, паводле якіх правілаў іх цяпер прымусяць гуляць, якому богу служыць. Таму яны адразу, загадзя гатовыя аддаць права вырашаць за іх — а значыць, сваю свабоду, іншым. Самы яскравы прыклад апошніх дзесяцігодзьдзяў — тое, што адбылося пасьля распаду СССР.

Толькі народы краінаў Балтыі змаглі рэальна скарыстацца шанцам, які дала ім гісторыя ў 1991-ым. Астатнія народы СССР палічылі за лепшае заставацца там, дзе яны былі на момант сьмерці Брэжнева. І з настальгічным надрывам успамінаць пра танную каўбасу. Нездарма адзін палітоляг назваў 100-годзьдзе з дня нараджэньня генсека 100-годзьзем бутэрброда з каўбасой.

Усе правы і свабоды мы самі зь лёгкасьцю і без шкадаваньня саступілі ў абмен на стабільныя пэнсіі і зарплаты. А дзе-нідзе — на бясплатныя газ і соль.

Магчыма, неабходнасьць плаціць за газ сапраўдную цану ў новым годзе дапаможа многім людзям у Беларусі ўпершыню задумацца і аб цане дыктатуры, і аб цане сваёй маўклівай зь ёй згоды.

У Беларусі, як і ў Расеі, трэба жыць доўга…

# Паміж шчырасьцю і разьлікам

Як некалі за Саветамі пісьменьнікі, цяпер спартоўцы плацяць уладам ляяльнасьцю за матэрыяльныя выгоды. Піша **Зьміцер Панкавец**.

За апошняе дзесяцігодзьдзе сусьветны футбол у Беларусі стаў даступным абсалютна для ўсіх катэгорыяў заўзятараў. Цяпер ня трэба прыслухоўвацца да кароткіх хваляў, каб пачуць рэпартаж пра нейкі там матч. Варта толькі лёгка, зручней уладкавацца на канапе і ўключыць тэлевізар: прыгожая карцінка ў прыгожай «упакоўцы» табе забясьпечана. Нават Беларускае тэлебачаньне ўжо ня першы год трансьлюе групавы турнір Лігі чэмпіёнаў і першынство Англіі. Мала гэтага, можна ўсталяваць спадарожнікавую антэну, і ўжо цэлы тузін каналаў гатовы прадставіць табе асалоду ад гульні зорак найпершай велічыні эўрапейскіх чэмпіянатаў.

Любы шараговы заўзятар цяпер можа раскласьці па палічках гульнявую расстаноўку на матч «Чэлсі» з «Барсэлёнай». Сусьветны футбол перастаў быць дэлікатэсам, якім быў у савецкі час, калі паглядзець на зорак узроўню Кройфа ці Бэкенбаўэра можна было раз на два гады — на чэмпіянаце сьвету ці Эўропы. Таму і чакалі тых чэмпіянатаў з куды большым інтарэсам і хваляваньнем, чым зараз.

Сёлетні нямецкі мундыяль рызыкаваў стаць самым нецікавым за ўсю гісторыю першынстваў сьвету. Ён ня даў сусьветнаму футболу зорак-ідалаў. Ён абышоўся без сэнсацыяў, у чым значна прайграў папярэдняму. Самі ж футбалісты падаваліся стомленымі.

Футбол робіцца ўсё менш падобным да спорту і ўсё больш — да бізнэсу. Прыход вялікіх грошай у спорт, а ў футбол у прыватнасьці, быў непазьбежным. У сьвеце занадта шмат людзей, гатовых за назіраньне сапраўдных спартовых жарсьцяў плаціць вялікія грошы. Аднак грошы ў нейкай ступені забіваюць футбол. Любая зорка сёньня перш падумае, ці варта класьціся ў падкаце, а пасьля паўгоду лячыць траўму і атрымліваць невялікія грошы, ці лепш застацца здаровым, не ідучы на кантакт з супернікам.

Футбол робіцца ўсё больш падобным да спэктаклю, усё болей у ім прадказальнасьці і прагматызму, усё меней месца там застаецца для спантаннасьці і шчырасьці. Гэта ўжо ня спорт, а шоў-бізнэс, калі некаторыя футбалісты робяць на сваім імені мільёны, як сэкс-ікона Дэвід Бэкхэм, не дасягнуўшы нічога звышнатуральнага ў гульнявой кар'еры. Можна нават паглядзець на беларуса Аляксандра Глеба, які перамог у «нашаніўскім» апытаньні на званьне найлепшага спартоўца году. Прыватныя моманты жыцьця Глеба кшталту чуткі пра заручэньне футбаліста з салісткай гурту «Топлес» пачынаюць цікавіць заўзятараў больш, чым уласна ягоная гульня.

Чэмпіянат сьвету выратаваў Зынэдын Зыдан. Учынак Зыдана ў фінальным матчы, калі ён заступіўся за гонар сваёй сястры, маці і ўсяго арабскага сьвету, ударыўшы Матэрацы, сапраўды ўражвае. Бо ён вылучаецца з агульнай футбольнай шэрасьці апошніх гадоў.

Бэрбэр Зыдан у гэтай сытуацыі павёў сябе ў значнай ступені больш па-эўрапейску, чым эўрапеец Матэрацы.

Паводле ўсіх футбольных правілаў, Зыдан быў правапарушальнікам і справядліва атрымаў чырвоную картку. Паводле правілаў маралі і этыкі, Зыдан застаўся пераможцам. Гэта даказвае і тое, што пасьля славутага «баданьня» ніхто так і не асьмеліўся «кінуць камень» у бок Зыдана.

Зыдан мог сьцярпець, дачакацца сэрыі пэнальці, і, хто ведае, стаць двухразовым чэмпіёнам сьвету, атрымаць «Залаты мяч»-2006, але тады б гэта ня быў вялікі футбаліст. Таму зусім ня дзіўна, што адразу па сканчэньні чэмпіянату экспэрты пачалі гаварыць, што побач з Пэле і Марадонам зьявілася яшчэ адна футбольная мэга-зорка — Зыдан.

Што яшчэ запомнілася са спартовых падзеяў году? Трагедыя фрыстайліста Зьмітра Рака. Беларус няўдала выканаў скачок і зачапіў каленам падбародзьдзе. Цяпер Рак у коме, і немаведама калі ён зь яе выйдзе. Нешта падобнае ў любы момант можа адбыцца амаль з кожным спартоўцам. Грошы і слава дасягаюцца вялікім коштам. Згадваецца, як летась, проста на менскай лядовай пляцоўцы, ня вытрымала сэрца хакеіста Жаўтка.

Як некалі за Саветамі пісьменьнікі, цяпер спартоўцы плацяць уладам ляяльнасьцю за матэрыяльныя выгоды. Рэдка хто з спартовага асяродзьдзя наважыцца выказацца па актуальных пытаньнях штодзённасьці, а тым больш закранаць тэму палітыкі.

Многія віды спорту сталі ў Беларусі непасрэдна палітычнымі, бо старшынства ў фэдэрацыях займаюць не спэцыялісты, а чыноўнікі. Асабліва цікавая сытуацыя з хакеем. Зборную краіны па «прэзыдэнцкім» відзе спорту ня першы год трэніруюць заакіянскія «коўчы». Сёлета на месца канадца Хэнлана, які дамогся найлепшага беларускага выніку на чэмпіянаце сьвету ў гісторыі — шостага месца, прыйшоў амэрыканец Фрэйзэр. Разам з замежнымі спэцыялістамі ў гульцоў непазьбежна пачынаецца «ломка» стэрэатыпаў.

Незаўважна з Хэнланам, а цяпер з Фрэйзэрам у Беларусь прыходзяць заходнія прынцыпы, заснаваныя на павазе да асобы. Як бачым, такі падыход дае плён. Да добрага хутка звыкаеш.

**Зьміцер Панкавец**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

### Хто найлепшы спартовец 2006 году?

| | |
|---|---|
| Аляксандра Герасіменя (плаваньне) | 8 (6.2%) |
| Кацярына Карстэн (акадэмічнае веславаньне) | 6 (4.7%) |
| Іван Ціхан (лёгкая атлетыка) | 12 (9.3%) |
| Алеся Турава (лёгкая атлетыка) | 1 (0.8%) |
| Натальля Цылінская (вэлятрэк) | 4 (3.1%) |
| Максім Мірны (тэніс) | 13 (10.1%) |
| Аляксандар Глеб (футбол) | 35 (27.1%) |
| Андрэй Мезін (хакей) | 13 (10.1%) |
| Уладзімер Самсонаў (настольны тэніс) | 15 (11.6%) |
| Натальля Харанэка (лёгкая атлетыка) | 0 |
| Вольга Назарава (біятлён) | 3 (2.3%) |
| Дзьмітры Дашчынскі (фрыстайл) | 19 (14.7%) |

Усяго прагаласавала: 129

## ЗДЫМКІ ГОДУ



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Зьміцер Дашкевіч у часе вынясеньня прысуду. 1 лістапада.**



WWW.SVABODA.ORG

**Пад ціскам Эўрасаюзу пры канцы году ўлады выпусьцілі некалькі палітвязьняў. Сяргей Скрабец па вызваленьні з турмы. 16 лістапада.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Лідэра жодзінскай моладзі Паўла Красоўскага зьвінавацілі ў арганізацыі віцебскіх тэрактаў, забойствах і згвалтаваньнях. Аднак хлопец не зламіўся, і яго праз тыдзень выпусьцілі. Фота з прэс-канфэрэнцыі 17 кастрычніка.**

# Павал Севярынец атрымаў прэмію Адамовіча

30 сьнежня Паўлу споўніцца трыццаць гадоў. Акурат пад гэтую дату Рада Беларускага ПЭН-Цэнтру пастанавіла ўганараваць Паўла Севярынца літаратурнай прэміяй імя Алеся Адамовіча. Палітвязень адзначаны за цыкль «Лісты зь лесу», які вось ужо паўтара году друкуе «Наша Ніва».

Павал Севярынец ад жніўня 2005 г. адбывае высылку ў вёсцы Малое Сітна на Полаччыне. Знаходзячыся далёка ад эпіцэнтру грамадзка-палітычнага жыцьця, у адрыве ад крыніцаў інфармацыі Павал на прыкладзе жыхароў тых мясьцінаў адлюстроўвае асноўныя тэндэнцыі ў жыцьці ўсяго нашага грамадзтва. «Лісты Севярынца з Малога Сітна — гэта яскравы ўзор сучаснае жыцьцёвае публіцыстыкі», — адзначае сябар Рады ПЭН-Цэнтру Ўладзімер Арлоў.

Прэмію імя Адамовіча ўмоўна можна назваць «Публіцыст году». Яе ўжо атрымлівалі Ігар Гермянчук, Ганна Соўсь.

# Павіншуй палітвязьня са сьвятамі

Яму цяпер цяжка. Твой ліст можа выратаваць яго.

211300 Віцебскі раён, пас. Віцьба, ВК №3, 1-шы атрад, **Казуліну Аляксандру**.

211656 Віцебская вобласьць, Полацкі раён, п.а. Малое Сітна, вул. Лясная, 11, да запатрабаваньня, **Севярынцу Паўлу**.

213004 Магілёўская вобласьць, г. Шклоў, ВК-17, **Дашкевічу Зьмітру**.

212002 г. Магілёў, вул. Пушкіна, 65, ПУОТ №43, пакой 206, **Фінькевічу Артуру**.

222831 Пухавіцкі раён, вёска Блонь, **Статкевічу Мікалаю**.

211791 Віцебская вобласьць, Глыбокае-1, ВК-13, атрад №7, **Круку Івану**.

230023 г. Горадня, вул. Кірава, 1, турма №1, СІЗА, **Аўтуховічу Мікалаю**.

246035 г. Гомель, вул. Антошкіна, 3, ВК-4, **Садоўскай Кацярыне**.



# Грошы з «Пагоняй» чакаюць свайго часу

Рэжым рана ці позна зьменіцца. А незалежнасьць будзе назаўсёды. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Банкір на ўсе палітычныя калізіі глядзіць са сваёй званіцы. На днях мне давялося гутарыць са Станіславам Багданкевічам. Былы кіраўнік Нацбанку лічыць: Расея наладзіла нафтагазавы шантаж з мэтай дамагчыся ўвядзеньня адзінага рубля. Ва усякім разе, гэта адна з самых жаданых мэтаў.

«Улады сёньня цытуюць мяне без спасылкі», — жартуе прафэсар Багданкевіч.

А гаворка вось пра што. У 2003 г., калі Масква ўпершыню рубам паставіла пытаньне адзінай валюты, Аляксандар Лукашэнка раптам згадаў пра інтэлект сваіх палітычных апанэнтаў.

На адной нарадзе прагучала: ёсьць жа і ў апазыцыі, маўляў, пара-тройка разумных галоваў. Вазьміце таго самага Багданкевіча...

Былы старшыня ўправы Нацбанку кажа: «Гэта быў хітры ход. Афіцыйны




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Акадэмік Анатоль Міхайлаў на юбілейнай вечарыне «Нашай Нівы» ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце. Вільня, 16 лістапада.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Рыгор Барадулін быў вылучаны на Нобэлеўскую прэмію па літаратуры.**



**Настаўнік гісторыі і дэпутат гарсавету Алесь Чыгір з Бабруйску стаў адным з соцень людзей, якія страцілі працу праз палітычныя погляды. Для яго, як шматдзетнага бацькі, гэта было асабліва балюча.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Кацярына Даманькова — супэрмадэль сьвету.**

# Ідзе вайна гандлёвая, сьвяшчэнная вайна



Год прайшоў пад знакам бясконцых гандлёвых войнаў за цукар, за тарыфы, за цукеркі, за акцызныя кампакты, каву і абутак. А дэпартамэнт Праляскоўскага калупаецца ў носе. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

кіраўнік загадзя ведаў маё скептычнае стаўленьне да пераходу на расейскі рубель... Дні за тры да той нарады мяне разам з шэрагам незалежных экспэртаў ужо запрашалі на дыскусію да Пракаповіча».

Так што ўлада, калі прыпячэ, умее скарыстацца і апальнымі мазгамі. Тады паказалі Пуціну: глядзі, што да адзінай валюты, дык у нас поўнае супадзеньне думак улады і апазыцыі! Таму адкладзем той праект да лепшых часоў (а між тым, ужо ўсе тэрміны былі расьпісаныя: з 1 ліпеня пускаем у абарачэньне безнаяўны расейскі рубель і г.д.).

Менавіта тады Багданкевіч у ліку іншага падкінуў і дыпляматычную тэзу, зручную для перамоваў з Расеяй. Маўляў, адзіная валюта мусіць быць хіба вянцом усяго працэсу. Нельга будаваць дом з даху.

На практыцы гэта азначала, што пытаньне адкладаецца на сьвятое ніколі. Бо ўжо тады было відавочна: улагодзіць, гарманізаваць увесь комплекс дачыненьняў у межах бутафорскай «саюзнай дзяржавы» бакі ня змогуць апрыёры, бо кожны цягне коўдру на сябе.

Потым афарызм пра «вянец» раз-пораз пачалі ўжываць беларускія начальнікі, калі Масква чарговы раз прыціскала ў пытаньні аб’яднаньня грашовых сыстэмаў.

Журналісты неяк спыталіся ў Багданкевіча: «А ці разумееце вы, што тым разам сталі толькі картай у палітычнай гульні?»

Сапраўды, камусьці з апазыцыянераў зручней фігураваць у белых пальчатках. Ніякіх кампрамісаў з рэжымам!

Багданкевіч жа адказаў: «Калі хоць трохі паспрыяў тады беларускаму суверэнітэту, дык гэта ўжо апраўдана. Рэжым рана ці позна зьменіцца. А незалежнасьць будзе назаўсёды».

Дарэчы, цалкам імаверна, што і па сёньня ў сховішчы ляжаць грошы з «Пагоняй», якія старшыня ўправы Нацбанку Багданкевіч замовіў у Нямеччыне за часамі Кебіча. Меркавалася, што нармалёвая валюта прыдзе на зьмену «зайчыкам», калі ўтаймуецца інфляцыя.

Але тут пачалася прэзыдэнцкая эра, і ў ліку іншага скасавалі сымболіку. А за тыя мяхі купюраў з «Пагоняю» немцам заплацілі пад 20 мільёнаў даляраў. Шкада нішчыць!

«Чакаюць свайго часу!» — сьмяецца Багданкевіч.

Краіне лёсам наканавана змагацца за замежныя рынкі і даваць у табло ўсім, хто лезе на наш. Гераічныя прыклады мінулага маглі б уздымаць кураж у рэкрутаў новых гандлёвых войнаў, ня кажучы ўжо пра патрыятычна-выхаваўчую функцыю.

Чаму, напрыклад, мы гэтак няздарна прафукваем памяць аб пераможнай газавай вайне студзеня 2004-га, калі краіна, аб’яднаўшыся вакол любімага Рыгоравіча, адбіла націск «Газпрому»?

Уявіце, што сёньня, падчас перамоваў зь Сямашкам, Мілер пабачыў бы на грудзях у беларуса ордэн «За абарону Белтрансгазу» другой ступені.

Газпромаўскі барон трохі афанарэў бы, разумеючы, што перад ім не салага, а бывалы ваяка, які зьнюхаў не адну дарожку пораху... ой, прабачце, — газу.

Натуральна, трэба замуціць рэспубліканскі Саюз вэтэранаў газавых войнаў («газаванцы»). Наладзіць рэгулярныя тусачы з моладзьдзю, якая з захапленьнем слухацьме іхныя прагоны, як дзяды тых «газаванцаў» з крыкам «За бацьку» мужна пераключаліся з НТВ на адстойны БТ, каб толькі ня чуць варожых галасоў. Не забыцца шчэ пра конкурс песьняў вэтэранаў Першай газавай вайны. І, натуральна, — Дзень «газаванца». Газаванцы, як былыя памежнікі або жаўнеры ПДВ, маглі б зьбірацца на Чэлюскінцах купацца ў фантанах, жлукціць гарэлку, барукацца з АМАПам, адным словам — кансалідаваць сваё брацтва.

Цяпер пра музы. Цэху чаргінцоўскіх пісьменьнікаў неадкладна засесьці за сэрыю патрыятычна-газавых твораў — «Яны змагаліся за Белтрансгаз», «Бітва за вэнтыль», «Трубнае брацтва», «Успаміны газавага выведніка»...

На «Беларусьфільме» можа злабаць нейкі фільмец. Натуральна, атрымаецца, як заўсёды, лажа, аднак за кошт прымусовых разнарадак для ўсіх школьнікаў можна будзе нешта часткова кампэнсаваць. Агульна кажучы, тэма працы зь дзецьмі вельмі важная. Можна прымусіць усіх выхавацелек дзіцячых садкоў пісаць лісты на газавы фронт кшталту «Дарагі дзядзя Сямашка, мы ўсёй групай зрабілі для цябе рагатку. Далбані зь яе Грэфу ў лоб».

Калі б мы запусьцілі гэткія мулькі два гады таму, сёньня ў грамадзтве была б абсалютна іншая, здаравейшая атмасфэра. Ня плёткі пра тое, што зайчыку — інфляцыйны гамон, панавалі б у вагонах прыгарадных электрычак. Наадварот, пачуўшы аб новых закідонах «Газпрому», бацька сямейства падкручваў бы сівы вус: «Вой, не пайшоў маскалю ўрок у 2004-ым». Тынэйджэры, слухачы старых, кідалі б Counter-strike і FIFA’2007, запісваліся б у атрады, якія зьбіраюць габлюшку і капаюць торф. Жонкі і нявесткі замянялі б мужчын на аўтарынку ў Малінаўцы.

І галоўнае, сп.Праляскоўскі, не сядзець на ляўрах! Я фанарэю ад адной думкі пра тое, які пантэон славы мы можам забацаць героям апошняй вайны за расейскі кандытарскі рынак.

# 2007

## Студзень

**1** — Новы год.

**6** — Сьвята Трох Каралёў у каталікоў.

**7** — Нараджэньне Хрыстова ў праваслаўных.

**17** — 275 гадоў таму (1732) нарадзіўся Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, апошні кароль Рэчы Паспалітай.

**18** — 125 гадоў з дня нараджэньня ангельскага пісьменьніка Алана Аляксандра Мілна, аўтара аповесьцяў пра Віні–Пуха (1882—1956).

**19** — Вадохрышча ў праваслаўных.

**20** — Новы (1428–мы) год у мусульманаў.

**23** — 175 гадоў таму (1832) нарадзіўся францускі мастак–імпрэсіяніст Эдуард Манэ.

**25** — 125 гадоў з дня нараджэньня ангельскай пісьменьніцы Вірджыніі Ўульф (1882 — 1941).

**27** — 175 гадоў таму (1832) нарадзіўся ангельскі дзіцячы пісьменьнік Льюіс Кэрал.

## Люты

**2** — Грамніцы ў каталікоў.

**2** — 125 гадоў з дня нараджэньня ірляндзкага пісьменьніка Джэймса Джойса (1882—1941).

**11** — 200 гадоў таму (1807) нарадзіўся Напалеон Орда, мастак, пэдагог, пісьменьнік, кампазытар, удзельнік паўстаньня 1830—1831 г.

**14** — Дзень Сьвятога Валянціна.

**14** — 100 гадоў з дня нараджэньня Алеся Звонака, паэта (1907—1996).

**15** — Грамніцы ў праваслаўных.

**16** — 250 гадоў таму (1757) нарадзіўся Юліян Урсын Нямцэвіч, пісьменьнік, гісторык, ад'ютант і сакратар Тадэвуша Касьцюшкі.

**21** — Папяльцовая серада ў каталікоў.

**25** — 50 гадоў з дня нараджэньня паэта Алеся Пісьмянкова (1957—2004).

## Сакавік

**4** — 225 гадоў таму (1782) нарадзіўся Казімір Ельскі, скульптар, першы прафэсар скульптуры ў Беларусі.

**4** — Пурым у габрэяў.

**15** — 75 гадоў з дня нараджэньня польскага кінарэжысэра Ежы Хофмана



**12** — Сьвятыя Пятро і Павал у праваслаўных.

**15** — Дзень Грунвальдзкае бітвы.

**27** — Дзень Незалежнасьці ў гонар прыняцьця Дэкларацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце.

## Жнівень

**6** — 50 гадоў таму (1957) нарадзіўся рэжысэр Мікалай Пінігін.

**7** — 75 гадоў з дня нараджэньня Адама Мальдзіса, гісторыка культуры (1932).

**15** — Прачыстая ў каталікоў.

**15** — 625 гадоў таму (1382) памёр Кейстут, вялікі князь літоўскі.

**19** — Яблычны Спас у праваслаўных.

**28** — Прачыстая ў праваслаўных.

**29** — 375 гадоў таму нарадзіўся ангельскі філёзаф Джон Лок.

## Верасень

**8** — Дзень беларускай вайсковай славы.

**13** — пачатак Рамазану ў мусульманаў.

**17** — 100 гадоў таму нарадзіўся паэт і перакладчык Сяргей Дзяргай (1907—1980).

**23** — Рош Ашонэ (Новы год) у габрэяў.

## Кастрычнік

**7** — 75 гадоў з дня нараджэньня пісьменьніка Івана Пташнікава (1932).

**10** — 50 гадоў з дня нараджэньня паэта Леаніда Дранька–Майсюка (1957).

**13** — заканчэньне Рамазану ў мусульманаў.

**14** — Пакроў у праваслаўных.

**16** — 50 гадоў таму (1957) нарадзіўся Сяржук Сокалаў–Воюш, беларускі бард, журналіст, пісьменьнік.

**27** — 225 гадоў таму (1782) нарадзіўся Ніколя Паганіні.

## Лістапад

**2** — Дзяды.

**3** — 125 гадоў таму (1882) нарадзіўся Якуб Колас.

**14** — 100 гадоў з дня нараджэньня Астрыд Ліндгрэн, швэдзкай дзіцячай пісьменьніцы (1907—2002).

**24** — 375 гадоў таму (1632) нарадзіўся

(1932).

**22** — 175 гадоў з дня сьмерці нямецкага пісьменьніка Ёгана Вольфганга Гётэ.

**25** — Дзень Волі.

**25** — Зьвеставаньне ў каталікоў.

## Красавік

**1** — Вербная нядзеля ў праваслаўных і каталікоў.

**4** — 450 гадоў таму (1557) нарадзіўся Леў Сапега, дзяржаўны, палітычны, грамадзкі і ваенны дзеяч ВКЛ, дыплямат і мысьляр.

**7** — Дабравешчаньне ў праваслаўных.

**8** — Вялікдзень у праваслаўных, каталікоў і пратэстантаў.

**15** — 555 гадоў таму (1452) нарадзіўся Леанарда да Вінчы.

**17** — Радуніца.

**26** — Дзень Чарнобыльскай трагедыі.

## Травень

**1** — Дзень працы.

**3** — Міжнародны Дзень свабоды друку.

**9** — Дзень Перамогі над нацызмам.

**15** — 125 гадоў таму (1882) нарадзіўся Ўладзіслаў Галубок, драматург, рэжысэр, актор, першы народны артыст Беларусі.

**17** — Ушэсьце ў праваслаўных і каталікоў.

**27** — Сёмуха ў праваслаўных і каталікоў.

## Чэрвень

**23** — Купальле.

**24** — Сьвяты Ян у каталікоў.

**29** — Сьвятыя Пятро і Павал у каталікоў.

## Ліпень

**7** — Іван у праваслаўных.

**7** — 125 гадоў з дня нараджэньня Янкі Купалы (1882—1942).

**11** — 75 год з дня нараджэньня Анатоля Анікейчыка (1932—1989), скульптара, пэдагога, народнага мастака Беларусі, аўтара помніка Купалу і фантана «Купалінкі» ў парку імя Янкі Купалы.

# Студзень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | **6** | **7** |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | **13** | **14** |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | **20** | **21** |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | **27** | **28** |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

# Люты

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | **3** | **4** |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | **10** | **11** |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | **17** | **18** |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | **24** | **25** |
| 26 | 27 | 28 | | | | |

# Сакавік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | **3** | **4** |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | **10** | **11** |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | **17** | **18** |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | **24** | **25** |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | **31** | |

# Красавік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | **1** |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | **7** | **8** |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | **14** | **15** |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | **21** | **22** |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | **28** | **29** |
| 30 | | | | | | |

# Травень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | **5** | **6** |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | **12** | **13** |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | **19** | **20** |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | **26** | **27** |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

# Чэрвень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | **2** | **3** |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | **9** | **10** |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | **16** | **17** |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | **23** | **24** |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | **30** | |

# Ліпень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | **1** |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | **7** | **8** |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | **14** | **15** |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | **21** | **22** |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | **28** | **29** |
| 30 | 31 | | | | | |

# Жнівень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | **4** | **5** |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **11** | **12** |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | **18** | **19** |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | **25** | **26** |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

# Верасень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | **1** | **2** |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | **8** | **9** |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | **15** | **16** |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | **22** | **23** |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | **29** | **30** |

# Кастрычнік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | **6** | **7** |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | **13** | **14** |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | **20** | **21** |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | **27** | **28** |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

# Лістапад

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | **3** | **4** |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | **10** | **11** |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | **17** | **18** |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | **24** | **25** |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

# Сьнежань

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | **1** | **2** |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | **8** | **9** |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | **15** | **16** |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | **22** | **23** |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | **29** | **30** |
| 31 | | | | | | |

нідэрляндзкі філёзаф Бэнэдыкт Сьпіноза.

**27** — Дзень Слуцкага збройнага чыну (1920).

## Сьнежань

**3** — 100 гадоў таму (1907) нарадзіўся Рыгор Крушына, першы беларус — сябар Міжнароднага ПЭН-цэнтру.

**10** — Міжнародны дзень правоў чалавека.

**20** — Курбан-байрам у мусульманаў.

**25** — Божае нараджэньне ў каталікоў і пратэстантаў.

## Юбілеі году

**2050** гадоў з дня нараджэньня старажытнарымскага паэта Публія Авідыя Назона (43 г. да н.э. — 18 г. н.э.).

**1282** — падасланымі забойцамі забіты вялікі князь літоўскі Тройдзень.

**1582** — увядзеньне папам Грыгор'ем XIII грыгарыянскага календара. У Італіі, Польшчы, Партугаліі і Гішпаніі за 4 кастрычніка гэтага году адразу ішло 15 кастрычніка.

**1882** — стварэньне нямецкім інжынэрам першага ў сьвеце тралейбуса і адкрыцьцё ў прадмесьці Бэрліна першай тралейбуснай лініі.

**1907** — створаная Першая беларуская трупа І.Буйніцкага.

**1932** — у Менску заснаваная Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі.

**1932** — створаны Саюз беларускіх пісьменьнікаў.

**1932** — увядзеньне ў СССР пашпартнай сыстэмы і абавязковай прапіскі па месцы жыхарства.

**1932** — у Менску пачала выдавацца газэта «Літаратура і мастацтва».

**1957** — зьяўленьне ў газэце «Літаратура і Мастацтва» артыкулу студэнта факультэту журналістыкі БДУ Барыса Сачанкі «Шанаваць родную мову». Першы публічны выступ супраць русіфікацыі ў савецкай Беларусі за дваццаць пяць гадоў.

**1957** — выйшаў першы нумар дзіцячага часопісу «Вясёлка».

**1957** — заснаваны Нацыянальны музэй гісторыі і культуры Беларусі (Менск).

# Архітэктура бяз комплексаў

Пры асьвятленьні разбудовы Менску СМІ, у тым ліку «Наша Ніва», спрашчаюць тэму і палітызуюць архітэктурныя пытаньні. Піша архітэктар **Ігар Байцоў**.

У «Нашай Ніве» і іншых выданьнях пэрыядычна зьяўляецца інфармацыя аб разбурэньні і скажэньні гістарычных пабудоў, праявах абыякавасьці да стану помнікаў, непавагі да нашай мінуўшчыны. Але чаму ўсё гэта адбываецца так рэгулярна?

Відавочна, таму, што павярхоўнасьць інфармацыі, даступнай большасьці беларусаў, не дазваляе ім авалодаць эстэтычна-культурнымі ўяўленьнямі, неабходнымі для ацэнкі стану і зьмяненьняў навакольнага асяродзьдзя як розумам, так і сэрцам. Гэта датычыць усяго асяродзьдзя, ня толькі юрыдычна прызнаных гісторыка-культурных каштоўнасьцяў. Яны ня маюць магчымасьці разабрацца — што добра і што дрэнна з таго, што іх атачае.

За многія вякі спробаў і памылак майстры дойлідства выпрацавалі правілы гарманічнага формаўтварэньня, якія забясьпечваюць посьпех у будаўніцтве, стварылі сыстэму адпаведных крытэраў, якія дапамагаюць паўнавартасна і шматбакова ацаніць праекты і пабудовы. Але большасьць насельніцтва з гэтай «сыстэмай каардынатаў» практычна не азнаёмленая, а СМІ не дапамагаюць асьветай у гэтай сфэры. Між тым, за апошні час беспрэцэдэнтна ўзрос уплыў непрафэсіяналаў на прыняцце архітэктурных рашэньняў, на выгляд гарадзкога асяродзьдзя.

## Сьціраньне нормаў

Ёсьць у сьвеце гарады, якія самі па сабе — падручнікі архітэктуры. У іх гарманічна суіснуюць розныя гістарычныя пласты забудовы, першапачатковы выгляд будынкаў розных эпох скрупулёзна захоўваецца. Беларускія гарады — ахвяры гістарычных катаклізмаў, валюнтарысцкіх палітычных ды эканамічных экспэрымэнтаў — сваім выглядам прывучаюць жыхароў да незапатрабавальнасьці, да згоды на ўсё, што ні зьявіцца ў горадзе, калі гэта не закранае асабістых інтарэсаў.

У Менску і ва ўсёй нашай краіне няма ніводнага паўнавартаснага архітэктурнага ансамблю ў годным стане, амаль ніводнага будынку былых часоў у нескажоным выглядзе, і людзі





ІГАР БАЙЦОЎ



СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

ўспрымаюць гэта за норму. Таму такія якасьці, як кампазыцыйная завершанасьць, сумаштабнасьць, дасканаласьць і стылёвае адзінства, незапатрабаваныя. Цікавасьць да архітэктуры адсутнічае.

У нашых гарадах можа зьявіцца добрая архітэктура ці нейкая брыдота, можа зьнікнуць каштоўны архітэктурны фрагмэнт ці нават будынак, і гэта ня ўзрушыць амаль нікога. Людзі, у большасьці, наагул не ўглядаюцца ў наваколле. Ні навучальныя ўстановы, ні СМІ ня вучаць гэтаму.

У масавай сьвядомасьці няма элемэнтарнай сыстэмы крытэраў ацэнкі архітэктуры. Для большасьці прыгожы будынак — гэта сьвежафарбаваны ці абліцаваны «эўра»-матэрыяламі, а непрыгожы — даўно нерамантаваны. Адсюль і назіранае цяпер «прыхарошваньне» наваколья ад расфарбоўваньня валуноў да мадэрнізацыі выгляду помнікаў сівой даўніны.

Мала дапамагае ў гэтай справе сваім чытачам і «Наша Ніва» артыкуламі і нататкамі з адвольным выкарыстаньнем асобных аргумэнтаў і непатрэбнай для гэтай тэмы палітычнай тэндэнцыйнасьцю.

## Знос «Беларусі» дарэчны

Яскравы прыклад легкадумнасьці, што дэзарыентуе чытачоў, — кароткая зьвестка ў №31 аб зносе кінатэатру «Беларусь» як аб адмоўным факце. Здарэньне падаецца ізалявана ад архітэктурна-прасторавага кантэксту. Між тым, гэты кінатэатар быў пабудаваны паводле савецкага тыпавога праекту часоў барацьбы з «празьмернасьцямі». Сваім аб’ёмам і рашэньнем фасадаў ён не адпавядаў прызначанаму яму месцу, псаваў выгляд Юбілейнай плошчы і скверу. Яго будаўніцтва ў такім выглядзе было відавочнай памылкай. Яго назва несла непавагу да нашай краіны. Дарэчы, музэй сучаснага мастацтва зьбіраліся разьмясьціць ня «ў ім», а на яго месцы, з адбудовай і выкарыстаньнем капітальных муроў. Ці выгляд плошчы пасьля заканчэньня будаўніцтва зьменіцца да лепшага — пабачым, але дасягнуць паляпшэньня няцяжка.

## Лірычны помнік на парадным фоне

У №28 ёсьць нататка «Помнік Багдановічу не зьнясуць, дык упрыгожаць». Відавочна, аўтар не адчувае, што гэты варыянт помніка не адпавядае архітэктурна-прастораваму атачэньню, недастаткова зьвязаны ён з Опэрным тэатрам і тэматычна, а галоўнае — з манумэнтальным, вельмі парадным архітэктурным фонам. Не лірычнае гэта месца. Для гэтага месца і постаць помніка здаецца выпадковай, і падножжа выглядае няўдала.

Чаму ж так выйшла? Таму што скульптар С.Вакар ляпіў скульптуру зусім для іншага месца. Паводле ягонай задумы, помнік павінен быў стаяць у тым жа скверы, але блізка да вуліцы (тады яшчэ М.Горкага), насупраць дому, дзе нарадзіўся паэт, тварам да гэтага дому. Ад гмаху Опэры будынак засланялі б дрэвы, каля помніка магло б быць шмат кветак, нават палявых, і гэта было б найлепшае для яго лірычнае атачэньне. Таму і постаць была абраная такая неафіцыйная. Гэтае месца цяпер тым больш апраўдана, калі вуліца стала вуліцай імя М.Багдановіча. Але архітэктары, што працавалі над помнікам, ня здолелі ўзгадніць з ГалоўАПУ пастаноўку помніка ні на гэтым, ні на іншых, таксама далёкіх ад непатрэбнай параднасьці, месцах.

Пасьля гэтага аўтарам архітэктурнай часткі помніка стаў Ю.Грыгор’еў, начальнік ГалоўАПУ. На выбраным ім месцы помнік і зьявіўся. Так што, калі б зьдзейсьнілася, хоць і са спазьненьнем, задума аўтара скульптуры, было б лепш. Да таго ж помнік не канфліктаваў бы з новымі творамі скульптураў і малымі формамі архітэктуры, што неўзабаве маюць зьявіцца паблізу. У такім варыянце была б належная павага і да скульптара С.Вакара.

«Не дапусьцім зносу!» — перажывалі людзі», — піша аўтар. Але ж у сучасным Менску ліквідацыя помніка такой знакавай пэрсоне беларускай культуры не магла б адбыцца. Можа, разглядаўся варыянт ягонага пераносу на іншае месца? Якое? Гэта для чытачоў застаецца загадкай.

## Добрая Опэра

«Зьнікне купал над будынкам»… Назваць прымітыўны скатны дах купалам — гэта крута! Шэсьцьдзесят гадоў гэты недарэчны дах капітальна псаваў выгляд Опэры і ўсю панараму забудовы Траецкай гары, і, нарэшце, пастанавілі яго ліквідаваць! Гэта ж вельмі добра, а ў аўтара не знайшлося добрага слова для гэтай навіны. Многія ж нарадзіліся пасьля зьяўленьня гэтага даху, прызвычаіліся да яго, не здагадваюцца, што, паводле ідэі Лангбарда, дах не павінен узвышацца над сьцяной парапэту, нічога ня ведаюць аб каштоўнасьці стылёвай чысьціні і кампазыцыйнай завершанасьці.

«Канструктывісцкая Опэра» — гэта грубая памылка. З канструктывізмам Опэра ня мае нічога супольнага. Пабудавана яна ў стылі позьняга нэаклясыцызму 1930-х гадоў. Для гэтага стылю і для творчасьці Лангбарда характэрна ўключэньне ў кампазыцыю скульптур і барэльефаў. «У порціку паўстануць скульптуры чатырох музаў», — чытаем мы ў «НН», але такога порціка, каб іх разьмясьціць, проста няма. Няцяжка даведацца, як павінен быў выглядаць тэатар са скульптурным дэкорам, — дастаткова зазірнуць у кнігу «І.Г.Лангбард» (Менск, 1976).

Скульптурнае аздабленьне ўключала, акрамя чатырох вялікіх скульптур на ўзроўні другога паверху, яшчэ і шэраг барэльефаў у цеснай узаемасувязі з архітэктурнай кампазыцыяй. Яны выконвалі сувязную ролю паміж вялікімі скульптурамі і архітэктурнымі формамі. Але аб устаноўцы барэльефаў гаворка ў СМІ не вядзецца. Да таго ж характар прапанаваных скульптур, што былі паказаныя ў прэсе, стылёва не адпавядае архітэктуры Лангбарда і наагул не спалучаецца са стылістыкай 1930-х гадоў. Без падтрымкі барэльефаў і стылёва далёкія ад архітэктурнага фону, яны будуць выглядаць чужымі гэтаму ўнікальнаму будынку.

## Дажынкізацыя

На апублікаваным у прэсе мантажы праектаванага выгляду Опэры захаваныя вокны ў паўкруглым парапэце, не прадугледжаныя Лангбардам. Іх прабілі ў 1950-я, калі даваенная архітэктура не лічылася за каштоўнасьць. Захаваньне гэтых вокнаў было трывожным сыгналам. У Менску мы ўжо маем прыклады грубага скажэньня выгляду значных перадваенных аб’ектаў — былога гатэлю «Беларусь» і былога Інстытуту фізкультуры. Таму існуе вялікая небясьпека, што і Менская Опэра не атрымае ні першапачатковага выгляду, ні больш мастацка насычанага — згодна з праектам І.Лангбарда, а стане ахвярай тандэтнай «дажынкізацыі». А аўтар піша аб зьменах, што чакаюць Опэру, легкадумным тонам, мінаючы галоўнае. Для яго гэтыя скульптуры — дробязь: не было іх — цяпер будуць, ну, і хай сабе стаяць; ці будзе вынік на ўзроўні архітэктуры Лангбарда, яго гэта не турбуе. А яны ж ня ў скверы будуць стаяць, а на фасадах аднаго з найкаштоўнейшых архітэктурных аб’ектаў краіны!

Калі фасады Опэры будуць «рэстаўраваць» тандэтным прыхарошваньнем…

Працяг на старонцы 28.

# Архітэктура бяз комплексаў

Працяг са старонкі 27.

нем, гэта будзе катастрофай для аблічча вялікай часткі цэнтру нашай сталіцы — гмах дамінуе над атачэньнем. Будзе страчана вялікая частка ягонай эстэтычнай прывабнасьці і гісторыка-культурнай каштоўнасьці, а калясальны патэнцыял выразнасьці застанецца нескарыстаны.

Нядаўна зьявіліся матэрыяльныя сьведчаньні таго, што падыход будзе менавіта непаважным да гістарычнага аблічча Опэры. Плястыка паўкруглага парапэту, што будуецца замест разбуранага пры «рэстаўрацыі», адрозьніваецца ад першапачатковай у бок ускладненьня, зьяўляюцца карнізікі і іншыя адхіленьні ад арыгіналу. Якія яшчэ неспадзяванасьці чакаюць гмах ад цяперашніх суаўтараў І.Лангбарда — грамадзкасьці невядома.

## Кампрамісная «Эўропа»

Аб гатэлі «Эўропа», што цяпер будуецца, у «НН» пісалі неаднаразова, але, на жаль, з дагматычных пазыцыяў. Недастаткова дасьведчаную, каб самастойна разабрацца ў справе, большасьць чытачоў да апошняга часу пераконваюць, што гатэль і тэатар побач зь ім трэба было ўзнаўляць дакладна на іхніх гістарычных месцах. Але ж калі б гэты ўтапічны варыянт зьдзейсьнілі, кожны мянчук і госьць сталіцы ўспрымаў бы вынік як прыкрае калецтва на целе гарадзкой забудовы. Горадабудаўніцтва ў гістарычным цэнтры, які забудоўваўся непасьлядоўна, дзе асобныя незавершаныя фрагмэнты забудовы розных часоў спрачаюцца паміж сабой, — справа складаная. Тут мусова прыводзіць да ладу цэлы шэраг супрацьлеглых патрэб і інтарэсаў, шукаць кампраміс між імі. Таму непажаданы аднабаковы ўплыў вузкіх спэцыялістаў, якія добра бачаць адны аспэкты і не жадаюць бачыць іншых. Аднак акурат пад такі ўплыў трапіла «НН» у гэтым пытаньні.

Ня мае сэнсу цяпер падрабязна абмяркоўваць гэту тэму — пабудова ўжо ў такой стадыі, што сама гаворыць за сябе. Ужо ясна, што рашэньне было прынятае прынцыпова слушнае. Ёсьць усе падставы радавацца, гледзячы на гарманічнае спалучэньне з раней узьведзенымі будынкамі, на ўзбагачэньне асяродзьдзя архітэктурным дэкорам эпохі мадэрну, які раней амаль цалкам зьнік у Менску. Нарэшце, плошча Свабоды зноў выглядае як ансамбль. Напэўна, у «НН» радасьці не адчулі — у №38 за 2006 г. надрукаваны адмыслова «паваленны» здымак «Эўропы» ў ракурсе, што скажае выгляд. Здымак абсалютна не перадае прывабнасьці будынка і яго спалучэньня з суседняй забудовай. Ну што ж, гэта праява высокага прафэсіяналізму фотарэпартэра, мае яму віншаваньні!

Сказанае вышэй не азначае, што пабудова ня мае архітэктурных заганаў, яны ёсьць. Тое, што цягам праектаваньня зьменшылі вышыню паверхаў, уціснуўшы на адзін больш у ранейшую вышыню будынка, сказіла і пагоршыла прапорцыі вокнаў — зьнікла ранейшая вэртыкальная накіраванасьць. У выніку фасады страцілі адценьне парыскай шыкоўнасьці і набылі крыху савецкасьці. Зьверху будынак «прыціснула» груваская мансарда (намнога вышэйшая, чым мансарда былой «Эўропы») са спрошчаным архітэктурным афармленьнем, увянчаная банальным шкляным купалам сучаснага выгляду. Ня вельмі ўдалы і колер даху — занадта цёмны, бязь цёплага адценьня, характэрнага для дахаў гістарычных. Дарэчы, бяз гэтага купалу, які выглядае чужым у панараме Верхняга гораду, няцяжка было абысьціся, замяніўшы яго на непрыкметныя зэнітныя каптуры. Можна цешыць сябе тым, што ў далейшым мансарду можна перарабіць, надаць ёй больш тактоўны да атачэньня выгляд і пазбыцца купала.

## Паркінг-падман

Мяне вельмі ўзрадавала, што «НН» у №35 (2006 г.) вярнулася да тэмы майго допісу «Кампутарны міраж і бэтонная рэчаіснасьць» у «НН» №44 (2005 г.) і нарэшце надрукавала частку ілюстрацый, што павінны былі яго суправаджаць. Тэма хлусьні ў кампутарных візуалізацыях да праектаў — вельмі сур'ёзная. Трэба зьвяртаць на яе ўвагу зноў і зноў. Аўтар нататкі «Паркінг-падман» слушна асуджае дэзынфармацыю, але чамусьці называе падманны мантаж «прыгожым праектам». Дзіўна, што спадар СХ не заўважыў безгустоўнасьці спалучэньня ўзноўленай найкаштоўнейшай гістарычнай архітэктуры з грубай імправізацыяй «а-ля даўніна», ненатуральна паднятай над зямлёю. «Прыгожы праект», — піша ён. Не карцінка нават, а праект! Што ж прыгожага ў гэтым праекце, калі і пры меншай вышыні паркінгу, такой, як на карцінцы, дастаткова прайсьці трохі бліжэй да Нямігі, і вежы касьцёлу зьніклі б за навабудам! А выгляд паркінгу ў забудове зь іншых ракурсаў? Што ў ім прыгожага?

Прыгожа было да зьяўленьня паркінгу. Гэта добра відаць на трэцім здымку да майго таго допісу. Гэты здымак, на жаль, у друк ня трапіў, а цяпер мала хто добра памятае, як гэтае месца выглядала раней.

Вельмі многае з таго, што было апублікавана у «НН», зьмяшчае цікавую і карысную інфармацыю, справядлівыя ацэнкі таго, што адбываецца з архітэктурай і аховай помнікаў у Беларусі, але прыведзеныя мною прыклады сьведчаць, што тэма адлюстроўваецца непасьлядоўна і недастаткова зразумела для непадрыхтаваных чытачоў, у форме, не разьлічанай на пашырэньне кола зацікаўленых гэтай тэмай.

Часта галоўным і адзіным аргумэнтам на карысьць каштоўнасьці будынка аб'яўляецца ягоны даўні век, іншы раз — дачыненьне да гістарычных падзей і асоб, а сама па сабе архітэктурна-эстэтычная каштоўнасьць аб'екту і непаўторнага почырку мінулай эпохі — прыкладу разуменьня прыгажосьці нашымі продкамі — застаецца па-за ўвагай. Пры такім падыходзе далёка ня кожнаму чытачу зразумела, чаму заганна ўпрыгожыць, напрыклад, жыльлё гістарычнай асобы сучасным прывабным матэрыялам ці зрабіць з фасадамі даваеннага гатэлю «Беларусь» тое, што зроблена.

Мне здаецца, што, каб прыцягнуць цікавасьць шырэйшага кола людзей да тэматыкі, аб якой ідзе гаворка, трэба асьвятляць факты і падзеі з розных бакоў, ужываць прыклады і параўнаньні. Пажадана таксама паведамляць імёны аўтараў праектаў і ўсіх, хто добра ці кепска паўплываў на лёс праектаў і пабудоў. Гэта палягчае ўспрыманьне інфармацыі, а чытаць пра безыменных праекціроўшчыкаў ды чыноўнікаў нецікава.

Разумею цяперашнія цяжкасьці Рэдакцыі. Таму прапаную праграму-мінімум: паставіць надзейныя фільтры для адсеву недакладнасьцяў, памылак і палітызаванага асьвятленьня архітэктурных пытаньняў.

**Ад Рэдактара**

Гэты важны ліст перагукаецца з унутрырэдакцыйнымі дыскусіямі на гэтую тэму, якія дагэтуль не выносіліся на старонкі газэты. Спадзяёмся ў бліжэйшы час сабраць у Рэдакцыі круглы стол па праблеме падыходаў да аднаўленьня гістарычнага цэнтру сталіцы.




Малляваў Лявон Вольскі.

## АЛЯКСАНДАР АПОН

# Год сьвіньні

камэдыя ў дзьвюх карцінах

*Асобы:*

Мікалай Кандратавіч — старшыня калгасу.
Іван Пятровіч — намесьнік старшыні па ідэалягічнай рабоце.
Якуб Якубавіч — загадчык радыёвузла.
Вася — малады чалавек.
Лідка — сакратарка.
Рыгор — калгасьнік.
Ганна — ягоная жонка.
Юрка — іхні сын.

**Карціна першая**

*Кабінэт старшыні. Сядзяць, у галаве стала — Мікалай Кандратавіч, з аднаго і другога боку — Іван Пятровіч, Вася, Якуб Якубавіч і Лідка.*

**Мікалай Кандратавіч.** Усё, таварышы, жартачкі скончыліся. Я толькі што з выканкаму, там казалі, з намі больш цацкацца не зьбіраюцца: правалім выбары — пойдзем гной на поле вазіць. А ты, Іван Пятровіч *(глядзіць на Івана Пятровіча)*, першы зь віламі ў руках паляціш!

**Іван Пятровіч** *(ускочыўшы)* Не, не правалім, далібог, Мікалай Кандратавіч, не правалім!

**Мікалай Кандратавіч.** Ну, глядзі, я цябе папярэдзіў, як і ўсіх астатніх *(глядзіць на ўсіх астатніх)*. Сядай *(уздыхнуўшы)*. А лічбы, таварышы, нам паклалі гэдакія. Лідка, запішы, потым, як возьмеш у галаву, паперку каб спаліла. Так... не, пачакай... А: дзевяноста пяць! Пішаш?

**Лідка** *(піша)* Пішу.

**Якуб Якубавіч.** Во, а чаму нам гэта ажно дзевяноста пяць?

**Мікалай Кандратавіч.** А каму? *(падымае палец угору)*. Алег Віктаравіч так і сказаў: на вас, сказаў, Мікалай Кандратавіч, уся надзея, бо як ня вы, то ўсё — капец нам. Таму меней аніяк ня можна, але і болей: два супраць кінь, хай, каму трэба, падавяцца, а ўжо чатыры, дык невядома, ці зьехалі куды, а мо што іншае, ці чорт іх ведае, дзе шастаюць! Лідка, запісала?

**Лідка** *(піша)*... ці чорт іх ведае, дзе шастаюць! Запісала.

**Якуб Якубавіч.** Пачакай, Мікалай Кандратавіч, пачакай, нешта ня тое: дзевяноста пяць і два. І чатыры *(лічыць ў галаве)*. Усяго нібыта сто адзін выходзіць, так, сто адзін.

**Мікалай Кандратавіч.** Сто адзін?

**Іван Пятровіч** *(таксама падлічыўшы)*. Ага. Сто адзін.

**Мікалай Кандратавіч.** Не, ня можа быць! Лідка, дай паперу, я ў слупок прыплюсую *(плюсуе)*. Ну, сто адзін. Што будзем рабіць?

**Іван Пятровіч.** А можа, гэтых, ну, што паехалі невядома куды, пазаварочваем?

**Мікалай Кандратавіч.** Правільна, Іван Пятровіч, няма чаго! А то моду ўзялі — мала таго, што буракі на полі нецярэбленыя, дык яшчэ на выбары не пазаганяць.

**Вася** *(падхапіўшыся)* Мікалай Кандратавіч, мне, мне дазвольце, я іх... я ім...

**Мікалай Кандратавіч.** Добра, Вася, дазваляю, але сядай пакуль. Лідка, на *(аддае паперу назад)*. Перапішы.

**Лідка.** Слухаю *(піша)*.

**Іван Пятровіч.** Цяпер вось што. З гэтых дзевяноста пяці, хто «за», ня меней як палова мусіць прагаласаваць датэрмінова. Іван Пятровіч і ты, Лідка, складзеце датэрміновыя сьпісы, паглядзіце, хто ненадзейны, каго ўлічыць у першую чаргу. Заўтра зранку так і пачынайце хадзіць. І не саромцеся, як што, як хто морду нават супроць скрывіць, дык ад майго імя фігу ім пад нос адразу выкручвайце. Ні сена, ні буракоў, ні сотак на бульбу *(выкручвае фігу)* — во яны ў мяне ўбачаць! Вася, ты бюлетэні будзеш зьбіраць.

**Вася** *(ускочыўшы і зрабіўшы рукі па швах)* Ёсьць! Але ў мяне скрыні няма.

**Мікалай Кандратавіч.** Як няма, а тая, што летась насіў?

**Вася.** Мышы зьелі. Ушчэнт, ушчэнт, Мікалай Кандратавіч! Я яе на гару звалок, а ўчора залез, гляджу — нямашака.

**Мікалай Кандратавіч.** Ну, ня ведаю, другую якую вазьмі, ад тэлевізара там ці ад чаго. А ты, Якуб Якубавіч, — зараз жа пра нашае шчасьлівае жыцьцё: каб брахалаўка мне не змаўкала.

**Якуб Якубавіч.** Ды ўжо, Мікалай Кандратавіч, колькі гадоў як не змаўкае, але я думаю вось што: ці не падключыць дадатковыя рэзэрвы?

**Мікалай Кандратавіч.** Што за рэзэрвы?

**Якуб Якубавіч.** А яшчэ адзін гукальнік прычапіць каля крамы і так неяк, між іншым, усунуць, што ў сувязі з выкананьнем і перавыкананьнем прагнозных паказчыкаў цэны на пладова-ягадныя тавары першай неабходнасьці вось-вось палятуць уніз.

**Мікалай Кандратавіч.** Толькі ты, Якуб Якубавіч, ня пэўна так, што ўжо вось-вось палятуць, а як быццам. Бо каб потым, крый Божа, адказваць не давялося.

**Якуб Якубавіч.** Мікалай Кандратавіч, не давядзецца. Я на гэтых абяцанках не адзін зуб у роце зьлізаў.

**Мікалай Кандратавіч.** Але паберагчыся ня грэх. І таксама школу ўжо гатуйце. Сьцягоў панавешвайце, піянэраў у гальштуках, буфэт каб працаваў і аб'яву на дзьверы, як там: «Усе на выбары, за блёк камуністаў і...»

**Іван Пятровіч** *(перабіваючы)* Якіх камуністаў?!

**Мікалай Кандратавіч.** Цьху, загаварыўся! Проста — «Усе на выбары», але ўсё роўна — «за», і ўзоры бюлетэню ўсюды такія, каб людзі бачылі, у якой клетцы крыжык павінен быць. А то нападпітку ці ад сьлепаты чыркане ня там, а нам мучся потым...

**Іван Пятровіч.** А можа, Мікалай Кандратавіч, адразу, дзе трэба, начыркаем?

**Мікалай Кандратавіч.** Не, няможна. Наглядальнікі раптам могуць прыперціся, а хто, свае ці чужыя, — невядома.

**Вася.** Узяць бы гэтых наглядальнікаў за шкірку...

**Іван Пятровіч.** Вася, наглядальнікі як прыедуць, так і паедуць, у нас сваіх каго браць хапае.

**Мікалай Кандратавіч.** Ты гэта пра каго?

**Аляксандар Апон**

драматург, аўтар вострасацыяльных п'есаў. Жыве ў Беларусі.

**Іван Пятровіч.** Ну як жа, а вучыцель гісторыі?

**Мікалай Кандратавіч.** У акулярах такі, з вушамі?

**Іван Пятровіч.** Ага, ён, лапавухі.

**Мікалай Кандратавіч.** І што, што ён?

**Іван Пятровіч.** Ваду ўсё муціць. Днямі прыпёрся на фэрму, чаравікаў, сволач, не пашкадаваў, і кажа даяркам, што фэрма ня наша, а калгасная. Быццам бачыў нейкія паперы, што яе, фэрму, некалі ўсім калгасам будавалі.

**Якуб Якубавіч.** Во гад!

**Вася** *(ускочыўшы)* Дайце, дайце мне яго! Я яму... я яму... акуляры на ілбе размажу, вушы паадрываю!..

**Мікалай Кандратавіч.** Пачакай, Вася, сядзь, мы яму як-небудзь пасьля давядзем да галавы, чыя фэрма, а цяпер... ну, ня ведаю...

**Іван Пятровіч.** Мо, Вася, з рагаткі, нібыта ненаўмысна, з-за рога, каб у акуляры каменьчыкам пацэліць? Ён жа сьляпы, пакуль да раёну за новымі зьбярэцца — глядзіш, і выбары скончацца. Ці маеш, Вася, рагатку?

**Вася.** А як жа! *(лезе ў кішэнь і, выцягнуўшы, кладзе рагатку на стол)* Вось, заўсёды пры мне!

**Мікалай Кандратавіч.** Маладзец, схавай пакуль. А ты, Іван Пятровіч, сёньня ж ляці на фэрму, зьбяры там усіх і дай лекцыю пра міжнароднае становішча.

**Іван Пятровіч.** Добра, але, як вы мяркуеце, мо бацюшку прыхапіць, хай бы пад'ехаў, памахаў кадзілам?

**Мікалай Кандратавіч.** Правільна, толькі ня так — абы махаць, а ідэалягічна. Гэта ўсё?

**Іван Пятровіч** *(уздыхнуўшы)* Не, яшчэ адзін баламут аб'явіўся.

**Мікалай Кандратавіч.** Хто такі?

**Іван Пятровіч.** Дзед Міхась. Вэтэран наш, ну, што руку ў Бэрліне згубіў.

**Мікалай Кандратавіч.** А што, чаго ён?

**Іван Пятровіч.** Здурнеў на старасьці год! Выпісаў зь Менску нейкую «Нашу Ніву» і ходзіць па хатах, людзей палохае.

**Якуб Якубавіч.** Ага, і я бачыў, мэдалі на пінжак начапіў і ідзе, кульцю выставіўшы, а ў руцэ газэта.

**Мікалай Кандратавіч.** А што за газэта?

**Якуб Якубавіч.** Ня ведаю, я не чытаў, але напэўна ня наша.

**Мікалай Кандратавіч.** Так, Іван Пятровіч, ці ты, Лідка, зойдзеце хтось на пошту і скажаце, як прыйдзе наступны нумар, так адразу ў печ.

**Іван Пятровіч.** Дык печы, Мікалай Кандратавіч, хапае чым распальваць, ад «Советской Белоруссии» зараз на пошце няма дзе ступіць; я неяк хацеў зайсьці, дык вы не паверыце, дзьвярэй не адчыніць!

**Мікалай Кандратавіч.** Усё роўна, і «Ніву» гэтую — у печ. Бач, пердала старое, «Нівы» яму захацелася.

**Іван Пятровіч.** Ён кажа, што за гэтую «Ніву» ваяваў.

**Мікалай Кандратавіч.** Я яму паваюю. Лідка, запішы, каб мы не забыліся: на 9 мая, як дажыве, каб на мітынгу я яго ня бачыў. А ты, Вася, не забудзь: дзьверы яму раніцай ці нават зьвечара падапрэш, каб ня вылез. Бо ў шыю гнаць неяк няёмка пры людзях будзе. Ну, быццам, таварышы, усё.

**Іван Пятровіч** *(падняўшыся)* Не, Мікалай Кандратавіч, ня ўсё. Я не хацеў, але калі пайшла такая шчырая размова, змаўчаць не магу *(прыкладае руку да сэрца)*. Сэрца, Мікалай Кандратавіч, не на месцы, далібог, не на месцы!

**Мікалай Кандратавіч.** А што, чаго зноў?!

**Іван Пятровіч.** Ды вось, Мікалай Кандратавіч! *(выцягвае з кішэні паперу)* Гэта замест «Правільным курсам ідзяце, таварышы», ці «Тэзісы», якія дзецям у школе на літаратуры задаюць. Я наўмысна перапісаў, каб вам прачытаць *(кашляе ў кулак і чытае)*.

Адзін вялізарны Парсюк,
Які абегаў вёску ўсю,
За раніцу абшнырыў завугольле,
Цяпер такі меў выгляд важны,
Што носа не дастаць і сажнем —
Вышэй за ўсіх ён сам сябе лічыў,
А што ў самога на лычы...

**Мікалай Кандратавіч.** Хопіць, зразумела. Вершык забараніць.

**Іван Пятровіч.** Ды я ўжо казаў дырэктару, каб забараніў, але, напэўна, брэша, што ў праграму гэты вершык устаўлены ажно Міністрам, і нешта ад сябе забараняць ня мае права.

**Якуб Якубавіч.** А што калі гэты вершык, ну, крышку перарабіць, уцiснуць, так бы мовіць, у сучаснасьць? Вось, да прыкладу: адзін прыгожанькі парсюк... ці не, пачакайце... Ага: адзін, нібыта леў, парсюк, які ўсю ноч пісаў дэкрэт!

**Іван Пятровіч.** Во-во-во! Які ўсю ноч пісаў дэкрэт! Вельмі, вельмі прыгожа і сучасна.

**Мікалай Кандратавіч.** І мне падабаецца. Ты, Якуб Якубавіч, займіся, у цябе, бачу, выходзіць, а Лідка потым на машынцы адстукае, і адразу ў школу. Лідка, чуеш?

**Лідка.** Чую.

**Мікалай Кандратавіч.** І скажаш там дырэктару, хай нават ня думае ня ўзяць! Усё, таварышы, да працы. Вася, затрымайся.

*Усе ўстаюць і, акрамя Васі, выходзяць. Мікалай Кандратавіч бярэ Васю пад руку і адводзіць у кут.*

**Мікалай Кандратавіч** *(прыглушаным голасам)* Ці ёсьць у цябе, Вася, ножык?

## ЗДЫМКІ ГОДУ



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**На думку Аляксандра Лукашэнкі, Лідзія Ярмошына сфальсыфікавала выбары: з 93,5% галасоў зрабіла 86%.**

**Вася.** Ёсьць.
**Мікалай Кандратавіч.** А ці завостраны?
**Вася.** Завостраны.
**Мікалай Кандратавіч.** Тады вось што: трэба нешта з дырэктарам рабіць, неяк папярэдзіць, бо зашмат гонару ўзяў. Можа, колы ў машыне папрапорваць, га, як ты, Вася?
**Вася.** Не пытаньне, Мікалай Кандратавіч, зробім!
**Мікалай Кандратавіч.** Толькі каб ніхто ня ўгледзеў.
**Вася.** Не, ён жа яе абы дзе кідае.
**Мікалай Кандратавіч.** І нікому ні слова!
**Вася.** Нават Івану Пятровічу?
**Мікалай Кандратавіч.** Так, нават яму. Усё, ідзі.
**Вася.** Ёсьць *(ідзе)*.

**Карціна другая**

*Пакой у хаце. На тапчане, каля печы, як і быў з вуліцы, толькі сьцягнуўшы боты, адзін зь якіх пад галавой, а другі невядома дзе, сьпіць Рыгор. Ён моцна храпе. Уваходзіць з двору Ганна.*

**Ганна.** А-ёй, божачкі мае, ажно сьцены трасуцца! Уставай ужо, разваліўся тут, ты чуеш ці не?
**Рыгор** *(перастаўшы раптам храпсьці)* Адчапіся, курва!
**Ганна.** Што?! Я табе дам, курва! *(Падскоквае да тапчана і, ухапіўшыся абедзьвюма рукамі, скідае яго долу)*
**Рыгор** *(жаласна)* Чаго ты кідаесься, баліць мне! *(Паварочваецца на бок і, падклаўшы руку пад галаву, сьпіць далей)*
**Ганна** *(усплёснуўшы рукамі)* Не, ну паглядзіце, людзі добрыя, каб у печ сунула, так і там захроп бы! Ой, не магу, пайду дзе, ня вытрымаю!

*Ганна выходзіць. З другога пакою ўваходзіць Юрка.*

**Юрка.** Тата, тата, уставай, падлога халодная, застудзісься.
**Рыгор** *(падняўшы галаву)* А, сынок... Што, ранак ужо?
**Юрка.** Ранак, татка, ранак. Я і пасьнедаў, і во — партфэль злажыў. У школу палячу, на рэпэтыцыю.
**Рыгор** *(прысеўшы на тапчан)* Якую рэпэтыцыю?
**Юрка.** Я ж табе ўчора казаў — у дудку дудзець *(лезе ў партфэль, адкуль выцягвае піянэрскі горн)*. Во!
**Рыгор.** А, ну-ну, ляці! Не, пачакай, дай я на цябе пагляджу *(глядзіць, і ледзьве не пусьціўшы сьлязу)*. Адзін ты мяне шкадуеш, сіротка ты мая!
**Юрка.** Які я, татка, сіротка, і мамка ў мяне ёсьць, і ты.
**Рыгор.** Ну так, так, але... памру я мусіць зараз, сынок!
**Юрка.** Не, не памрэш, татка, нічога!

*Юрка выходзіць.*

**Рыгор** *(адзін)* Не памру, напэўна. Галава, вой, сэрца! *(Ідзе п'е ваду, потым уключае радыё)*
**Голас Якуба Якубавіча.** Велізарнейшая перамога нашага калгаснага ладу, чарговае сьвята, якога ня бачыў сьвет! Пра падрыхтоўку ў прамым ранішнім рэпартажы наш карэспандэнт Антось Чэсны. Антось?.. Антось?..
**Голас карэспандэнта.** Што? Я!
**Голас Якуба Якубавіча.** Чуеш?
**Голас карэспандэнта.** Чую.
**Голас Якуба Якубавіча.** Дзе ты?
**Голас карэспандэнта.** Тутака, ля школы.
**Голас Якуба Якубавіча.** Што відаць?
**Голас карэспандэнта.** Пакуль нічога — туман. Ці не, пачакай, во, піянэр! Ідзі сюды. Як цябе?
**Голас Юркі.** Юрка.
**Голас карэспандэнта.** Юрка? Добра. А што ты нам падрыхтаваў, Юрка?
**Голас Юркі.** У дудку дудзець.
**Голас карэспандэнта.** О, маладзец! Ты, напэўна, ня спаў усю ноч, хваляваўся?
**Голас Юркі.** Не, спаў з мамкай, бо татка напіўся бражкі.
**Рыгор.** Цьху! *(выключае радыё)*

*Улятае Ганна.*

**Ганна.** Падняўся?! Вой, морда сьмярдзючая, вочы мае б ня бачылі! Там ідуць да цябе, глядзі, толькі паспрабуй выкінь мне што!
**Рыгор** *(спалохана)* Хто ідуць, чаго?
**Ганна** *(ня слухаючы, кідаецца прыбіраць на тапчане, потым, адчыніўшы на двор дзьверы)* А, Іван Пятровіч, Лідачка, дабрыдзень вам! Заходзьце, заходзьце, калі ласка!

*Уваходзяць Іван Пятровіч, Лідка з папкай у руцэ і Вася з кардоннай каробкай ад тэлевізара.*

**Іван Пятровіч** *(паказваючы на стол, да Васі)* Сюды стаў.

*Лідка, абыходзячы Васю, сядае на другі бок стала і адразу пачынае цягаць з папкі паперы.*
*Паўза.*

**Лідка** *(не паднімаючы галавы)* Так, Рыгор, бліжэй давай.
**Рыгор.** Чаго, што я зрабіў?

## ЗДЫМКІ ГОДУ



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Іван Пятровіч.** Покуль нічога, але глядзі!

**Рыгор** *(зрабіўшы крок да стала)* Што гэта?

**Лідка.** Датэрміновае галасаваньне.

**Рыгор.** Якое галасаваньне?

**Іван Пятровіч.** Датэрміновае, Рыгор, за наш з табой калгас, каб квітнеў і багацеў, ці, можа, ты ня хочаш?

**Ганна** *(штурхаючы Рыгора ў сьпіну)* Хоча, хоча, ну, што маўчыш, ірад?

**Рыгор.** Ага, хачу, але чаму мне гэта датэрміновае?

**Лідка.** Бо ты ў нас у датэрміновым сьпісе. Во, бачыш? *(Тыркае пальцам у паперу)* Расьпішыся вось тут.

**Рыгор.** Не, не магу. Рукі дрыжаць.

**Іван Пятровіч** *(сьмяецца)* Ну, дык крыжык пастаў.

**Рыгор.** Нічога ня бачу. Вочы...

**Іван Пятровіч** *(перастаўшы сьмяяцца)* Рыгор, ты што, здурнеў?

**Рыгор.** А я... А я невінаваты *(паказвае на Ганну)*. Вось, яна!

**Ганна.** Што, чаго я?

**Іван Пятровіч.** Так, я бачу, тут нейкая дывэрсія?

**Ганна** *(спалохана)* Якая дывэрсія?

**Іван Пятровіч.** Ідэалягічная, я гэдак мяркую, а ты, Вася?

**Вася** *(насупіўшыся і засунуўшы палец у нос)* Ну.

**Іван Пятровіч.** Дык ты, Рыгор, такі адмаўляесься?

**Рыгор.** Чаму адмаўляюся? *(Сунецца задам да тапчана)*. Нічога не адмаўляюся *(прылягае, узяўшыся за сэрца)*. Сэрца мне баліць.

**Лідка.** Ну, ня хоча, як хоча *(зьбірае паперы)*

**Іван Пятровіч.** Нічога, вясною, як дзялку буракоў прыйдзе прасіць, апрытомнее. Лідка, уляпі, каб не забыліся, насупраць Рыгора галку.

**Лідка.** Ужо ўляпіла.

**Іван Пятровіч.** Вася, скрыню бяры, пайшлі.

**Ганна.** А-ёй, Лідачка, Іван Пятровіч, пачакайце, гэта ён так, зараз я *(кідаецца з кулакамі да тапчана)*. Уставай, уставай, кажу. Паразыт, п'янчуга няшчасная!

**Рыгор** *(адбрыкваючыся)* Ня лезь!

**Ганна** *(злуючы)* Што?! Оёй, браткі мае, сястрычкі, людзі даражэнькія!.. Трымайце, трымайце, рукі вяжыце *(выцягвае рукі, каб вязалі)*. Заб'ю, заб'ю курвіну гэнтую! Уставай, гад, валацуга! В-вася, сыночкі мае, стрэльбу мне, стрэльбу... там за печчу, давай, цягні, застралю! І-і-і, сьвятыя ўгоднікі, ня вытрымаю, грэх які, ратуйце, а-а-а! *(Хапаецца за галаву)*.

*Уваходзіць Мікалай Кандратавіч.*

**Мікалай Кандратавіч.** Дзе, што гарыць?

**Іван Пятровіч** *(нахіліўшыся ў бок дзьвярэй, каб уцякаць)* Гарыць?

**Лідка** *(спалатнеўшы)* Што?

**Вася** *(выцягнуўшы з носу палец)* Пажар?

**Рыгор** *(зьляцеўшы з тапчана)* Дзе?

**Ганна** *(раптам сумеўшыся)* А, Мікалай Кандратавіч, а я ўжо да вас хацела ляцець, паглядзіце, што ірад мой вычаўляе!

**Мікалай Кандратавіч.** Хто, Рыгор?

**Іван Пятровіч.** А ён ужо не Рыгор, а ідэалягічны дывэрсант, ня хоча, каб наш калгас квітнеў і багацеў, а толькі пра сябе. Во, Вася ня дасьць схлусіць.

**Вася.** Ага.

**Рыгор.** Дык я... Дык я...

**Мікалай Кандратавіч.** Што: дык ты, дык ты! *(Бярэ Рыгора пад руку і адводзіць убок)* Ну, прызнавайся, блага, галава табе баліць, так?

**Рыгор.** І сэрца.

**Мікалай Кандратавіч** *(азіраецца і, выцягнуўшы з кішэні бутэльку)* На, падлячыся.

*Рыгор хапае бутэльку і, задраўшы галаву, п'е.*

**Мікалай Кандратавіч.** Ну як, акрыяў троху?

**Рыгор.** Не *(ікае)*, не разабраўся, зараз яшчэ глыток *(робіць глыток)*.

**Мікалай Кандратавіч.** Хопіць *(забірае бутэльку і заварочвае Рыгора да стала)*. Пайшлі, чыркнеш там што-небудзь, дзе Лідка пакажа.

**Лідка** *(зноў расклаўшы паперы)* Вось тут, Рыгор *(паказвае)*.

*Рыгор, нахіліўшыся, расьпісваецца.*

**Мікалай Кандратавіч.** Ну, от!

**Вася.** А бюлетэнь, Мікалай Кандратавіч, у скрыню кінуць?

**Мікалай Кандратавіч.** Потым, сам кінеш. Ну, мне на фэрму яшчэ, а вы тут глядзіце *(выходзіць)*.

**Іван Пятровіч.** Лідка. Зьбірайся.

**Ганна.** Ужо ідзяцё, а я, мне, Іван Пятровіч, Лідачка?

**Іван Пятровіч.** А ты пад вечар у школу прыйдзеш, там наглядальнік будзе.

**Ганна.** Ага, з абеду ўжо прылячу.

**Іван Пятровіч.** З абеду ня трэба, пад вечар кажу.

**Ганна.** Нічога, пачакаю.

**Іван Пятровіч.** Ну, як хочаш.

*Усе, акрамя Рыгора, выходзяць.*

**Рыгор** *(адзін, гледзячы ў акно)* Во, панесла чарцей *(уключае радыё)*.

**Голас Якуба Якубавіча.** ...пра папярэднія вынікі ў нашым рэпартажы Антось Чэсны. Антось? Антось?

**Голас карэспандэнта.** Што? Я?

**Голас Якуба Якубавіча.** Чуеш?

**Голас карэспандэнта.** Чую.

**Голас Якуба Якубавіча.** Дзе ты?

**Голас карэспандэнта.** Тутака, ля хлява.

**Голас Якуба Якубавіча.** Як ідзе галасаваньне, ці ёсьць зьвесткі?

**Голас карэспандэнта.** Так, ёсьць — перамога! Нявіданная элегантнасьць! Ірвуцца да скрыні! Вася ледзьве адганяе! Во, Вася, скажы.

**Голас Васі.** Ну.

**Голас Якуба Якубавіча.** Ага, добра, зьвяжамся праз гадзіну. А цяпер на просьбу бабці Філі...

*Уваходзіць Юрка.*

**Рыгор** *(выключае радыё)* О, сынок! А ты што, дудзеў ужо?

**Юрка.** Не, татка, не дудзеў, вечарам, але яшчэ вершык вучыць задалі.

**Рыгор.** Які вершык?

**Юрка.** Пра парсючка! Во! *(Выцягвае з партфэлю папку і, углядаючыся, чытае)*.

Адзін, вышэй за ўсіх зьвяроў, парсюк!
Які ўсю ноч пісаў дэкрэт:
Ён кіраваў тут вёскай.
На раніцы сабраў нарад...

**Рыгор** *(перабіваючы)* Не, сынку, нешта ня так.

**Юрка.** Так, татка, так. *(Чытае)*

...На раніцы сабраў нарад.
І вось адзін тут падсьвінак,
Нячэсны нахабнік і выкрунтас...

**Рыгор** *(перабіваючы)* Не, не, чакай, успомніў! Во як:

І вось адзін тут падсьвінак,
Які заўважыў бруд раней
І кажа: «Дядзечка...

**Юрка.** Не, татка, не, ты забыўся.

**Рыгор.** А, ну, можа. Ідзі вучы, сынку.

*Юрка выходзіць.*

**Рыгор** *(адзін, сумна)* Ну, хіба і сапраўды — забыўся *(плача)*.

*Канец*

ЛАЎРЭН ЮРАГА

# Манускрыпт

Калі, нарэшце, апошні чытач сыходзіць, ты зачыняеш дзьверы на ключ, гасіш сьвятло — пакінуўшы запаленай толькі лямпу на стале, за якім працуеш, — затым прыносіш са сховішча і кладзеш пад сьвятло пэргамінны сувой. Асьцярожна спрабуеш разгарнуць высахлы скрутак. Белы, некалі дбайліва выраблены, пэргамін супраціўляецца гэтаму простаму руху, быццам ня хочучы адкрываць твайму цікаўнаму зору таямніцы мінулых стагодзьдзяў. Ты ня гвалціш яго, імкнучыся агаліць пісьмёны жывасілам. Не, настойліва пераконваеш — фіксуеш вольны край у адмысловым прыстасаваньні, а затым, трымаючы рукамі за бакі, вельмі павольна раскатваеш у процілеглы бок, стараючыся па меры магчымасьці выпростваць пакарobленыя месцы. І сувой не адразу — паступова — але паддаецца. Увогуле, кнігі маюць шмат супольнага з жанчынамі…

Манускрыпт гэты сёньня прынес адзін «здатчык», як у аддзеле называюць людзей, што здаюць у Нацыяналку старыя кніжкі. Сувой перадалі табе на экспэртызу, бо ты вядзеш тут калекцыю рукапісаў, — толькі ў аддзеле рэдкай кнігі ты змог знайсьці ўжытак для сваіх ведаў, назьбіраных за доўгія гады жыцьця на чужыне і штудыяў у замежных вучэльнях. Канешне, і тут ёсьць свае мінусы — кшталту сёньняшняга дзяжурства па чытальні, — калі замест таго, каб самому пранікаць у загадкі дарагіх твайму сэрцу рукапісаў, ты мусіш проста выдаваць іх іншым ды сачыць за парадкам, з рэўнасьцю назіраючы, як улюбёнай табою працай займаюцца прышлыя дасьледчыкі. Зь іншага боку, ты маеш пэўныя перавагі: напрыклад, пасля заканчэньня працы бібліятэкі, выправіўшы чытачоў, сам можаш сядзець хоць да раніцы, навёрстваючы тое, што ўпусціў удзень. Увогуле, ты задаволены гэтай працай: хоць і ня маеш вялікага заробку, затое робіш справу, якая табе цікавая і дазваляе занурвацца ў глыбіні нязьведаных кніжных таямніцаў…

Вось нарэшце табе ўдалося разгарнуць першы аркуш рукапісу, і ўжо бачнае дробнае шво, якім злучаныя між сабой кавалкі пэргаміну. Тэкст занатаваны квадратным гэбрайскім пісьмом, і таму манускрыпт папярэдне атрыбутаваны як Тора, то бок біблейскае Пяцікніжжа — бо гэта, бадай, адзіная жыдоўская кніга ў форме сувою, якую сёньня можна сустрэць у беларускіх кнігасховах.

Але ты заўсёды марыў зрабіць адкрыцьцё, знайсьці нешта такое, што да цябе ніхто не бачыў і не знаходзіў. А раптам гэта яно? У кожным разе, для канчатковай атрыбуцыі неабходна зрабіць пробу тэксту. Ты дастаеш з паліцы слоўнікі, бярэш у руку лупу і, прыгадваючы вучаныя шмат гадоў таму ў далёкім каталіцкім унівэрсытэце гэбрайскія літары і словы, спрабуеш чытаць...

Празь дзьве ці тры гадзіны працы (а час ляціць незаўважна!) ужо зразумела, што перад табой ляжыць зусім ня Тора. Натуральна, ты ня можаш цытаваць даслоўна, перыкопа па перыкопе, тэкст Кнігі Роду ці, скажам, Другазаконня, але ўсё ж дастаткова добра памятаеш агульны зьмест іх, каб сумнявацца: такога фрагмэнту няма — дый ня можа быць — у Пяцікніжжы. Ты маеш дачыненьне зь яскравым узорам нейкага эзатэрычнага рукапісу. Аўтар яго апісвае сыстэму ўладкаваньня сусьвету, гіерархію сілаў сьвятла і цемры, а таксама іншых стварэньняў, якія існуюць самі па сабе, па-за цемрай і сьвятлом. Ён піша пра іх моц і здольнасьці, пра спосабы і заклёны, з дапамогай якіх можна здабраволіць адных, процістаяць другім або падначаліць і змусіць сабе служыць трэціх. Ты далёка ня ўсё разумееш, бо чытаньне так захоплівае, што ня хочацца яго перабіваць, сягаючы па кожны незнаёмы выраз у слоўнік, дый і ня ўсё ў слоўніку ёсьць.

Ты ня знаеш гэтага твору і, здаецца, ніколі пра яго не чытаў, але, зрэшты, ты — не гэбраіст, а ўсё на сьвеце ведаць немагчыма. З іншага боку, ты нават не перакананы, ці ёсьць у сьвеце спэцыяліст, які мог бы даць тут рады, бо эзатэрычныя веды таму так і называюцца, што яны таемныя: яны перадаваліся зазвычай вусна і толькі ў нешматлікім коле выбраных вучняў, а запісваліся ў выключных выпадках.

Ты чытаеш далей. Аўтар быў няблага знаёмы са старажытнай філязофіяй: у адным месцы ты знаходзіш, як табе здаецца, наследаваньне Філёну Александрыйскаму, другое — назьдзіў! — нагадвае Плятона. Ты ўжо ня ведаеш, што і думаць! Каб у гэбрайскім трактаце знайсьці водгульле нэаплятонаўскіх ідэй?! Можа, гэта сучасная падробка?! Але як вызначыць? Пэргамін — не папера: на ім не бывае вадзяных знакаў, якія можна знайсьці на беларускіх рукапісах, таму і час яго зьяўленьня пралічыць фактычна немагчыма. Нічога ня дасьць тут і палеаграфія, бо гэбраі — надзвычай кансэрватыўная нацыя, а, у прыватнасьці, гэты від пісьма ўжывае тыя самыя абрысы літараў на працягу стагодзьдзяў, калі ня тысячагодзьдзяў!

У галаву прыходзіць дурная думка:

**Лаўрэн Юрага**

літаратар. Жыве ў Менску.

## ЗДЫМКІ ГОДУ




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Моладзь пратэстуе супраць пераводу выкладаньня гісторыі і геаграфіі Беларусі на расейскую мову.**

бадай, адзіны спосаб вызначыць аўтэнтычнасьць рукапісу — паспрабаваць ажыцьцявіць які-небудзь з апісаных у ім заклёнаў! У іншы раз ты б адразу адкінуў яе як вар'яцкую, але на двары глыбокая ноч, ты сядзіш у коле сьвятла пасярод цёмнага пакою, і ўсё, што ўдзень несумненна падалося б вар'яцтвам, зараз набывае матэрыяльнасьць.

Думка не пакідае, ты ня можаш яе адрэчыць. А сапраўды: чаму не? І так жа нічога не адбудзецца. Крыху павагаўшыся, дастаеш з шуфляды крэйду, што засталася пасьля нядаўняй лекцыі перад студэнтамі, пераварочваеш лямпу так, каб яна асьвятляла ня стол, а падлогу, і нядбалымі рухамі пачынаеш рысаваць пэнтаграму.

Выбраўшы найпаўней адчытанае месца ў кнізе, ты перапісваеш на кавалак паперы формулу заклёну — каб ня зьбіцца ў патрэбны момант, і кіруеш да крэйдавага рысунку на падлозе. Твой голас дрыжыць, калі, стаўшы ў патрэбным месцы, ты спрабуеш агучыць запісанае. Нічога не адбываецца — вядома ж! Другі раз ты паўтараеш тыя словы ўжо больш упэўнена, а трэці — нават выразна. Натуральна, нічога! Ты ўжо зьбіраешся вярнуцца да стала, каб скласьці рэчы ды рушыць дадому, бо сёньня ўжо яўна нічога не прыдумаеш — але раптам разумееш: не, штосьці-такі здарылася! Безумоўна, не выбухнула полымя і не пайшоў слупам дым, як часам паказваюць у фільмах; не праваліласа падлога і не адкрылася іншае вымярэньне. Проста змрок, што напаўняе чытальню, раптам пачаў нібы сьцякацца да цэнтру пэнтаграмы і зьбірацца там у неакрэсьленай формы цёмны сумёт.

Значыць, зьдзейснілася! Рукапіс сапраўды арыгінальны — а табе дадзены шанс, якога ты чакаў усё жыцьцё! Радасьць замгляе вочы, ты забываешся на ўсё — нават на смугу змроку, зь якой пачынае выматэрыялізоўвацца нешта, аддалена падобнае да чалавека. І калі раптам пакой расьсвечваецца наднатуральным сяйвом, а невядомая істота, набыўшы больш ці менш пастаянную форму, пытаецца, чаго ж ты жадаеш — ты проста губляешся: як?! Яшчэ нечага жадаць?! Дык ты ўжо маеш тое, што заўсёды лічыў нязбыўнай марай! Чаго можна пасьля гэтага яшчэ хацець?!

Але ты чалавек выхаваны, і табе здаецца нясвядомым, а нават непрыстойным, выклікаць дэмана зь невядома якіх далячынь толькі дзеля таго, каб потым проста сказаць, што ён непатрэбны. Гэтак нядобра! Ты стаіш у задуменьні; позірк лена сьлізгае па асьветленых дзівосным сяйвом сталах, сьценах, падлозе… Ты ў які ўжо раз з сумам канстатуеш бядотны стан найбуйнейшай бібліятэкі краіны, на якую ў міністэрства ніколі няма грошай — і раптам цябе прасьвятляе!..

* * *

На тваё аграмаднае зьдзіўленьне, чамусьці ніхто ва ўсёй краіне не ўразіўся, што ўрад, раней цалкам абыякавы да праблемаў культуры, раптам праявіў проста-такі нездаровае зацікаўленьне справамі Нацыяналкі, а нават распачаў добраахвотна-прымусовы збор ахвяраваньняў на ўзнясеньне новага будынку для яе. Разыйшлося меркаваньне, што гэта чарговая піяр-акцыя ўлады, а пра нейкія надпрыродныя карані гэтае зьявы ніхто і падумаць ня мог. Ты б, напэўна, застаўся задаволены сваёй ідэяй, каб не вярэдзіла стрэмка ў душы: ты ж каталік, і, калі эўфарыя прайшла, згадаў, што за свае падарункі д'ябал (а ўсё, што не ад Бога — тое ад д'ябла!) заўсёды выстаўляе стакроць большы рахунак. Першы званок ужо празьвінеў: падчас пераезду бібліятэкі ў новы будынак цябе звольнілі з працы, бо НББ цяпер — «рэжымны аб'ект», і ты з сваім апазыцыйным мінулым там не да месца. Цяпер застаецца толькі маліцца Пану Богу, каб на табе ўсё скончылася, а на саму Бібліятэку не абрынуліся нейкія іншыя — больш страшныя — наступствы твайго недарэчна выказанага жаданьня.

*2006 г.*

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ

# Злодзей, забойца, кішэньнік і рабаўнік,

або Мой радавод да невядомага калена

Бацька гіне ў пажары. А перад гэтым бацька будуе хаціну на са мым ускрайку Расон, тварам у лес, крывым нажом гародзіка ў самую пушчу. Пяць крокаў — і балота, гадзюка на камені і хрыпеньне вепрука ў бярэзьніку. Журавіны ў ботах. Ваўчыныя сьляды на сьнезе — узбоч парніка, па двары, па тазіках і па нашай сьцежцы ў прыбіральню. Узімку, за месяц да свайго вяртаньня ў наш магілёўскі дом, бацька гарыць. А перад гэтым ён будуе ў Расонах цагельню. А перад гэтым ён матляецца па Віцебшчыне, каб уладкавацца і прывезьці туды сям'ю. А перад гэтым ён інжынэрам у Магілёве, але Чарнобыль, і перабудова, і ўсё панеслася. Днём на працы, а вечарам мама з бацькам кляпаюць курткі-вятроўкі, возяць іх у Воршу на базар. У выніку каляровы тэлевізар і новая сьценка. А перад гэтым бацька ў вечных камандзіроўках. І з адной камандзіроўкі ён прывозіць мне першы ў горадзе скейт. А перад гэтым ён пачынае піць і курыць. А перад гэтым ён ірве свае дзьвесьце пяцьдзясят грамат за лыжы і лыжныя палкі, выціраючы сьлёзы бясьсільнай злосьці ў інтэрнаце. А прад гэтым ён — студэнт у Ленінградзе, кандыдат на месца ў саюзнай зборнай. А перад гэтым ён — першы, і другі, і трэці ў вобласьці, у рэспубліцы, у горадзе. А перад гэтым яго бацька, а мой дзед, сядзіць у турме, і таму мой бацька рве свае дзьвесьце пяцьдзясят грамат за першыя, і другія, і трэція месцы, бо на стале ў чалавека насупраць выпіска з асабістай справы, а ў гэтай выпісцы бацькаў бацька, а мой дзед — злодзей-рэцэдывіст. А перад гэтым мой бацька самы старшы ў сям'і. Восем нарадзілася, пяцёра выжылі. Мой бацька старшы. Яго запісалі іншым годам, то бок годам, калі яго бацька, а мой дзед даўно быў на вайне. Але гэта няважна. Свайго дня нараджэньня ён ня ведаў, ведаў толькі, што ў вайну. А перад гэтым бацькаў бацька, а мой дзед страляе ў людзей. Акупацыя, а ён атаман банды на Аршаншчыне і ходзіць зь пісталетам. На танцах ён паказвае з кулака высунуты наперад вялікі палец, і хлопцы перад ім разыходзяцца. На танцах ён сустракае Маню і бярэ яе жыць. Іх першыя трое дзяцей памруць малымі, а гаспадара возьмуць у салдаты і вернуць з простай нагой. А ў гэты самы час далёка-далёка на Палесьсі Чырвоная армія таксама вызваляе людзей ад акупацыі, і ў салдаты, у польскае войска бяруць матулінага бацьку. Ад партызанаў ён хаваўся на гарышчы ў стрыечнай сястры, бо партызаны былі бандытамі і прымушалі страляць у людзей. Матулін бацька, а мой дзед, не любіў зброю і вайну, а любіў людзей і Бога. І жыцьцё. Таму ён баяўся вайны, як баяцца забіваць, таму ён цешыўся, што не трапляў у баі, пакуль ён у іх не трапляў, а калі трапляў і страляў, дык ня цэліўся. І ў той раз, калі ён вартаваў на вышцы і пабачыў, як паўзе да іхнага лягеру чалавек, ён спачатку крычаў яму, а толькі потым стрэліў, але таксама ня цэліўся. Стрэліў, бо той чалавек працягваў паўзьці да іхнага лягеру. Але ня цэліўся. Але чалавек перастаў паўзьці і застаўся ляжаць. І матулін бацька, а мой дзед, усю ноч стаяў на вышцы і крычаў гэтаму чалавеку, каб ён поўз адсюль, а чалавек ляжаў і ня поўз. А матулін бацька, а мой дзед, усю ноч стаяў і глядзеў, як ляжыць на сьнезе чалавек, якога ён забіў. А перад гэтым за многа-многа кілямэтраў ад Палесься, на Аршаншчыне, сям'я бацькавага бацькі, а майго дзеда, крадзе ўсё ва ўсіх, бо яны злодзеі. А перад гэтым бацькаў дзед, а мой прадзед харкае крывёю, бо ў яго разьбіты твар і выбітыя зубы, і ўсё цела спаласаванае бізуном і ланцугамі. Ён выжыве, а памрэ ад алькаголю ў савецкай краіне. А перад гэтым бацькаў дзед, а мой прадзед, крадзе ў нямецкага афіцэра сядло. А перад гэтым ён з братам крадзе з хлява ў немцаў карову, якой надзяваюць на капыты лапці задам наперад, каб атрымаліся сьляды, нібыта нехта ўвайшоў, а не нібыта кагосьці вывелі. А перад гэтым бацькаў дзед, а мой прадзед, злодзей і забойца. Ён б'е свайго сына, а бацькавага бацькі, а майго дзеда брата, насьмерць, бо ў таго цыганы крадуць коней, перад гэтым скрадзеных бацькавым дзедам, а маім прадзедам. А перад гэтым бацькаў дзед, а мой прадзед на імя Макар нараджае сабе невядома якое па ліку дзіця, якога ён называе Лёшам, але па пашпарце гэта Васіль, бо папярэдні дзіцёнак, названы Васілём, памірае шчэ да Лёшы, і хто там будзе афармляць новыя дакумэнты, калі засталіся старыя. І гэты чалавек становіцца бацькавым бацькам, а маім дзедам. А перад гэтым бацькаў дзед, а мой прадзед, нараджаецца Бацюковым у вёсцы Татарск, а гэта значыць, што яго бацька, а мой прапрадзед, злодзей, і ён будзе злодзеем, і сын яго будзе злодзеем. Бо ў вёсцы Татарск усе Бацюковы злодзеі, а ўсе Журавы забойцы, а ўсе Бабровы кішэньнікі, а ўсе Жаваронкі рабаўнікі. Бо перад гэтым прыехаў на месца, дзе цяпер стаіць вёска Татарск пад Воршай, пан, і прывёз з сабой чатырох сваіх чалавек, злодзея, забойцу, кішэньніка і рабаўніка, і сказаў ім: вось вам зямля, вось вам людзі наўкола, тут жывіце і тут спаміж гэтых людзей нараджайце падобных сабе. І сталі жыць злодзей, забойца, кішэньнік і рабаўнік спаміж гэтых людзей. І было ў іх шмат жонак, і забівалі яны людзей, і рабавалі іх, і абкрадалі, як татарва ненаедная. І ненавідзелі і баяліся гэтых людзей, як татарву ненаедную баяліся, і ніхто не сяліўся побач зь імі, і зарасьлі ваколіцы той вёскі, дзе жылі злодзей, забойца, кішэньнік ды рабаўнік, лясамі непралазнымі, балотамі глыбокімі ды пушчамі цёмнымі, а толькі ў пушчах гэтых хадзілі злодзей, забойца, кішэньнік ды рабаўнік і шукалі людзей, і знаходзілі іх, і былі вельмі радыя іх знаходзіць, і нараджаліся ад гэтага людзі, і рабілася багатаю вёска Татарск. А што было перад гэтым, ведае толькі Бог літасьцівы, чыя воля вечная ды чыстая, а чый розум усюдыісны і чый позірк бачыць заўсёды нас і нашыя ўчынкі, і нашыя словы, і нашыя думкі, і нікога больш акрамя Бога Ўсёмагутнага няма ў нашым сьвеце і па-за ім. А чыёю думкаю была думка пра чалавека, і чалавек стаў, і чалавек разышоўся па зямлі, і пачалося ўсё тое, без чаго ніколі нічога б ня зьнікла і ня скончылася. А толькі праўда адна засталася зьвінець і насіцца над безданьню.

**Аляксей Бацюкоў**

**выкладчык філязофіі, пісьменьнік. Жыве ў Магілёве.**

МІКОЛА РАБЧУК

# Наша ўэстсайдзкая гісторыя

У свой час адзін украінскі ўрадовец праславіўся тым, што запаліў цыгару ў дарагой нью-ёрскай рэстарацыі. А калі да яго падышоў чарнаскуры афіцыянт і ветліва сказаў: «Выбачаюся, сэр, у нас не паляць», — урадовец звыклым купецкім жэстам дастаў пачку баксаў і адваліў афіцыянту сотню. Кшталту: бяры, чувак, і «чашы». Чувак нават не зірнуў на працягнутыя баксы, толькі яшчэ болей выпрастаўся і сказаў ужо зусім мэталічным голасам: «Sorry, sir. It's not Russia. It's America.» («Прабачце, сэр. Гэта не Расея. Гэта Амэрыка».)

Мне вельмі шкада, што гэты ўрадовец сунуў сваю жлобскую сотню афіцыянту, а не, скажам, паліцыянту. Бо тады б ён, хутчэй за ўсё, праседзеў колькі дзён, альбо нават і месяцаў, у каталажцы, ажно пакуль яго адтуль не вызваліла б якаянебудзь партыя амэрыканскіх рэгіёнаў. І Ўкраіна хаця б трохі адпачыла ад ягонай дзяржаватворчай дзейнасьці.

Гэты ж ўрадовец вярнуўся дахаты і ўсім расказаў, як ён ня любіць Амэрыку, НАТО і наагул увесь гэты Захад, дзе нас, аказваецца, ніхто не чакае. Нават з сумленна накрадзенымі, дакладней, заробленымі баксамі. Іншая рэч — Расея, АЭП і, зразумела, вялікая расейская мова і культура, безь якой нам усім — ну ніяк. Ну, ціпа: хана.

А яшчэ ў прыступе шчырасьці ён распавёў, як яму перашкаджае хахляцкая мова, і асабліва купка хахляцкамоўнай інтэлігенцыі, што баламуціць народ нейкімі бязглуздымі патрабаваньнямі нейкіх бязглуздых правоў для нейкай бязглуздай «мовы». Ну, ціпа: хочуць глядзець фільмы на гэтай сваёй «мове». Альбо чытаць кніжкі. Ці слухаць лекцыі ўва ўнівэрсытэтах. Ці, вабшчэ, блін, хочуць, каб яшчэ і ўрадоўцы размаўлялі зь імі на гэтай мове!

І гэта пры тым, што сам народ нічога такога насамрэч ня хоча. Ён, у адрозьненьне ад купкі буржуазных нацыяналістаў, ведае сваё сапраўднае, інтэрнацыянальнае месца на бураковых плянтацыях і страіцельна-аддзелачных і сьмецьцяўборачных працах і ведае, што артхаўзныя фільмы і іншую настаяшчую культуру нашыя ўрадоўцы прывязуць яму з настаяшчай культурнай сталіцы гораду Масквы.

Купка хахляцкамоўных інтэлігентаў, ясна, адразу ж узьняла гвалт, кінулася пісаць пратэсты і нават апэляваць да сумленьня (ну, я фігею!) згаданага ўрадоўца. Замест таго, каб падзякаваць за шчырасьць расейскамоўнаму беламу, які нарэшце сказаў украінскамоўным нэграм усю належную ім праўду.

Хоць сюжэт, у прынцыпе, можа мець і іншы працяг.

Нядаўна ў Франкфурце на вакзале я пабачыў двух тыпаў у характэрных скуранках і з характэрнымі стрыжкамі — рыхтык якія-небудзь ахоўнікі альбо кіроўцы нашай артхаўзнай «эліты» з той самай шарыкаўскай нахрапістасьцю і саўковым «інтэрнацыяналізмам». Яны дзёрліся да касы без чаргі, выкрыкваючы штосьці накшталт: «Нам очань нада! Мы апаздываем!» І пакуль разгубленыя немцы ў чарзе ціха наракалі, не адважваючыся, відаць, уголас зьвярнуцца да сумленьня ўсходніх братоў па розуме, смуглявая касірка — ці то турчанка, ці, можа, арабка — дэманстратыўна зачыніла акенца перад мордамі «нашых» і прамовіла сакрамэнтальную для кожнага постсаўка фразу: «Das ist nicht Russland. Das ist Deutschland!» («Гэта не Расея. Гэта Нямеччына!»)

Савок, як правіла, не разумее замежных моваў. Але інтанацыю — «ха́вае».

**З украінскай мовы пераклала Вольга Данішэвіч**

**Мікола Рабчук**

філёзаф, палітоляг, пісьменьнік. Жыве ў Кіеве.

## ЗДЫМКІ ГОДУ



«Памаранчавыя» ва Ўкраіне ня здолелі ўтварыць урад. На фота: дэпутаты блёку Юліі Цімашэнкі пакінулі парлямэнт, патрабуючы датэрміновых выбараў.

**Прэзыдэнт Вэнэсуэлы зь візітам у М**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

АЛЕКС ЭПШТЭЙН

# Апошні сон Борхэса

## Гадзіньнікавы кашмар Юнг

За выняткам аднаго сказу, пазначанага ясным і дакладным словам «рэчаіснасьць», амаль нічога з таго, аб чым тут будзе распаведзена, і заваду не было тым такім далёкім летам 1926 г., калі Карл Юнг, псыхааналітык, падарыў сваёй палюбоўніцы прэзэнт: наручны гадзіньнік без хвіліннай стрэлкі. Юнг папрасіў палюбоўніцу, каб яна надзявала яго нават у сьне, бо такі гадзіньнік, сказаў ён, вымярае час каханьня.

Праз колькі дзён палюбоўніца Юнга сутыкнулася з жонкай Юнга, калі тая стаяла на адным зь цюрыскіх бульвараў перад вітрынай крамы малявальных прыладаў. Жанчыны, якія ўжо пасьпелі пазнаёміцца на адной вечарыне, ветліва павіталіся за руку. Палюбоўніца Юнга не змагла не заўважыць, што на сваім прыдалоньні спадарыня Юнг мела гадзіньнік, на якім адсутнічала гадзіньнікавая стрэлка. Гэтае спатканьне, безумоўна, наклала свой адбітак на рэчаіснасьць, якая, як вядома, бляднейшая за свой уласны цень. Ва ўсялякім разе, у адным са сноў Юнга дзьве жанчыны да таго ж пыталі адна адну, колькі цяпер часу.

## Кароткая казка пра Месяц 1944 г.

У 1941 г. на вячэры ў Токіё савецкі шпіён Рыхард Зорге надраўся як сьлед і распавёў прадстаўнікам вярхушкі імпэратарскага войска, у якіх гасьцяваў, што з пэўных крыніц (надзейнасьць якіх не выклікае сумневу!) яму вядома, што турысты, якім выпадкова надарылася трапіць у Вырай, атрымліваюць люстэрка. Люстэрка — двухбаковае. З аднаго боку яно адлюстроўвае твар чалавека, такім, якім ён быў імгненьне назад. У гэтым няма нічога незвычайнага: як вядома, хуткасьць сьвятла (і позірку) пастаянная. На адваротным баку люстэрка таксама адбіваецца той жа твар. Аднак гэты дадатковы адбітак на дробку сэкунды выпераджае ўсьмешку, якая расплываецца на твары чалавека. Такі сакрэт шчасьця ў Вырае: у ім няма цяпершчыны.

Праз два гады падчас адзінага дазволенага яму шпацыру ў турэмным дворыку Рыхард Зорге ўзьняў вочы ў чыстае як ніколі неба Японіі. Ён у апошні раз шукаў найвялікшую шпіёнку — Поўню.

## Каханка ўкладальніка Вялікай савецкай энцыкляпэдыі барока:

1

У маіх руках здымак Аркадзя Міхайлавіча, укладальніка Вялікай савецкай энцыкляпэдыі барока, сфатаграфаванага акурат у той самы момант, калі пачалася гэтая гісторыя. Да таго ж, я здолеў знайсьці адзін аркуш энцыкляпэдыі, якую ні хвіліны не вагаючыся Аркадзь Міхайлавіч прысьвяціў жанчыне, чыё імя Роза. Але гэта ўжо тэма для іншага аповеду.

2

Вось, у веку дваццаці чатырох год, у горадзе, што паводле колькасьці мастоў саступае адно Вэнэцыі, гэта, вядома ж, Санкт-Пецярбург, які знаходзіцца на адлегласьці ўсяго толькі трох гадзін лёту ад рэгіёнаў, дзе ільга назіраць паўночнае зьзяньне, у адну зь белых начэй, што наведваюць гэты горад летняй парою, за пісьмовым сталом сядзіць Аркадзь Міхайлавіч, ды ўвесь гэты час усе стрэлкі на гадзіньніках зьвернутыя да рэк, ды ўсю ноч навылёт, ні на хвілю не спыняючыся, ён дадае ўсё новыя і новыя артыкулы да сваёй энцыкляпэдыі.

3

«У Вялікай савецкай энцыкляпэдыі барока, выданьне 1956 г., у слоўнікавым артыкуле «атрамант», без усякай сувязі з тэкстам, які ідзе пасьля, або з тэкстам, які ідзе раней, можна прачытаць наступны сказ: «Лінія гарызонту выбражэньня ёсьць сьцiслым азначэньнем выбражэньня».

Паводле той жа энцыкляпэдыі, Ёган Сабастыян Бах нарадзіўся ў 1685 г., вайна за незалежнасьць Ізраілю ўсчалася праз імпэрыялістаў, колькасьць пялёсткаў на венчыку ружы заўсёды роўная лічбе з шэрагу Фібаначы, Леанарда да Вінчы быў ляўшун, а Пікаса — не, у Бэльгіі, як высьвятляецца, жывуць мільёны людзей, у Ёгана Гутэнбэрга, вынаходніка друку, быў акурат досыць чытэльны почырк, чаго ня скажаш пра Люі Брайля, які, апрача іншага, вынайшаў для сьляпых таксама сымбалі для абазначэньня нотаў, у Марса, найбліжэйшай да Зямлі плянэты, зусім няма спадарожнікаў, а я зь першага позірку закахаўся ў цябе».

## Апошні сон Борхэса

1984-ты, аднак сярэдзіна чэрвеня, ды Хорхэ Люіс Борхэс, аргентынскі пісьменьнік, канае. Ён сьніць свой апошні сон. У сьне ён — маленькі хлопчык ды стаіць перад клеткай з тыграмі. Тыгры сьпяць. Дзьверы клеткі адчыненыя. Хлопчык уваходзіць у клетку. Адзін з тыграў (блакітныя вочы) прачынаецца і ўстае зь лежня. Хлопчык падаецца назад і валіцца на сьпіну. Лежачы, Борхэс намагаецца няголасна палічыць удары пульсу. Ён даходзіць да сямі і тут бясконцасьць — адна і адзіная мэта альхімічнага рамяства, якое часам называюць «паэзіяй», а часам «золатам тыграў», ці часам проста «вячыстасьцю» — зьбівае яго зь ліку. Ён (то бок Борхэс-хлопчык, які ператвараецца ў слодычны сон пра Борхэса-хлопчыка, што, як зачараваны, стаіць перад клеткай з паснулымі тыграмі) пачынае з пачатку. Сямігадовы хлопчык уваходзіць у клетку. Адзін з тыграў прачынаецца. Борхэс няголасна лічыць... І гэтак далей. У канцы сну зграбная жывёла кладзе пярэднюю лапу на грудзі хлопчыка. «Ну, нарэшце сустрэліся», — кажа Борхэс. Блакітнавокі тыгр схіляецца над тварам старога Борхэса і языком зьлізвае ягоныя сьлёзы.

**З габрэйскае пераклаў Павал Касьцюкевіч**

**Алекс Эпштэйн**

нар. у 1971 г. у Ленінградзе. У восем гадоў пераехаў у Ізраіль. Жыве ў Ерусаліме. Піша прозу.

МАРЫЯ ВАЙЦЯШОНАК

# Кавярня «Стары Менск»

Што да мяне, то я тут на вуліцах пераступаю нават цені, і ня толькі цені людзей, але і гарадзкіх дрэў. І раптам, сустрэўшыся на скрыжаваньні, Вольга запрашае нас з Франкай у кавярню. Я з торбамі, накупляла прагавіта, трапіўшы ў супэрмаркет, быццам ізноў вярнуся ў вёску, адкуль толькі ўчора прыехала (дэкрэтны адпачынак, усё лета гадавала там дзіця). І наагул, мы з Франкай скрозь вясковыя, мы ня ходзім па рэстаранах-кавярнях, ня маем такой звычкі. Мы ж зь ёй, атрымаўшы калісьці «вид на жительство», не здавалі іспыт на менскі лад жыцьця. Пераскокваю ўнутраную мяжу, згаджаюся, Франка цягнецца за мной.

Сяджу ў кавярні, раз-пораз кратаю нагой торбы пад сталом, ці яны яшчэ тут. Франка, бачу, насупраць дранцьвее, застыгла, акругляе свае біблейскія вочы, потым дастае з валізкі шкляныя дзіцячыя пацеркі, зробленыя трэцяй — меншай дачкой, і, як ахоўны амулет, чапляе сабе на шыю, маўляў, уратуй нас Божа ад гэтай распусты, ня дай увайсьці ў вялікі кошт. Я ведаю ейны тубыльскі ваяўнічы характар, і мяне гэта забаўляе, вызваляе ад нязвыкласьці стану, я сьмялей разглядаюся, бы вылезшы з канапель.

Кавярня маленькая, на сьценах выявы старых дамкоў, яны выцягваюцца пад столь, аб'ядноўваючыся ў мяне над галавой пад агульнай страхой, расчыняюцца сьляпыя вокны, адтуль вее варывам, печывам, кавай. Шыльды з надпісамі: аптэка доктара Жаўкуна, майстэрня гравёра Жаркевіча, незнаёмыя прозьвішчы гаспадароў мінуўшчыны магічна заступаюць вочы, і я нарэшце забываюся пра свае торбы, з асалодай выпростваю ногі, бы толькі што зьлезла з фурманкі, прывязаўшы ля кавярні каня. Я ў гасьцях у старога гораду, як у старога чалавека, пра якога нічога ня ведаю, а ўжо сяджу за ягоным сталом, ужо ў мяне пытаюцца, што мне згатаваць, чым частаваць. «Можна ў вас паліць? Не?» — пытаюся. Тады я запальваю сьвечку на стале, каб бачыць жывыя водбліскі ў вачох Вольгі і Франкі, як у вокнах насупраць, бо ўжо сьцямнела. Заўважаю

**Марыя Вайцяшонак**

пісьменьніца, жыве ў Менску.

## ЗДЫМКІ ГОДУ



**Купальле на Полаччыне. 22 чэрвеня.**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

каля ўваходу плецены куфэрак, у ім цёплыя пледы-апінанкі на той выпадак, калі каму-небудзь з нас стане зімна. Покрывам нябескім ахінуў спакой, той рэдкі спакой, калі наведваешся да старых людзей, якія ўжо анікуды не сьпяшаюцца.

Я толькі тут і зразумела, што ў гэтага сучаснага горада яшчэ жывая даўніна, жывыя ня толькі ягоныя дзяды.

Наведнікаў пакуль што мала. Маладзенькая гаспадыня сядзела за свабодным сталом і засяроджана, пільнуючыся ўзору, рабіла нешта на прутках. Вочка за вочка, і я сяджу, як маладая котка, укрыпаўшыся, скінуўшы на падлогу клубок. Той клубок несканчоны, коціцца аж да млына волата Мянеска, які перамолваў на сваіх жорнах ня зерне, а каменьне. Ад яго і пачаўся радавод Менску? Нешта спрабую ўспомніць, тое, чаго і ня ведала, Вольга старанна разьбірае маю крыпаніну, распавядае пра іншыя міты ўзьнікненьня гораду, яна гараджанка, замаўляе каву яшчэ і яшчэ, перагортвае падзеі і зьявы назад, бліжэй да нашага часу. Вось ужо мы ўсе разам у доме Ваньковічаў, спускаемся ў каменныя лёхі пад падлогаю, знаходзім белую мармуровую статую, але хто яна, ня ведае нават сама Вольга. У катэдры стаім каля капліцы зь целам сьвятога Фэліцыяна, рыцара і пакутніка, на сьценах касьцёлу цені Пятра І, Мазепы, цара Мікалая ІІ, яны сюды наведваліся калісьці. Мікалай выдаўся маленькім, як па мне, дык проста сабе царок. У Сьвята-Духаўскім саборы нас абступаюць манашкі. Яны хрысьцяцца, не пазнаючы ў нас жывых людзей — мы абсыпаныя пылам стагодзьдзяў. Што, напачатку гэта быў касьцёл кляштара бэрнардзінак?! Перад намі ў кавярні ўжо варушыцца стол, бы ў час сьпірытызму. Матка найсьвентша! Мы з Франкай хаваем вочы, мы нічога гэтага ня ведаем — мы ня вывучылі ўрок і не здамо іспытаў. Я пачынаю разумець, што нас з Франкай цікавіць толькі горад сёньняшні: гарачая вада, крамы, мы ня можам яшчэ нацешыцца выгодзьдзем, для нас спыніўся час. Спыніўся гадзіньнік у горадзе, калі я прыехала, мне ўсё даспадобы, мне мусова патрэбна толькі тое, што бачу, тое і спажываю, сьпяшаюся спажыць. Мы сьвяткуем сваю перамогу, што ўдалося абсталявацца ў горадзе, для нас кожны дзень — сьвята. Мы напінаемся, апрануўшыся з раніцы ў вячэрнія строі, размалёўваем твары, калываемся на абцасах каленькамі наперад, пятамі назад, са скуркі вымыкаемся, мяркуючы, што менавіта так мы здолеем быць падобнымі да гараджанак.

Але што дзівавацъ? Калі ў мяне іншы раз нехта пытаецца: як я дасталася да гораду? дзе жыла? з кім? — я бунтуюся, я маўчу, бо не памятаю нават сваёй асабістай «даўніны», не памятаю тых гадоў, тых знакаў.

Я бегла, як гончая: ці мне палацы, ці памыйныя ямы, мне трэба было кожны дзень дабегчы да ночы, да прытулку — дзьверы ў горадзе для мяне былі зачыненыя. Бегла па доўгіх калідорах інтэрнатаў, шукала прытулак на прыватных кватэрах, жывучы недзе за шафай, каб патрапіць хаця гаспадарам, сьціснуцца, сьцішыцца. Губляла свой сьлед, свой нюх, спала на вадастокавых люках, яны не замярзаюць. Я сабака, узрост якога — адзін год за сем чалавечых гадоў.

Нас лёгка распазнаць. Некаторым вяскоўцам хутка ўжыўляецца «штучны» кляпан у сэрца, і яно лёгка б'ецца ў гарадзкім рытме. Маё сэрца адрыне, ня прыме. Мая кватэра на восьмым паверсе, грубастае маё карэньне ветрае, ня можа замацавацца ў глебе. Іншы раз выдаецца, што я ў горадзе як на заробках: нажыўшы ўсё тут, забяру заробленае і зьеду назад дамоў.

Што з нас дзівавацъ?..

Вольга дапівала каторы ўжо кубак. За наш столік села старая жанчына. Каракулевая шапачка, каракулевы паўбурносік, ня тое што ўсё старое на ёй, даўнейшым строем, а лепей было б сказаць, зьляжалася ў шапе — захаваліся вострыя плечыкі вешака, заламаныя складкі на крысе. Рухі няпэўныя, бы яе нехта ўзяў за руку і вадзіў сілком. Вольга раптам ажывілася, страсянула кучарамі, чыста белая пані з каменных лёхаў пад мурам Ваньковічаў, Вольга адразу зразумела: жанчына прыйшла... прыйшла на паверку зь сёньняшнімі гараджанамі. Вольга загаварыла пра нешта нязначнае: надвор'е, смак кавы, які цяпер месяц, які год, якое стагодзьдзе, пра тое, што надавала аддуху пасьля нашых «вандровак», — як параслала настольнік. Мы бавілі час, мы адчулі ягоную асалоду пад языком.

Нарэшце разумею: кавярня — гэта маленькі асабісты тэатар; кавярня — гэта вылюдзьдзе, кавярня «Стары Менск» — гэта маленькія госьці ў вялікага гораду. І калі сюды ты зайдзешся адна, да цябе падсядзе старая жанчына, і ты ня будзеш адчуваць адзіноты...

У гораду ня сьцёртыя з твару ўспаміны.

Мы разьвіталіся са старой, як з прыяцелькай. Вядома, яна яшчэ засталася, вядома, што ёй тут побач — яна з таго будынку, што на сьцяне кавярні, дзе аптэка пана Жаўкуна.

Ідзем па вуліцы, якія харошыя машыны, думаю сабе, бы пра коней. Вольга прапануе пагуляць, але мы з Франкай сьпяшаемся дамоў. Я ня ўмею гуляць па горадзе: да непрыстойнасьці зазіраю ў вочы кожнаму стрэчнаму, бунтуюся, не пазнаючы ані ў кім сваіх аднавяскоўцаў. Мы разьвітваемся. Вольга пайшла на свой прыпынак. Мы з Франкай сталі, глядзелі ёй усьлед, і яшчэ раз, і яшчэ абарочваліся, ідучы ў свой бок. Вольга не азірнулася. Мы спыніліся, быццам баяліся згубіць яе ў натоўпе і хацелі хоць крыху затрымаць каля сябе, пабыць разам даўжэй. Яна не азірнулася — такіх поўны горад, такіх, як мы. Глядзелі ўсьлед, як праз плот, вечны плот. Мы, прыежджыя, нарэшце ўпершыню пазналі гаспадыню гораду і даўмеліся, што свае хатулі яшчэ і не разьвязвалі, зьняўшы з плячэй: мы толькі вельмі сьпяшаліся ўскочыць, ушчаміцца ў дзьверы, як бежанкі. Мы быццам яшчэ і не сустракаліся з Вольгай, нідзе і ніколі, і гэта стрэча будзе магчымая праз якіх сто гадоў майго жыцьця ў горадзе, калі мы адчуем, што прыехалі сюды назаўсёды.

Азірніся на нас, Вольга, мы прывезьлі з сабой тое, пра што і самі забыліся, прыехаўшы: мы прывезьлі... Мову, Мову лясоў, палёў, зямлі. Мы прывезьлі валачобныя калядныя песьні... Мы маем падараваць гораду найкаштоўнейшы скарб...

Азірніся, Вольга...

**СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ**

панядзелкавае апавяданьне

# Царская гарэлка

— Ну што, кабінэт міністраў? Прызнавайцеся: што, дзе, колькі і з кім! «Ах, дзе быў я ўчара, не знайсьці днём з агнём, толькі помню, што сьцены с абоямі…» Чыстасярдэчнае прызнаньне палегчыць вашую віну, давайце.

— Ды што там успамінаць, таварыш прэм’ер, у роце брыдка.

— Давайце расказвайце, не ламайцеся. Бачу: усе адзначылі сьвята як мае быць, пераўзышлі норму. Ты, Іван Іваныч, нагадваеш мне парсюка — вачэй не відно. Толькі не крыўдуй, я сам шклянку расолу выпіў, але ў роце памыйка, антыпаліцай не памагае. А ў цябе, таварыш міністар унутраных органаў, твар колеру перамарожанай ялавічыны, прабач.

— Гэта ён у мяне такі не назаўжды, гэта часовая зьява. За што сьвяты не люблю, дык гэта што жонка не дае палячыцца потым. Яна ў мяне як старшына. Так і жыве згодна з антыпітной кампаніяй.

— А я проста не магу спыніцца, чарку за чаркай. Гэта страх застаўся пасьля антыгарэлачнага ўказу, што ня хопіць. Сындром такі, мне доктар гаварыў.

— Тады заўжды не хапала, змрочныя часы. П’еш і страх бярэ. З закускай таксама быў асартымэнт: капуста марская ды груца салдацкая ў слоіках, хлеб, праўда, прадаваўся, цаглінка. Але які толк ад закускі, калі няма чаго выпіць? Прафанацыя.

— Так, цяжкія часы, ліхалецце. «Учора газавая камора, сёньня…» Пераджылі нейк, percatрывалі. Памятаю крамы: дзьверы не адчыняюцца пасьля перапынку, такі натоўп сабраўся, усім трэба бутэльку. Адгулы бралі, выхадныя, каб дастаяцца. А калі ты на службе — проста бяда, «кленска жывёлова», як некаторыя кажуць. Сам туды ня сунесься, дый затопчуць, калі што. Прасіць — не папросіш, бутэльку «на нос», у адны рукі. А з чорнага ходу таксама ня выйсьце, вельмі праверкі лютавалі, народны кантроль у дзеяньні. Майго знаёмага застукалі — праз заднія дзьверы ўзяў пляшку — карупцыя! Гадкоў пяць адбарабаніў. А ў яго нехта памёр ці нарадзіўся, бутэлька патрэбна была — пытаньне жыцьця і сьмерці!

— А як успомню жаніцьбу без гарэлкі, таварыства барацьбы супраць выпіўкі, жах бярэ! Што мы — хворыя?!

— Страшна ўспомніць, як у жудасным сьне ўсё. А такі быў выпадак: адзін запісаўся туды, прабіўся наверх, а потым засьпелі на гарачым: самадзейнасьцю займаўся — на аналіз гарэлку браў, і так у кожнай краме. Карацей, таксама карупцыя, трасца яе.

— Вось я прызвычаіўся ўсё рабіць, як ударнік на барабанах: працаваць дык працаваць, баляваць дык баляваць, не сачкаваць ніколі. Не люблю халяўшчыкаў, мужык ты, ці не? Не сядай за стол, калі ня можаш па-людзку выпіць. Правільна я гавару?

— У нас у арміі казалі: ня хочаш — навучым, ня можаш — прымусім. Ці наадварот. Карацей, школа жыцьця, паскораны курс, два ўрокі.

— А тосты на вясельлі без гарэлкі — ганьба, пародыя! Вакханалія, як казаў наш маёр Кліпіч.

— Гэта праўда. Жадаю маладым доўгіх год жыцьця і за моцнае здароўе выпіваю шклянку чаю. Адкуль яно будзе моцным? Вар’яцкі дом, Навінкі, дый годзе!

— Альбо бярозавага сачку, бярозкі плакалі па такой жаніцьбе!

Разьбіць, бутэльку? А ведаеш, колькі ў яе ўкладзена працы? Пасеяць трэба, зжаць, змалоць…

**Сяргей Астравец**

**пісьменьнік, журналіст. Жыве ў Горадні.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**ЗДЫМКІ ГОДУ**

— А я аднойчы трапіў — квас кулялі, але кіслы, што мазгі працінала.

— Па-ўсякаму здаралася: у нашай пярвічцы адным дазволілі зь півам адзначыць, замест, так сказаць, шампанскага налівалі, праўда, таксама кісьляціна. Як раней: не пасьпелі піва давезьці, яно ўжо ніякае. Асабліва ў сьпёку. Пабоўтаеш: каламутны асадак ўзьнімаецца. Ды яшчэ дрэнь якая-небудзь плавае. Аднойчы муху бачыў, такую ліловую.

— Колькі муха вып'е? Не шкадуй!

— Ды што мухі, часам гамолкі якіясьці ў гэным піве знойдзеш. Адно слова: жыгулёўскае.

— А цяпер для некаторых выпускаюць з такой назвай. Насталььгія!

— Ды я ж чуў, што на яго ліцэнзія трэба, забаранілі жыгулёўцы, лапу наклалі.

— Што там каламуць вашая, я аднойчы гляджу й вачам сваім ня веру: шматок газэты плавае са здымкам. Прыгледзеўся: Леанід Ільліч у піве боўтаецца і глядзіць на мяне па-гэнсекаўску. А я: што глядзіш, цалавацца ня буду, я табе не Карвалан!

— Вой, хлопцы: пры Сталіне за такое што было б! Сякір-башка!

— А я памятаю дужа любіў, як той сьпяваў: «Зін, а твой грузін зусім хлябаў бэнзін!»

— Бэнзіну яшчэ не хапала… Галава, як булава, проста бухэнвальдзкі набат.

— У мяне таксама, як чыгунная балванка, якой па танках. Ці гэтая куля, каторай сьцены…

— А ў мяне гуд у галаве, як рэйкі, калі цягнік на падыходзе.

— Гэта што, у мяне нібы гэнай балванкай па вежы, а мы, а я ўнутры. Як царзвон у галаве гудзе.

— А я ў авіяцыі служыў. Як запусьцяць рухавік — галава, як у гарматы ядро — вось-вось лопне, разьляціцца.

— Ня трэба мяшаць, за сталом трэба быць адналюбам, не рабіць молатаўскага кактэйлю. Ты сабе ўяві: каб пасьля п'янкі зьліць з усіх кілішкаў ды бутэлек рэшткі і выпіць? Вось ты тое ж самае добраахвотна робіш, а потым зьдзіўляесься вячэрняму звону на ранішнім пасяджэньні, калі пытаньні трэба вырашаць дзяржаўнай важнасьці. А ў цябе ў горле, як ва ўнітазе.

— Тэрмаядравы напойчык! Як у тым кіне Віцын: перцу з імберцам туды, усякай трасцы, абрус прапаліў, а сусед кульнуў і анігадкі — далей закусваць!

— А я люблю, каб ня толькі хлеб-соль, а каб чарка на падносе, па-царску.

— А ў нас ваксу на хлеб намазвалі, на салдацкую цаглінку, ён напітаецца, потым ваксу на боты і лусту жуюць.

— Не брашы.

— Дальбог. Хочацца ж кайф злавіць.

— Я таксама пра такое чуў, але за цаіром Гарохам.

— Казік, ды ты сам уяві — што за дрэнь гэта, рыгаць будзеш ад аднаго віду, ад панюху.

— Не, праўда, вось у нас сяржант Уласенка ва ўмывальніку на маіх вачах глынуў шыпру, і пена з роту, як у вярблюда, быццам шампуню насёрбаўся.

— Вакса, адэкалён, ужо лепш накурыцца да адурэньня. Дым выйшаў і ўсё, а гэта ператравіць трэба. Паскудзтва!

— Як прыпрэ, не такое зьясі ці вып'еш, людзі муміё жуюць, какашкі птушыныя, экскрэмэнты. Горных арлоў ці каго.

— Казлоў горных, я там служыў, ведаю, сам прывозіў бацькам лячыцца і на продаж.

— Ведаеце: гэта праўда, што вып'еш халеру, калі прымусяць. Нават не канкрэтна хтосьці, абставіны.

— А я пра какашкі анэкдот успомніў.

— Мы пра выпіўку, закуску, што ж імі — заядаць бакштанку будзеш, ха-ха?

— Успаміналі пра гэнае муміё, а я пра мядзьведжыя.

— Што пра мядзьведжыя: еў ты іх, ці што?

— Здурнеў? Я анэкдот толькі.

— Ладна, хай расказвае, а то мы толькі пра перапой. Ды пра што ў цябе там: пра кругляшкі ад бурага мішкі? З акадэміі смаргонскай? Што ён там вывучаў? Заатэхніку? Як з кароў малако здабываць?

— Ды анэкдот, можна сказаць, дзіцячы. Савецкі яшчэ, з барадой.

— Савецкае мы любім, давай!

— Карацей, знайшоў заяц у лесе дубальтоўку, і давай усіх сустрэчных прымушаць есьці з кучы, там лось пакінуў.

— А гаварыў — мядзьведзь.

— Ну, пераблытаў крыху. Карацей, ідзе мядзьведзь, заяц: еж, мішка. Мядзьведзь — ня буду. Заяц — лічу да трох: раз, два, тры, асечка! Зноў — асечка! Трэйці раз — асечка! Заяц дубальтоўку ўбок: ну, калі ты, мішанька, ня хочаш, тады я сам зьем.

— Сьмешна, але невясёла.

— Ну, я ж казаў, што савецкі, папярэджваў.

— Ды нармальны анэкдот, дасьціпны.

— Пасьля першай не закусваюць! Ці памятаеце кіно? Пасьля другой таксама і пасьля трэцяй… Каб цаглінку ў барак прынесьці галодным таварышам. Прыйшоў і вырубіўся. Герой. А той фрыц: рус зольдат отшэнь крэпкі! Патрыятычнае кіно.

— А памятаеце «Апэрацыю «Ы»? Разьбіць, бутэльку? А ты ведаеш, колькі ў яе ўкладзена працы? Пасеяць трэба, зжаць, змалоць і гэтак далей…

— А як пшэкі нас хацелі на гарэлцы распрануць, разьдзець, разбуць і тварам у гразь?! Хітрыя, халера! Пшэк-пшэк: патэнт іхні больш старажытны! З часоў Леха і Чэха. А мы — лапухі! Прыйшлося ў ААН зьвяртацца, каб даказаць, што гэта нашае спрадвеку слова, а па-іхняму будзе «гожалка»! Яны нашае слова скралі, мы так Бутрасу Галі і патлумачылі.

— Пся крэў! Войска польска Бэрлін брала, а радзецка памагала… Вот сукі!

— Ня сукі, а курвы. Бл… па-іхняму.

— Курвы! Але кінцо пра сабаку і танкістаў усе любілі.

— Танк наш!

— А кіно іхняе. Ты што — не любіў Марысю, не падабалася яна табе? Не хацеў ляснуць?

— Скажаш, я яшчэ піянэрам быў, у штоніках.

— А яны выпіць таксама малойцы, гулякі! Вудка-вудка!

— На халяву і ад рыцыны не адмовісься…

— Ды што там Марыся… Калі марыць, дык піць францускае шампанскае, выцiскаць сок з каралевы!

— З брытанскай, з гэтай карготы?

— Бываюць і маднейшыя. Каралевы прыгажосьці. Я быў у журы аднойчы: самы цымус дзяўчонкі!

— А я, браткі, у гэдээры служыў. За плотам: ні гарэлкі, ні баб, як на зоне.

— Скажаш, а за Палярным пасам кішка танка? Па вяроўцы ў срачнік хадзілі, каб не згубіцца, а там ломам экскрэмэнты… Каб месца сабе расчысьціць. Такія Казьбекі! Да першай крамы кілямэтраў дзьвесьце, а можа цэлую тышчу, не памятаю. Да Амэрыкі бліжэй. А гэныя тунгусы самі ня п'юць і на продаж ня гоняць. Проста жудасна! Затое «Голас Амэрыкі» чысьцюткі быў.

— А ў нас на К-150 перш кожны павінен быў поўны слоік марской вады выпіць, і каб не званітавала, а то на бераг сьпішуць. На сорак пяць сутак пагрузісься: сапраўды ні баб, ні звальненьняў. Праўда, вінцо давалі, ня толькі афіцэрам.

— Ну, а я шнапс, допэль-корн, вялікую бутэльку дахаты вёз, гэх! Не даехала, выпілі ў цягніку з кімсьці, ня памятаю нават з кім, нехта выпадковы трапіўся пад руку. А я ёй ганарыўся, пляшкай, думаў усіх зьдзівіць. Захаваў для самагонкі. Такая — у форме тэлевышкі на Александэрпляц, прыгожая, як Эйфэлева вежа.

— Знаеце, я на падводнай лодцы, здаецца, русалку ляснуў бы, каб злавіў. Мы, дарэчы, стараліся на гаршчок не хадзіць. Уяўляеце, калі там і так паветра не хапае, а трэба яшчэ баявую задачу выконваць.

— Так і трымалі ў сабе?

— А што зробіш.

— Але ж служба! Лепей ужо ў срачнік па вяроўцы…



**На дворы Каляды —**
**Усе дзеткі рады:**
**Гэй, дзядуля Мікалай,**
**Падарункі нам давай!**





**Засьпяваем мы калядкі —**
**Атрымаем чакалядкі.**

**Хутка будзе Новы Год —**
**Зладзім файны карагод!**



Капітан Танака ©

БЕЛАРУСКАЯ РЭДАКЦЫЯ РАДЫЁ "ПАЛЁНІЯ"




www.polskieradio.pl/polonia/by

## КАІСА

# Шахматны год у Беларусі

Застой у шахматным жыцьці сышоў колькі гадоў таму, і ў 2006 г. падзеяў не бракавала. Часам гульцам нават выпадаў выбар: ці то дагульваць першую лігу ў Менску, ці то скакаць на тэмпатурнір у Асіповічы.

Прапаную чытачам «Каісы» ўласны позірк на вынікі шахматнага году. Запрашаю інтарасантаў высоўваць альтэрнатыўныя вэрсіі, пагатоў Фэдэрацыя шахмат (у адрозьненьне ад шашачнай) рэдка «паглядам акідвае шлях».

**Шахматыст году:** Сяргей Жыгалка. 17–гадовы юнак ня толькі стаў гросмайстрам, але і выйграў Чэмпіянат Эўропы (U–18), у т.л. па хуткіх шахматах і па бліцу. Заслугоўваюць ухвалы і выступ Вячаслава Дыдышкі на першынстве краіны (10 з 13), і дэбюты Аляксандры Шаровай у Вышэйшай лізе (7,5 з 11), Юр'я Ціханава на Сусьветнай алімпіядзе ў Турыне (4 з 6).

**Трэнэр году:** Раман Фядосенка з Мазыра. Гэты малады чалавек, адкрывальнік таленту Лены Таіравай, прывёў дачку Рагнеду да перамогі ў першынстве Беларусі сярод дзяўчатак да 8 гадоў. Не яго віна, што Рагнеда не паехала на батумскі Чэмпіянат сьвету ў кастрычніку — у разгар канфлікту Грузіі з Расеяй.

**Судзьдзя году:** Зьміцер Лыбін. Міжнародны арбітар удала «разруліў» вышэйшую лігу Чэмпіянату Беларусі ў сакавіку і «Інаўтамаркет–оўпэн»–2 у ліпені.

**Клюб году:** бясспрэчна, менская «Вясьнянка», суполка, што 4–ы раз запар выйграла нацыянальны чэмпіянат. Пажарнік Леанід Школьнікаў (старшыня) і гросмайстар Сяргей Азараў скаапэраваліся зь віцэ–чэмпіёнам краіны Аляксеем Фёдаравым. На першынстве Эўропы (кастрычнік, Аўстрыя) каманда зачапілася за 6–е месца з 56 — беспрэцэдэнтны вынік.

**Выдавец году:** Вадзім Жылко з Лунінца. Паэт–гісторык малымі сіламі цягне кампазытарскі бюлетэнь «Альбино», а ў 2006 г. падрыхтаваў 6 нумароў дадатку «Альбино–плюс» з размаітымі артыкуламі для аматараў літаратуры і практычнай гульні. Дарэчы, ён — адзіны беларус, які шмат гадоў выступае экспэртам у конкурсах маскоўскага часопісу «64».

**Шахматны сайт году:** brestchess.narod.ru. Берасьцейцы, не перагружаючы наведнікаў інфармацыяй, пастаўляюць даступны і дасьціпны зьмест: асабліва падкупілі «Шахматы для чайнікаў». На жаль, цэнтральны рэсурс bychess.info у 2006 г. крыху збавіў абароты, а «Жаночыя шахматы» ўвогуле зачыніліся.

**Страты году:** Памерлі Ратмір Холмаў і Давід Бранштэйн, гросмайстры, якія не нарадзіліся ў Беларусі, але доўга жылі тут, уплывалі на яе шахматны ляндшафт.

Ну і… **бурбалка году**. Неадбыты клюбны чэмпіянат краіны сярод жанчын, пра які згадвалася ў «НН» № 45, 2006.

**Вольф Рубінчык**
**rubinczyk@yahoo.com**

### Як бы вы згулялі?

В. Волчак, А. Сымановіч, 2006. Мат за 2 хады.



**Адказ:** 1. Kf5! Не рашае ні 1. Тb5? Фg5!, ні 1. e5? Фg6! Судзьдзя Марк Басісты (Украіна) вызначыў задачу як лепшую ў разьдзеле, хаця ў цэлым творы, што паступілі на ка–мандае першынство, яго расчаравалі.

## ТЭАТРЫ

**опэра**

*Цэнтральны Дом афіцэраў*

**4 (чц)** — «Пітэр Пэн»
**6 (сб)** — «Князь Ігар»

**Купалаўскі тэатар**

**29 (пт)** — «Дзіўная місіс Сэвідж»
**3 (ср)** — «Каханьне ў стылі барока»
**4 (чц)** — «Паўлінка»
**5 (пт)** — «Кім»
**6 (сб)** — «Дзіўная місіс Сэвідж»
*ранішнія спэктаклі*
**3 (ср)** — «Сьнежная каралева»
**4 (чц), 5 (пт)** — «Паўлінка»
**6 (сб)** — «Афрыка»
*малая сцэна*
**5 (пт)** — «Востраў Сахалін»
*ранішнія спэктаклі*
**29 (пт)** — «Афрыка»
**30 (сб)** — «Сьнежная каралева»

**Тэатар беларускай драматургіі**

**29 (пт)** — «Нязваны госьць»

**Тэатар юнага гледача**

**28 (чц) — 30 (сб), 2 (аўт) — 6 (сб)** — «Спадарыня Мяцеліца»

## ФЭСТЫВАЛЬ

**Калядныя вечары на Залатой Горцы**

Менскі касьцёл Сьвятога Роха запрашае на музычныя імпрэзы.

**28 (чц) сьнежня** — пяюць жаночы камэрны хор Інстытуту правазнаўства «Элегія» і камэрны хор Дому культуры ЗАТ «Пінскдрэў» «Поклiч». У праграме: беларускія калядныя канты, творы А.Ласа, Н.Гадэ, М.Равенскага.

**29 (пт) сьнежня** — вечар арганнай музыкі. Зайграюць студэнты дацэнта Акадэміі музыкі Уладзімера Неўдаха. У праграме: І.С.Бах, Дз.Букстэхудэ, Л.Бёльман, А.Гільман.

**30 (сб) сьнежня** — канцэрт камэрнай музыкі.

**9 (аўт) сьнежня** — канцэрт арганнай музыкі. Грае Ксенія Пагарэлая, ляўрэатка міжнародных конкурсаў.

**Пачатак канцэртаў у 20.00.** Уваход свабодны. Ахвяраваньні вітаюцца.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Адмарожанае кіно

**Марозка** (Морозко)

Расея (СССР), 1964, каляровы, 84 хв.

**Рэжысэр:** Аляксандар Роў

**Ролі выконваюць:** Аляксандар Хвыля, Натальля Сядых, Эдуард Ізотаў, Іна Чурыкава, Георгі Міляр, Павал Паўленка.

**Жанр:** Дзіцячы фільм–казка па сцэнару Мікалая Эрдмана і Міхаіла Волпіна

**Адзнака:** 8,5 (з 10)

Жыла-была добрая дзяўчынка Насьця. Злая мачыха не любіла падчарку — і ўсяляк яе зводзіла. Аднойчы яна выправіла дзяўчыну замярзаць у зімовы лес. А яшчэ жыў у тых краёх хлопец Іван — вялікі выхваляка, за што й быўператвораны ў мядзьведзя. Дапамог героям дзед Мароз. А злая мачыха і яе дачка былі пакараныя.

Старая мілая казка савецкага кіначараўніка Аляксандра Роў. І адмысловыя эфэкты зараз іншыя, і кампутары дадаюць сваё, але дзіцячы фільм не губляе свайго наіву й сьвежасьці.

Асаблівы шык карціны — гратэсковыя ролі выбітных актораў. Іна Чурыкава — у ролі тупой, злой і сквапнай дачкі, Георгі Міляр (Бэла Лугошы, Барыс Карлаф, Лон Чэйні і Робэрт Энглунд у адной асобе) — з найлепшай Бабай Ягой за сваю кар’еру.

Амэрыканцы былі шакаваныя «Марозкам». Яны пісалі, што гэта «глючны наркаманскі фільм, які нельга паказваць дзецям», дзікунская казка са злым грыбам, які жыве ў хаце на лапах — і шызоідны кашмар не для ўсіх.

Але абавязкова пакажыце яго сваім дзецям.

Фільм почасту паказваюць па тэлевізіі. Але пад Новы год дзеці могуць паглядзець стужку на вялікіх экранах. 30 сьнежня — у «Піянэры» а 10.20, 31 сьнежня — у «Доме кіно» ў 12.00.

**Андрэй Расінскі**




## КІНО НА DVD

**ТУТ ПАЛЯЦЬ (Filter Cigarettes)**
Камэдыя, ЗША, 2005, рэж. **Джэйсан Рэйтман**
У ролях: **Аарон Экхарт, Марыя Бэла, Камэрон Брайт**
Нік Нэйлар — віцэ–прэзыдэнт Акадэміі тытуню. Ён абараняе паленьне на тэлевізіі і ў газэтах. Але ў цынічнага героя ёсьць сын, які ня церпіць маны…
**Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 30 сьнежня

**АНТ, 09.05**

**«Зыгзаг удачы»** (Зигзаг удачи)

Расея, 1968, чорна–белы, 88 хв.

Рэжысэр: Эльдар Разанаў

Ролі выконваюць: Яўген Лявонаў, Валянціна Талызіна, Яўген Еўсьцігнееў, Георгі Буркоў, Зінові Герт

Сатырычная камэдыя

Малады фатограф выйграе па аблігацыі вялікія грошы. На працы — скандал, бо аблігацыя ўпотайкі была купленая за складкі касы ўзаемадапамогі, старшынём якой быў герой. Толькі Новы год зьмірыў калегаў. Карціна не настолькі знакамітая, як іншыя творы Разанава, але пасвойму паказальная.

**БТ, 12.10**

**«Гэта вясёлая плянэта»** (Эта весёлая планета)

Расея – Беларусь, 1973, каляровы, 94 хв.

Рэжысэры: Юры Саакаў, Юры Цьвяткоў

Ролі выконваюць: Савелі Крамараў, Леанід Кураўлёў, Кацярына Васільева

Камэдыйна–музычнае кінасьмецьце

Абсалютна дурацкая, халтурная і мілая гісторыя пра тое, як іншаплянэтнікі трапілі на сустрэчу Новага году. Скласьці канкурэнцыю карнавальным маскам яны не змаглі, але зразумелі, што такое зямны гумар (для тых, хто яго зноўдзе). «Іншаплянэтнік» з колам ад ровару над галавой — гэта штосьці...

Карціна — толькі для сталых аматараў трэшу.

**АНТ, 23.40**

**«Цырульнік»** (The Barber)

Канада — Вялікабрытанія, 2001, каляровы, 94 хв.

Рэжысэр: Майкл Бафара

Ролі выконваюць: Малькольм Макдаўэл, Джэрэмі Рэчфард, Гарвін Сэнфард.

Жанр: Псыхапаталягічны трымценьнік

Ня ўсім жа на сьвяты радавацца... Аляска. Палярная зіма. У мястэчку адбываюцца дзіўныя забойствы маладых жанчынаў. І толькі чалавек зь лязом у руках ведае, дзе шукаць злачынцу...

Карціна была названая адной зь лепшых незалежных стужак 2001 г.

### Нядзеля, 31 сьнежня

Стандартнае мэню навагодніх фільмаў:

**«Карнавальная ноч» (БТ, 12.10)**

**«Чараўнікі» (СТВ, 13.35)**

**«Іронія лёсу, альбо Лёгкі дух» («Лад», 20.35)**

І навагоднія звароты … па БТ, АНТ, СТВ, Ладу, і нават па НТВ.

Мо ну яго, той тэлевізар?

**Андрэй Расінскі**

# На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

# Дзякуй

**Яўгену К.** са Шклоўскага раёну.
**Мікалаю Р.** са Жлобінскага раёну.
**Івану К.** зь Бераставіцкага раёну.
**Аляксандру Е.** з Кобрына.
**Фэліксу Б.** з Воршы.
**Уладзімеру В., Дар'і Л.** з Смаргонскага раёну.
**Валерыю С.** са Жлобіна.
**Юрыю М.** з Кармянскага раёну.
**Ігару Б., Тамары Ш., С.Р.** зь Бярозаўскага раёну.
**Барысу Ф., Генадзю Л., Лідзіі С., Рыгору К., Сяргею К., Уладзімеру Л., Валянціне З.** з Гомеля.
**Аляксандру С.** з Карэліцкага раёну.
**Вользе Р.** з Бабруйску.
**Аляксандру Т.** з Лагойскага раёну.
**А.С.** з Магілёва.
**А.Ж.** з Барысава.
**Фёдару К.** з Талачына.
**Аляксандру Н.** з Жлобіна.
**Андрэю Ф., Івану С., Г.К., Г.Л., Тамары М.** з Горадні.
**Адальфіне В.** зь Ліды.
**Мікалаю К.** са Сьмілавічаў.
**Зьмітру Х.** з Мастоўскага раёну.
**Івану Ф.** зь Берасьцейскага раёну.
**Валянціну Д.** з Пухавіцкага раёну.
**Аляксандру С., Мікалаю Ж.** з Мазыра.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**
1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.
2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

**...беларусы жылі ў казцы:**

**Воўк і сямёра казьлянятаў**



КВІТАНЦЫЯ АПЛАТЫ ЗА ПАСЛУГІ ЖКГ
КЛІЕНТ: КАЗА
АДРАС: ХАТКА Ў ЛЕСЕ

| ФОРМА ПАСЛУГІ | КОШТ (1 У.А = 1 КАЗЬЛЯНЯ) |
|---|---|
| 1. ВАДА | 1 |
| 2. СЬВЯТЛО | 2 |
| 3. ГАЗ | 2 |
| 4. ВЫВАЗ СЬМЕЦЬЦЯ | 1 |
| 5. ДАМАФОН | 1 |
| | РАЗАМ: 7 |

НА ЎСІХ ПЫТАНЬНЯХ ЗЬВЯРТАЙЦЕСЯ ДА КІРАЎНІКА ЖЭС: 0928050185 (ВОЎК)



**Папялушка:**

— Загадваю ўсім дзяўчынам каралеўства прымерыць гэтую крышталёвую пантофлю. Трэба высьветліць крыніцу імпарту безакцызнага абутку.




**Сьнежная каралева:**

— Таварышы беларускія памежнікі, яшчэ раз кажу: я злая чараўніца, а не сэньёра Джуста, а там — Кай, а ня Віка Мароз.

# Калядны нумар «НН»

Сем калядных апавяданьняў на сем калядных вечароў.

**Аляксандар Апон.** Год сьвіньні. **Старонка 30.**

**Лаўрэн Юрага.** Манускрыпт. **Старонка 34.**

**Аляксей Бацюкоў.** Злодзей, забойца, кішэньнік і рабаўнік. **Старонка 36.**

**Мікола Рабчук.** Наша ўэстсайдзкая гісторыя. **Старонка 37.**

**Алекс Эпштэйн.** Апошні сон Борхэса. **Старонка 38.**

**Марыя Вайцяшонак.** Кавярня «Стары Менск». **Старонка 39.**

**Сяргей Астравец.** Царская гарэлка. **Старонка 41.**

Наступны нумар «Нашай Нівы» выйдзе 12 студзеня 2007 году.

Вясёлых Вам сьвятаў, дарагія чытачы!

# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 46.**




**Беларускі супэрмэн Бульбман. Комікс Лявона Вольскага. Старонка 29.**

## ЖАРТЫ

***

Якія прагнозы на навагоднюю ноч?

Ад 75 да 200 даляраў за кубамэтар.

***

— Хто пастукаецца ў кожную беларускую хату ў Новы год?

Усё залежыць ад вынікаў беларуска-расейскіх перамоваў. У адным выпадку — Дзед Мароз са Сьнягуркай, у іншым — Дзед Газпром з марозам.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую беларусаў** з Раством Хрыстовым і новым годам! Шчасьця і дабрабыту Вам! Рыгоравіч

**Віншую** ўсіх з 2007 годам! Хай у гэтым годзе агонь выкрые дзею кожнага! Б.Г.

### КНІГІ

**Прапаную кнігі**: І.Насовіч «Слоўнік беларускай мовы» факс. 1870, Ластоўскі «Беларуска(крыўскі)-расейскі слоўнік» факс. 1924, «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» т.1, 2, 5, «Беларускі кнігазбор»: Гётэ, Баршчэўскі, Каліноўскі, Філяматы і Філярэты ды іншае, гісторыя этнаграфія, архітэктура. Т.: 753-70-05

### МУЗЫКА

**Новыя альбомы** Віктара Шалкевіча «Гарадзенец прызямліўся ў Менску», «Чырвоным па белым», «Мясцовы час», Сяржук Сокалаў Воюш, Данчык «Мы яшчэ сустрэнемся», кніга «222 альбомы беларускага року і ня толькі» і інш. Лістуйце на pesni2006@tut.by , а таксама зьвяртайцеся да незалежных распаўсюднікаў.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Шукаем агентаў.** Усе агенты павінны зрабіць канешне расчот перад Новым годам за праданыя нумары «Нашай Нівы» і грошы, не чакаючы новага нумару, прыслаць у кантору «Нашай Нівы». Дзеля таго, што Рэдакцыя хоча пабольшыць нумары «Нашай Нівы», чародны нумар выйдзе пасьля Новага году. Прыпамінаем падпісчыкам, што пара прысылаць грошы за «Нашу Ніву» на 1907 год. По мястэчках, гарадах і вёсках шукаем агентаў. **Рэдакцыя.**

**«НН». №7. 1906**

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2621. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 27.12.2006.

Замова № 7198.

Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.